ВЯСНА 2003

малое ПАЛЕСЬСЕ

выпуск першы

— краязнаўчы альманах



краязнаўчая фантастыка •

археалёгія •

краязнаўства •

гартаючы старыя выданьні •

юбілей •

кніга •

першая публікацыя •

мэтодыка. вопыт •

КРУПКІ

На першай старонцы вокладкі: *герб горада Крупкі, зацьверджаны Крупскім райвыканкамам 27 траўня 1999 г.*


ПРАДМОВА

Вітаем цябе дарагі чытач! На старонках нашага альманаха ты зможаш знайсці цікавую інфармацыю па гісторыі роднага краю, даведацца аб падзеях мінулых часоў, ці, калі зьявіцца жаданьне, надрукаваць свае краязнаўчыя нататкі. Калі ты яшчэ не адкінуў прэч наш альманах й хочаш даведацца хто мы – дык слухай!

Мы – харугва скаўтаў і сяброў Малога Палесься. Так называецца наша арганізацыя, якая налічвае больш за сотню сябраў, вучняў некалькіх школаў Крупскага раёну. Мы зьяўляемся тэрытарыяльнай адзінкай РГА «Аб'яднаньне Беларускіх Скаўтаў». Нас цікавіць гісторыя нашага рэгіёну – Малога Палесься. Калі ты яшчэ працягваеш нас чытаць, то ведай, што навукоўцы-географы называюць Малым Палесьсем лясную частку Крупскага, Барысаўскага, Бярэзінскага й Бялыніцкага раёнаў, бо сваімі прыроднымі асаблівасьцямі яна нагадвае Беларускае Палесьсе. Таму нашай асноўнай задачай зьяўляецца комплекснае вывучэньне гісторыі нашай малой радзімы. У нашым альманаху мы будзем друкаваць матэрыялы, якія сабралі ў шматлікіх архіўных, краязнаўчых, этнаграфічных, фальклёрных і археалягічных экспэдыцыях за апошнія гады. Таксама на бачынах нашага выданьня можна будзе прачытаць творы нашых сяброў – навукоўцаў, бардаў, мастакоў, пісьменьнікаў, музэйных работнікаў і, зразумела, нашых землякоў.

Асобна хочацца сказаць некалькі слоў пра мову нашага выданьня. Мы шануем родную мову ва ўсіх яе формах – таму, дарагі чытач, ты знойдзеш тут артыкулы, напісаныя як «тарашкевіцай», гэтак і «наркомаўкай».

Выказваем шчырую падзяку Цэнтру «Скрыжаваньне» (Барысаў) у дапамозе па выданьню гэтай кнігі.



Галоўны нацыянальны скаўцкі сымбаль *– белая ліпея з трыма пялёсткамі на чырвоным тле. Эмблема РГА «Аб'яднаньне Беларускіх Скаўтаў». На сярэднім пялёстку мае шасьціканцовы крыж, узяты з нацыянальнага герба «Пагоня». Бела-чырвона-белая стужка зьвязвае тры пялёсткі. Ужываньне нацыянальных сымбаляў азначае любоў да Бацькаўшчыны. Унізе, на стужцы, зьмешчаны скаўцкі дэвіз-вітаньне «Напагатове!».*

ГІСТОРЫІ ПРА МАЛОЕ ПАЛЕССЕ І МАЛАПАЛЕШУКОЎ

КРАЯЗНАЎЧАЯ ФАНТАСТЫКА

Андр. Меленік

З ЧАГО ПАЧНЕМ?

Так склалася, што апошнія стагоддзі самыя раннія звесткі па гісторыі і роднага Беларускага Малога Па- ссся (а ёсць яшчэ Украінскае Малое Палессе) мы чэрпаем з кірылічных летапісаў, складзеных тутэйшымі праваслаўнымі хрысціянамі. Пачынаюць тыя летапісы адлік гістарычнага часу з 859-862 гадоў, калі вараг Рурык пасадзіў сваіх намеснікаў (сыноў) княжыць у Кіеву, Полацку, Смаленску ды Ноўгарадзе. Раней, без удакладнення часу, ўзгадваюцца апостал Андрэй, што паставіў крыж на месцы будучага Кіева, Кій, Шчэк, Харыў і сястра іх Лыбедзь, што Кіеў заснавалі, ды ваяўнічыя обры, што пасля "погібоша".

Ды апроч гэтых кірылічных тэкстаў, былі іншыя, якія захавалі звесткі пра наш край, нашы гарады і дзяржавы.

Усходнія географы VII-X стагоддзяў – арабы аль-Балхі, аль-Істархі, ібн-Хаўкаль, Худуд аль-Алем, Джэйхані, Махамед аль-Ідрысі, а таксама перс, аўтар "Кнігі межаў свету ад усходу да захаду" (Персідскі Ананім) узгадваюць тры буйныя племянныя цэнтры на нашых землях: Куябію (Куяву) са сталіцай Куяба (Куява), Слабію (Славію) са сталіцай Слава (Слаба, Селяба) і Артанію (Арсанію) са сталіцай Арта (Артаб, Арція, Артан, Арсан, Уртаб).

Куяба, па сведчаннях гэтых географаў – бліжэй за іншых "да Булгару і краін ісламу. Месца большае за Булгар. Прыемнае месца і рэзідэнцыя цара. З яго вывозяць разнастайныя футры і каштоўныя мячы."

"Славія – далей. Селяба – прыемнае месца, з якога ў мірны час жыхары ездзяць гандляваць у зямлю булгараў."

Яшчэ больш сівыя часы. Канец II-пачатак III стагоддзя. Пахаладанне ў Еўропе. Па Даўгаве і Нёмане падымаюцца на ладдзях да Славіі готы, каб перажыць тут цяжкія гады. Затым яны ж рушаць на Днепр і жывуць там, сярод славян, у міры і згодзе тры гады. Потым прыходзіць голад і ў Славію. Князі, што сядзяць у Селябе ды Джарвабу (у іншай транскрыпцыі — Хардабу, Хадраце) патрабуюць, каб готы сыходзілі, і тыя пачынаюць свой "націск на поўдзень" разам са славянскімі воямі, якія да таго далучаюцца.

На той час, готы ўжо валодаюць рунічнай пісьмовасцю. І руны сапраўды знаходзяць сучасныя археолагі пры раскопах на паўвыспе возера Сялява. З VIII стагоддзя да н.э на працягу дваццаці трох стагоддзяў з нядоўгімі перапынкамі тут існавала буйное месца. Сялява, колішняя сталіца Славіі, равеснік Рыму. Напачатку XVI стагоддзя жыхары пакінулі яго, а на мапах з'явілася мястэчка Бобр.

* * *

Месца Сялява, па сутнасці, дало імя тым, каго ведаюць два тысячагоддзі, як славянаў. Разыйшліся па свеце найменні рымлянаў, візантыйцаў, маскавітаў, сталі вядомымі і сла

-вяне – грамадзяне Славіі-Сялявы – дзяржавы, што ў часы росквіту займала вярхоўі Дзвіны і Нёмана ды ўвесь басейн Дняпра да чарнаморскіх стэпаў. А час яе росквіту прыйшоўся на пачатак-сярэдзіну II стагоддзя. Як і Рыму...

Дакументацыя Сялявы-Славіі была клінапіснай. Запісы вяліся, у асноўным, на берасце, а нямногія дайшоўшыя дагэтуль каменныя ды гліняныя дакументы з ёй знаходзяцца ў прыватных калекцыях і чакаюць сваіх даследчыкаў.

Як і ў Рымскай Імперыі, на паўночным усходзе Славіі ў сярэдзіне II стагоддзя паўстаў апазіцыйны цэнтр. Ён сфармаваўся вакол буйнога паганьскага капішча і стаў вядомы, як Горад (у арабскіх крыніцах – Хадрат). Капішчы з даўніх часін агарожваліся частаколам ад непажаданых назіральнікаў – таму і званіся гарадамі. Крывісы (жрацы капішчаў) пасадзілі ў Горадзе абранага імі князя і абвесцілі непадпарадкаванне Сяляве. Так адбыўся першы падзел Славіі. І узнікла Крывія.

У сярэдзіне IV стагоддзя на Еўропу абрынулася гунская навала. Каб стварыць непераадольныя перашкоды для гэтага ваяўнічага народа, што па сведчаннях рымскага ваяра і пісьменніка Аміана Марцаліна "прырос да коней", на поўдні Славіі (сучасная Валыншчына, Ровеншчына і Жытоміршчына) узводзяцца велічэзныя валы. Яны цягнуцца на многія дзясяткі кіламетраў, а самі слаўскія паселішчы пераносяцца на рукатворныя насыпы – гарадзішчы. Раней даступныя толькі абраным, паганьскія капішчы цяпер знаходзяцца ў цэнтрах слаўскіх месцаў, старадаўнія веды ўваходзяць у масы, грамадства імкліва дэмакратызуецца.

Распад гунскай імперыі ў канцы V стагоддзя адбіваецца на Славіі яе далейшым дзяленнем. Адзін з буйнейшых слаўскіх князёў Кій (у навакольлях Сялявы захавалася яго родавае паселішча Кіявец) пасля перамогі над сцепнякамі не вяртаецца да Сялявы, а засноўвае на Дняпры горад і абвяшчае сябе адзінаўладным уладаром яго навакольляў. Кіеў хутка расце і багацее, а Славія страчвае яшчэ частку магуты.

* * *

Кітайскія крыніцы V стагоддзя пад імём "Ю-ян" упершыню ўзгадваюць аваараў – качавых жыхароў Унутранай Азіі. Адтуль яны прагна рушаць на усход, даходзяць да Паўночнага Прычарнамор'я і ў 445-454 гадах існуюць як баявы рэзэрв гуннскай імперыі Атылы. Пасля смерці Атылы авары ўваходзяць у савірскі племянны саюз, разам з савірамі рушаць на Каўказ, дзе ўладкоўваюцца на тэрыторыі сучасных Дагестану ды Ічкерыі і адтуль вядуць паспяховыя войны з Візантыяй і Персіяй, уражваючы супраціўнікаў сваімі лёгкімі крытымі таранамі, ды граматнымі абарончымі збудаваннямі. Менавіта аварам перадаюць майстры зброі з Семяндэру сакрэт вырабу дамаскай сталі.

У сярэдзіне VI стагоддзя на змену савірам на вядучыя ролі ў племянным саюзе выходзяць хазары. Авары гэтымі зменамі зусім не задаволены. Яны выходзяць з племяннога саюза і, амаль у поўным складзе, (за выключэннем некалькіх родаў, што сыходзяць у горы), рушаць на поўнач. У Паўночным Прычарнамор'і авары распадаюцца на дзве плыні.

Жыхары Славіі, Крывіі і Кіева завуць аваараў обрамі. Незадаволеныя занадтым, на іх думку, уплывам крывісаў, крывіцкія князі запрашаюць обраў да сябе, каб тыя дапамаглі ў

іх барацьбе за ўладу. На гэта пагаджаецца заможная обрская вярхушка (у тым ліку, майстры дамаскай сталі), а маладыя амбіцыйныя роды жадаюць паўтарыць шлях Атылы і рушаць на захад – у Панонію, дзе ствараюць ваяўнічы аварскі каганат, які праіснуе амаль два з паловай стагоддзя.

Уварванне абраў у Крывію прывяло да поўнага знішчэння яе сталіцы – Горада. Рэшткі колісь усемагутных крывісаў з нямногімі саюзнымі ім князямі уцяклі на поўнач і паўночны ўсход, дзе заснавалі новае галоўнае капішча – Ноўгарад, крэпасці Полацак і Плескаў. Насельніцтва Крывіі, як і суседняй Славіі вымушана аказалася насыпаць гарадзішчы, каб хоць неяк ратавацца ад коннай навалы. У Верхнім Падняпроўі паўстала дзяржава Арда (ці, у славянскім маўленні – Артанія) з рухомай стаўкай князёў і магутнай конніцай.

Сляды Арды дагэтуль існуюць у шматлікіх тапонімах на орд-, одр-, ард-, адр- а ў міжрэччы Дняпра і Сожа ў выглядзе ўнікальнай для лясных рэгіёнаў традыцыі каняводства.

Арабскія крыніцы кажуць пра Артанію так: "Яе насельнікі выпраўляюцца гандляваць у Куябу па вадзе, але нічога не распавядаюць пра свае справы, тавары і не дапускаюць нікога праводзіць іх і не даюць трапіць у іхнюю краіну. Ва Урце забіваюць іншаземцаў. А яшчэ там выраблюць каштоўныя клінкі для мячоў і мячы, якія магчыма перагнуць напалову, але калі адпусціць іх, яны вяртаюцца ў ранейшы стан."

Славіі прыйшлося ратавацца ад ваяўнічай Артаніі пабудовай доўгага абарончага валу на ўсход ад сталіцы. Рэшткі валу захаваліся да нашых часоў на паўднёвым усходзе Віцебскай вобласці, недалёк ад Талочына.

Неўзабаве кіраўнікі Сялявы запрасілі для сваёй абароны некалькі тысяч обрскіх вояў з Каганату і далі ім у валоданне мясцовасць, паабапал прыгожай ракі, якой раней валодаў род Кія. З тых часоў рака стала звацца Обар (ці, з асаблівасцю тутэйшага маўлення – Бобар). Галоўнае сваё паселішча обры назвалі Кабказ – у гонар добрай памяці зямлі продкаў.

Калі ў IX стагоддзі пад супольнымі ўдарамі франкаў, баварцаў і антаў скончыў існаваць Аварскі каганат, нямногія з выжыўшых авараў знайшлі сябе прытулак менавіта ў суродзічаў на Бабры.

Так што зусім не выпадкова насельніцтва берагоў Бабра характарызуецца як мужнае, адкрытае і зменлівае. Генная памяць...

Калі напачатку XVI стагоддзя распачаліся крывавыя маскоўска-літоўскія войны, апошняе насельніцтва Сялявы пакінула яго. Славуты горад, які праіснаваў дваццаць тры стагоддзі памёр. Апошнія сяляўцы пайшлі да нашчадкаў абраў, і з'явілася мястэчка Бобр.

Да вялікай Славіі больш за тысячу гадоў існавала на Малым Палессі кельцкая дзяржава Брытанія. Малая Брытанія, продак Брытаніі Вялікай, пакінуўшая свой адбітак.

* * *

Кельты ішлі першымі з навалы індаеўрапейцаў. Прагнучы займаць найвышэйшыя кропкі мясцовасці і водападзелы. Мяшаючыся з мясцовым насельніцтвам і пераймаючы яго антрапалагічныя рысы. Кельты неслі на каланізаваныя тэрыторыі майстэрства апрацоўкі зямлі і вырабу металаў: сакральнае спалучэнне чырвонай медзі з белым волавам у бронзу. Кельты шанавалі катоў і ўвогуле жывёл сямейства кашачых – свабодных,

незалежных, мягкіх на вобмацак і бязлітасных на паляванні.

Першыя кельты мелі вялізны рост, светлыя вочы і валасы (мо яны і былі тымі легендарнымі волатамі, што пакінулі пра сабе гераічныя паданні ды курганы-валатоўкі) але, як і праз тысячагоддзе рымляне няўхільна змяшаліся з каланізаванымі абарыгенамі і перанялі іх каржакавты смугласкуры смуглавалосы выгляд.

Узгадкі пра Брытанію ці Брытунію Усходняй Еўропы можна сустрэць у кельцкіх паданнях, за імі – у творах заходніх гістарычных белетрыстаў і фантастаў. Брытунія – адна з дзяржаваў, што адыграла значную ролю ў еўрапейскай гісторыі пасля гібелі Атлантыды, прынесла ў яе бронзавы век і, можна казаць, паклала пачатак таму, што ўласна завецца еўрапейскай цывілізацыяй, затым распалася пад уціскам сваёй старасці і нованапіраючых арыеў – будучых англаў, саксаў, балтаў ды славян.

Таксама арыі, кельты засталіся тым мостам паміж уласна арыйскай і даарыйскай культурай, які дазваляе нам пабачыць нашае мінулае і ў іншых расах: напаўжоўтых еўразійцах угра-фінах, у этрусках, старажытных егіпцянах і барбарах (берберах) – нашчадках чырвонаскурай Атлантыды, у кучаравых семітах – былых насельніках Антарктыды і Афрыкі, у чорных эфіопах і жыхарах экватарыяльнай зоны – з якімі судакраналіся рымляне і барбары. Арыі-першапраходцы кельты судакраналіся і мяшаліся з усімі імі, каланізавалі, пераймалі і саступалі, утваралі новыя этнасы. Немала этнасаў было ўтворана з іх дапамогай і на Малым Палессі.

МАЛОЕ ПАЛЕССЕ – КАЛЫСКА НАРОДАЎ

Нямала доказаў у тых навукоўцаў, якія шукаюць прарадзіму славян на Палессі. Адсюль напрыканцы І стагоддзя н.э. пачаўся рух славянства на поўдзень, адсюль пайшло развіццё беларускай, рускай, украінскай і польскай цывілізацый.

Але, на поўнач ад Палесся ўсім вядомага знаходзіцца багаты помнікамі старажытнасці рэгіён, які з даўніх часоў завецца Палессем Малым, а паданні сучасных ірландцаў, шатландцаў ды валійцаў узгадваюць яго, як Малую Брытанію, ці Брытунію – зямлю брытаў. Чаму? Памятаеце пра Малую Польшчу і Маларасію? Малы, апроч іншага, яшчэ і ранейшы, першапачатковы.

Геаграфічна Малое Палессе размясцілася на Балтыйска-Чарнаморскім вадападзеле ў раёне возера Сялява, ды ў басейне ракі Бобр. Паўночнай мяжой рэгіёна стала мяжа наступу апошняга ледавіка. Ратуючыся ад ледавіка і адышло дзесяць тысяч год таму насельніцтва Малога Палесся ў цёплыя краі, каб праз тысячагоддзі вярнуцца з Паўднёвага Ўсходу магутнай ведыйскай хваляй, а на Паўднёвым Захадзе стварыць чыста еўрапейскую цывілізацыю этрускаў.

А засялілі Малое Палессе пад час наступу ледавіка невялічкія групкі адыйшоўшых з поўначы круглагаловых палярных паляўнічых ды рыбаловаў, тых, каго праз тысячагоддзі назавуць фіна-уграмі..

Вядыйцы (індаеўрапейцы, арыі) пачалі вяртацца ў гэтыя мясціны ля чатырох з паловай тысяч год таму. Гэта былі вельмі размаістыя плямёны, якія сеялі зерне, карысталіся керамічным посудам, шанавалі ды даглядалі кароў і катоў, а таксама ладзілі капішчы. Кіравалі плямёнамі валадары бронзавых сякер-кельтаў, але толькі ў малым. Усе сур'ёзныя

пытанні вырашаліся асобнай кастай – друідамі.

Друіды жылі асобна ад кельцкіх паселішчаў, на магічных капішчах, разам са служкамі, якія штогод прыносіліся ў ахвяру. Друіды выконвалі таямнічыя рытуалы, выраблялі чароўныя рэчывы з грыбоў, зёлак, чалавечай і звярынай крыві, вызначалі тэрміны сяўбы і жніва, размаўлялі з духамі, дрэвамі, камянямі і крыніцамі, лячылі ўладароў бронзавых сякер, д[illegible]валі тым карысныя парады па [illegible]ўніцтву племенем, а тыя забяс[illegible]валі нодасягальнасць капішчаў для чужых.

Самыя ўплывовыя з друідаў – брыты – чатыры разы на год збіраліся на Галоўным Капішчы-абсерваторыі ў глыбіні Малога Палесся на Вялікі Рытуал. Тут палілася магічнае вогнішча, прыносіліся шматлікія чалавечыя ахвяры і шлі самыя сур'ёзныя размовы.

Стасункі кельтаў з круглагаловымі паляўнічымі склаліся адносна мірныя – тыя проста не здолелі супрацьстаяць арганізаванай арыйскай навале і былі вымушаныя трываць кельцкія паселішчы і капішчы недалёк ад уласных стойбішчаў. Улада друідаў не ўспрымала круглагаловых як ворагаў, і тыя жылі сваімі традыцыямі, трапляючы на ахвярныя алтары кельтаў, калі перашкаджалі тым чымнебудзь.

Увогуле, людзей на Малым Палессі было тады не так многа, каб занадта перашкаджаць адзін адному. Круглагаловых дзяўчын валадары бронзавых сякер нярэдка бралі ў жонкі, тым больш, што жонак у кожнага з іх было па некалькі. Друіды жонак не мелі, бо гэта перашкаджала магічнай дзейнасці, але дзяцей, каб выхаваць сабе змену бралі – па ўласным выбары. І ніхто друідам не пярэчыў.

Паступова на Галоўным Капішчы брытаў запалала негасімае вогнішча – вечны Зніч. Капішча ператварылася ў пастаянную брыцкую рэзідэнцыю і стала сталіцай першай кельцкай дзяржавы – Брытуніі.

Брытунія на Малым Палессі праіснавала больш за тысячу гадоў, пакуль у VIII ст. да н.э. яе не разбурыла нашэсце барбараў – ваяўнічага племені, што адкалолася ад скіфскага племяннога саюза, калі скіфы распачалі выцясненне кімерыйцаў з Паўночнага Прычарнамор'я

Але гісторыя барбараў – гэта асобная гісторыя.

БАРБАРЫ: ДОЎГІ ШЛЯХ ДА БЕЛАРУСІ

Нашэсце барбараў у VIII ст. да н.э. разбурыла больш за тысячагадовую кельцкую дзяржаву на Балта-Чарнаморскім вадападзеле і прылягаючых да яго тэрыторыях. Кельцкая сталіца ў глыбіні Малога Палесся скончыла існаванне, але яе Вечны Зніч не згас. Друіды Вечнага Зніча, пазбаўленыя вярхоўнай ўлады, працягвалі карыстацца ўплывам за кошт велізарных ведаў, хаця, у адрозненне ад валадароў бронзавых сякер-кельтаў, барбары не падпарадкоўваліся жрацам, а толькі прыслухоўваліся да іх парад.

У VIII ст. да н.э. барбары адкалоліся ад скіфскага племяннога саюза, але іх гісторыя сягае ў непараўнальна глыбейшыя часы, чым гісторыя скіфаў. Славуты вершнікамі і ваярамі народ прыйшоў да скіфаў, якія тады жылі ў нізоўях Дону і Волгі з поўдня – Паўночнага Каўказу ў 828 г. да н.э. усяго на некалькі дзесяцігоддзяў, каб у далейшым ізноў разыйсціся – кожны ў сваім напрамку.

Адкуль у нас дакладная дата

прыходу барбараў да скіфаў?

У 860-м годзе да н.э. у Асірыі прышоў да ўлады цар Салмансар III. І адразу ж распачаў вайсковыя аперацыі супраць лежачай ў Закаўказзі дзяржавы Ўрарту. На той час барбары складалі аснову ўрарцкіх узброеных сіл, а галоўныя іх гарнізоны з сем'ямі знаходзіліся ў сталіцы дзаржавы Арзашку і ў горадзе-крэпасці Сугуніі. Менавіта на Сугунію прышоўся першы ўдар Салмансара: "Да Сугуніі, крэпасці Арама Ўрарта, я наблізіўся, горад аблажыў, захапіў я, забіў мноства іх вояў, увёз здабычу, кучу з галоў зрабіў я насупраць іх горада, 14 паселішч яго наваколляў спаліў я агнём. Ад Сугуніі я сышоў, спусціўся да мора Наіры (возера Ван), маю зброю амыў я ў моры, ахвяру прынёс я маім багам."

У 858 г да н.э. асірыйцы дайшлі і да Арзашку. Вось як апісвае гета Салмансар: "Да Арзашку, царскага горада Арама Урарта, я наблізіўся. Урарт Арам спужаўся горычы маёй моцнай зброі і моцнай бітвы і кінуў свой горад. У горы Аддуры ён падняўся; за ім падняўся і я, моцную бітву зладзіў я ў гарах, 3400 вояў паверг я сваёй зброяй, як Адад хмару над імі праліў я дажджом, іх крывёю афарбаваў я гару нібы воўну, яго лагер я захапіў, яго калясніцы, вершнікаў, коней, мулаў, цялят, маёмасць і багатую здабычу прывёў я з гор. Арам, сваё жыццё ратуючы, збег на недаступную гару. У маёй магутнай моцы, як тур раздавіў я яго краіну, паселішчы ператварыў у руіны ды спаліў вагнём. Горад Арзашку і паселішчы яго наваколляў захапіў, разбурыў ды спаліў вагнём."

Пасля здачы Арзашку і жахлівай паразы ў гарах ацалелыя рэшткі барбараў не пажадалі больш служыць пужліваму няўдачніку Араму. Яны сышлі на поўнач – да Каўказскага хрыбта, а затым – праз трыццацігадовае вандраванне – апынуліся з еўрапейскага яго боку – на землях скіфаў.

Але і Урарту не было радзімай барбараў. Яны прышлі ў наваколлі возера Ван з усходу ў канцы X ст. да н.э., калі дзяржавы Ўрарту яшчэ не існавала, а існаваў саюз плямён, што большай часткай варагавалі між сабой і плацілі даніну Асірыі. Барбары падтрымалі ва ўсобіцы лідара аднаго з плямён – Сардуры Урарта. Той, дзякуючы гэнай падтрымцы ўзвысіўся незвычайна і падпарадкаваў усе саюзныя плямёны ў магутную ў будучым дзаржаву Урарту, дзе стаў першым царом – Сардуры Вялікім.

Дзяржава Сардуры не пажадала плаціць даніны Асірыі і захоўвала годную незалежнасць да самой смерці стваральніка. Пасля быў цар-небарака Арам, які большасць праўлення правёў у гарах, ратуючыся ад крывавых асірыйцаў Салмансара, але, пад канец жыцця здолеў у значнай ступені реабілітавацца перад нашчадкамі, заснаваўшы на беразе возера Ван новую сталіцу ўрартаў Тушпу.

Пры нашчадках Арама – Менуа, Аргішці I і II, Сардуры II дзяржава Урарту са сталіцай ў Тушпе дасягнула небывалай магуты і выдатных перамог над Асірыяй. Імя заснавальніка Тушпы – Арама Вялікага і дагэтуль шануецца армянамі, якія лічаць яго сваім славутым продкам. Толькі гэта ўжо іншая гісторыя. Мы ж распавядаем пра адных з нашых продкаў – пра барбараў.

Малазійскі перыяд гісторыі барбараў быў больш працяглым за

Урарцкі ды Скіфскі і скончыўся з падзеннем Троі, пра якое красамоўна распавяла "Іліяда". Менавіта на барбараў – эліту траянскай абароны – быў разлічаны геніяльны хітрык з вялізным драўляным канём. Для барбараў ужо многія тысячагоддзі конь з'яўляўся сымбалем іх улады і моцы – іх татэмнай жывёлай. Магчыма, яны расцанілі Траянскага Каня як хабар, магчыма – гэта проста была іх памылка – хто ведае зараз? Але без гэтай памылкі (?) Іліён не пацярпеў бы паразу, а пасля паразы імя барбараў стала для ўсяго малазійскага ўзбярэжжа яе сінонімам, было праклята і аддадзена забвенню. Барбарам прыйшлося пакінуць Трою і сысці. Шлях сушай існаваў толькі адзіны – на ўсход. На стасункі з морам у барбараў было табу – мора ў іх паданнях паўставала заўжды як носьбіт няшчасця, носьбіт смерці. І барбары сышлі сушай. І ўзгадваць пра іх перасталі...

Але застаўся звычай, які ў Малую Азію прынеслі менавіта яны – звычай насіць бароды формы, што пасля назавуць грэчаскай – ад грэкаў-пераможцаў Іліёна, пераняўшых мноства рэчаў ад пераможаных. І засталося імя барбараў у слове "барб" ці "барба", якім сталі пазначаць у Еўропе спачатку бароды грэчаскай формы, а затым усе бароды ўвогуле.

Прышлі ж барбары да Троі ў XVIII стагоддзі да н.э. з тэрыторыі, што ў сучаснасці завецца Палестынай. У тыя часы тут існавала некалькі дзяржаваў, вядомейшымі з якіх былі Элам і Фінікія. Амаль усе дзяржавы Палестыны былі заснаваныя пры ўдзеле берабераў – народа, які па паданнях складаўся з нашчадкаў ацалелых атлантаў – жыхароў загінуўшай больш за 10000 год таму Атлантыды. Качавыя берберы-атланты, усё далей аддаляючыся ад акіяна, колісь паглынуўшага іх прарадзіму неслі з сабой тайныя веды, і гэтыя веды рушылі да развіцця новыя маладыя цывілізацыі.

Частка берабераў засталася ў Афрыцы. Яны захавалі назву народа дагэтуль. Астатнім берберам на шляху тысячагоддзяў давялося перажыць працэсы асіміляцыі і змены саманазвы.

Асіміляцыя з егіпецкімі плямёнамі прывяла ў далейшым да стварення магутнай Егіпецкай цывілізацыі, асіміляцыя з фінікійцамі ўтварыла слаўнейшую (да грэкаў) пірацкую цывілізацыю Міжземнамор'я (да яе стварення спрычынілася, відавочна, надзвычай адважная частка берабераў, бо ёй давялося пераступіць праз табу продкаў, што тычылася мора-зла, мора-смерці). Асобныя берберскія атрады дайшлі да Міжрэчча, зліліся з арыямі – і паўсталі Шумер ды Акад.

Яшчэ адна хваля берабераў-перасяленцаў стварыла ўласную дзяржаву з двума сталіцамі — гарадамі Садомам і Гаморай. Дзяржава гэтая праіснавала адносна бязбедна некалькі соцень год. Але аднойчы да яе лідэра-правадыра сыйшоў сон звыш, з якога вынікала, што на берберах з часоў Атлантыды ляжыць праклён, што любой іх дзяржаве – лёс жахліва загінуць. І ёсць адзіная зямля недзе на Поўначы, якая пазбавіць берабераў ад гетага праклёну.

І лідэр-правадыр берабераў абвясціў пра свой сон свайму народу і павёў свой народ на поўнач – да невядомых земляў. Але паверылі і падпарадкаваліся яму не ўсе.

"Скептыкі" засталіся ў Садоме і Гаморы пад кіраўніцтвам нейкага жраца Беры. Праз месяц Садом і Гамора падпалі пад уладу суседняга Элама. Незалежная дзяржава берберaў перастала існаваць.

Прайшло чатырнаццаць гадоў. Беры падняў у Садоме паўстанне. Садамляне панішчылі эламскіх чыноўнікаў і абвясцілі новую незалежнасць Садома. Тое ж адбылося і ў Гаморы. Праз сорак дзён Садом і Гамора былі панішчаны жахлівым нябесным агнём. Ніхто не ўратаваўся.

Даведаўшыся пра трагедыю садомскіх і гаморскіх берберaў, берберы, сыйшоўшыя на поўнач змянілі назву. Так з'явіліся барбары.

ГАРАДЗІШЧА НА ВЫСПЕ ВОЗ. СЯЛЯВА КРУПСКАГА РАЁНА

АРХЕАЛЁГІЯ

Шадыра В.І., Мацвеева Л.Я., Махнач А.І.

На гарадзішчы каля в.Клішана, вядо- ым пад мясцовай назвай «Выспянская ра», з 1909 г. праводзяцца археалагічн- я даследаванні. Актыўны ўдзел у рас- опках прымаюць школьнікі-скаўты з г.Крупкі. Гарадзішча размешчана на выс- не воз.Сялява ў 1,7 км на поўдзень ад в.Янаўшчына, з якой і злучылася цяпер в.Югішана. Помнік прывязаны да в.Клішана (Штыхов, 1971, с. 178), хаця бліжэй знаходзіцца в.Баркі. Дакладная топапрывязка гарадзішча наступная: Татур, 1892. с. у 0,8 км на ўсход ад в.Баркі і ў 0,3 км ад сучаснага могільніка. Выспа на возеры Сялява ўтварылася ў выніку пад'ёму вады пры будаўніцтве ГЭС у 50-я гады XX ст. Раней гэта быў мыс ці перашыек між двух азёр – Абіда і Сялява. Гэтая мясцовасць вартая ўвагі тым, што знаходзіцца ў рэгіёне агульнаеўрапейскага водападзела Балтыйскага і Чорнага мораў. Само возера звязвае басейны Зах.Дзвіны і Дняпра адпаведна дзвюмя рэчкамі (Югна і Ракітаўка). Гэтым фактам і быў абумоўлены лукомльскі адрэзак шляху «з варагаў у грэкі», аб якім казаў яшчэ Е.Р.Раманаў на пачатку XX ст.: «З Балтыйскага мора ў Дзвіну, потым Улу, адсюль па Лукомцы (і Югне – В.Ш.) у возера Сялява, далей волакам да Бабра, а потым па Бярэзіне і Дняпры ў Чорнае мора» (Романов, 1903).

У археалагічных адносінах гэты рэгіён цікавы сваім памежным размяшчэннем сярод разнастайных археалагічных культур ад эпохі каменнага веку да сярэднявечча. У эпоху жалезнага веку гэтая тэрыторыя знаходзілася ў зоне кантакту днепра-дзвінскай і штрыхаванай керамікі культур (мал. 1).

Што да назвы возера Сялява, то яна, хутчэй за ўсё, адлюстроўвае форму балцкага этноніма selis з далучэннем тыпова балцкага фарманта «ава». Такім чынам, балцкі этнонім пераўтварыўся ў гідронім Сялява. Побач з формай selis існаваў і суфіксальны дэрыват selonas (параўн. лац. Selones Selonia (Кузавинис, 1970, с. 159—160)). Звязваць назву возера з селамі вельмі гіпатэтычна. Аднак калі дапусціць, што селы разам з латгаламі ўваходзілі ў склад старажытных племянных утварэнняў балтаў, якія пражывалі на больш значных прасторах басейна Зах.Дзвіны (Даўгавы), і цалкам верагодна, што іх продкі маглі трапляць у межы сярэдняга ці беларускага яе цячэння. В.В.Сядоў, спасылаючыся на «Пеўцінгераву карту», дзе пазначана «Fluoius Sellianus», што азначае «рака селаў», мяркуе, што селы, якія далі назву рацэ Даўгаве, у першай палове I тысячагоддзя н.э. былі буйной этнічнай адзінкай і жылі на абодвух берагах Даўгавы (Седов, 1987, с. 365).

Цікавым з'яўляецца і гідронім Югна, які можна аднесці да фіна-ўгорскіх гідронімаў з наменклатурнай лексікай у значэнні «пратока», «выток з возера або балота, ручай, рака» (Шадыро, Овчинникова, 1992, с. 6).

Пачатак вывучэння помніка адносіцца да 1955 г., калі яго адкрыў і абсле-

даваў Л.Д.Побаль. У 1964 г. ім жа была зроблена шурфоўка. Па выяўленым матэрыяле даследчык залічыў гарадзішча да днепра-дзвінскай і штрыхаванай керамікі культураў і датаваў эпохай ранняга жалеза (Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі, 1987, с. 234).

Сістэматычнае даследаванне помніка вядзецца аўтарамі з 1999 г. Усяго ўскрыта каля 200 кв.м. Да канчатковых высноў яшчэ далёка, але папярэднія выглядаюць наступным чынам. Сляды чалавечай прысутнасці на гэтым месцы фіксуюцца яшчэ з эпохі неаліту (разнастайныя крамянёвыя скрабкі, адшчэпы, вастрыі, укладышы, рэтушоры і да т.п. (мал. 2: 1—12). У эпоху бронзы тут, мабыць, было культавае месца, дзе адбываліся і пахаванні (косткі чалавечыя, амулеты з рэбраў, іклаў і разцоў, крамянёвая паліраваная клінападобная сякерка, фрагмент керамікі з ружанцовым арнаментам). У якасці ўмацаванага паселішча яго спачатку выкарыстоўвалі днепра-дзвінцы, але інтэнсіўнае жыццё на ім звязана з плямёнамі культуры штрыхаванай керамікі. Элементы гэтай культуры дамінуюць з мяжы н.э., куды арганічна ўлілася пазней і кераміка з расчосамі. Гарадзішча актыўна выкарыстоўвалася ў 3-й чвэрці I тысячагоддзя н.э. носьбітамі культуры тыпу Банцараўшчыны-Тушамлі. Затым жыццё на гэтым месцы замірае і адраджаецца толькі ў перыяд позняга сярэднявечча, калі тут была сядзіба феадала (кафля тэракотавая XVI – XVII стст., трайны грош Жыгімонта III, ганчарны посуд і інш.). Хаця трэба адзначыць, што былі зафіксаваныя таксама і асобныя знаходкі IX – XIII стст. (арабскі дырхем, канец IX ст., некалькі фрагментаў посуду X – XIII стст.).

Асноўную масу знаходак складаюць вырабы з гліны (прасліцы, грузікі, у тым ліку і дзякава тыпу). Апрача гліняных знойдзены грузік дзякавага тыпу з косткі (мал. 5: 8). Прасліцы з гліны прадстаўлены самай разнастайнай формы, яны характэрныя як для гарадзішчаў штрыхаванай керамікі (мал. 4), так і для помнікаў 3-й чвэрці I тыс. н.э. (мал. 4: 9, 10).

Значная частка прасліцаў арнаментаваная (мал. 5), што адлюстроўвае светапогляд насельніцтва гарадзішча. Тут фіксуюцца выявы левых трохчасткавых свастык, якія звычайна трактуюцца як жаночыя (мал. 5: 7). Акрамя гэтага яны сімвалізуюць траістасць свету і грамадства, што характэрна для індаеўрапейцаў (Голан, 1994). Вядома, што лічба 3 з'яўляецца сакральнай для шматлікіх старажытных і сучасных народаў. Часта сустракаецца арнамент у выглядзе трохкутнікаў з вяршынямі ў супрацьлеглыя бакі (верх, ніз) (мал. 5: 3, 4, 5). Вядомы яшчэ ў неаліце, ён сімвалізаваў нябесную ваду. Трохкутнік з вяршыняй унізе азначаў жанчыну. На думку Б.А Рыбакова такое спалучэнне звязана з язычніцкім культам Вялікай Багіні- Маці, якая адказвала за дождж (Рыбаков, 1994. с. 388). Трохкутнікі на прасліцах могуць быць адзнакамі багіні, якая, да таго ж, апекавалася жанчынамі і іх заняткамі, у прыватнасці прадзеннем. Яшчэ адзін цікавы знак сустрэты на праселках з Клішына (мал. 5: 9). У беларусаў ён дагэтуль выкарыстоўваецца ў вышыўцы і завецца «баба», альбо «жаба». На вялікім археалагічным і этнаграфічным матэрыяле А.К.Амброз паказаў, што гэты знак мае сувязь з плоднасцю (Амброз, 1965). А Б.А.Рыбакоў лічыць, што знак «баба» выяўляе жанчыну, якая нараджае дзіця (Рыбаков, 1994). На двух прасліцах і адным з фрагментаў пасудзіны назіраецца выява шасціканцовай зоркі (мал. 5: 1. 9). Як адзначае А.Голан, гэты знак сімвалізуе шэсць канцоў свету і сувязь з небам і з'яўляецца эмблемай Вялікай Багіні-Маці (Голан, 1994, с. 150). Цікавасць

выклікае арнаментацыя касцянога грузіка дзякава тыпу (мал. 5: 8), што складаецца з паралельных ліній з разбежнымі промнямі. Тут у наяўнасці сімволіка дажджу ці вады, гаспадыняй якіх з'яўлялася ўсё тая ж Вялікая Багіня. Такім чынам, арнаментыка прасліц і грузікаў гарадзішча звязана перш за ўсё з плоднасцю і ўшанаваннем Вялікай Багіні-Маці.

З рэлігійнымі вераваннямі звязаныя знаходкі касцяных пласцінак з адтулінамі з рэбраў капытных жывёлаў (мал. 2: 1–12), касцяныя падвескі-амулеты з нарэзкамі з іклаў і разцоў ваўка, бабра, дзіка, аленя, лася, каня, барсука (мал. 2: 13 – 20). Гэтыя артэфакты канцэнтраваліся каля і ўнутры меркаванага ахвярніка, выяўленага пад час раскопак. Ён уяўляў з сябе яму канічнай формы з верхнім дыяметрам 4 – 4,5 м і глыбінёй да 2 м. Тут былі выяўлены фрагменты ляпнога гладкасценнага і штрыхаванага посуду, зубы жывёлаў з нарэзкамі і касцяныя пласцінкі з адтулінамі (мал. 2). Побач з ямай у мацерыковым слоі на глыбіні 1 м зафіксаваны няпоўны шкілет чалавека (фрагмент ніжняй правабаковай сківіцы, пазванкі, фалангі пальцаў) і каня, а таксама шматлікія касцяныя пласцінкі з адтулінамі і амулеты з разцоў і іклаў жывёлаў з нарэзкамі. Няпоўны шкілет чалавека выяўлены таксама ў 20 м ад ахвярніка на мацерыковай паверхні (сцегнавыя і галёначныя косткі, фалангі пальцаў, пазванкі). Тут жа побач знойдзена клінападобная крамянёвая сякерка, добра адшліфаваная і завостраная (мал. 2: 13). Усе гэтыя фактары сведчаць пра культавыя дзеянні на гэтым паселішчы на працягу вялікага адрэзку часу ад эпохі бронзы, а магчыма і раней, аж да сярэднявечча.

Комплекс асноўных знаходак гарадзішча ўкладаецца ў дыяпазон I – VIII ст.ст. Памеры артыкула не дазваляюць даць ім падрабязную характарыстыку. Выяўленыя гградметы маюць шырокія аналогіі ў лясной зоне Усходняй Еўропы і асабліва характэрныя для балцкага месцапражывання. Дыферэнцыраваць старажытнасці насельніцтва днепра-дзвінскай і культуры штрыхаванай керамікі вельмі цяжка, бо набор металічных вырабаў тоесны ў абедзвюх культурах. Можна толькі канстатаваць, што сякеры паўднёвапрыбалтыйскага тыпу (мал. 6: 2) больш часта сустракаюцца на поўначы Беларусі, чым у цэнтральнай яе частцы (Паддубнікі, Аўгустава, Урагава, Барсукі, Буракова). Тыпалагічна яны адносяцца да другой групы па класіфікацыі Х.А.Маора, і іх можна датаваць канцом 1 тыс. да н.э. – першымі стагоддзямі н.э. (Шадыро, 1985, с. 52 – 53, мал. 31: 4, 6 – 9).

Што да посахапаобных булавак (мал. 6: 9 – 11, 16), то яны знойдзены на помніках многіх культур Цэнтральнай і Усходняй Еўропы – ад эпохі бронзы да ранняга сярэднявечча, асабліва ў балцкім арэале. В.В.Сядоў адносіць гэтую катэгорыю старажытнасцей да ўпрыгожанняў усходніх балтаў (Седов, 1967, с. 131). Самая вялікая колькасць знаходак посахападобных булавак зафіксавана ў арэале днепра-дзвінскай культуры, у яе ўсходнім, дняпроўскім варыянце (Шмидт, 1992, табл. 11 – 14). Па тыпалогіі А.М.Мядзведзева нашы экземпляры адносяцца да тыпу II, з верхняй часткай кроплепадобнай формы (Медведев, 1996, с. 180). В.В.Сядоў вызначае шляхі пранікнення посахападобных булавак – з Сярэдняга Падняпроўя ў Верхняе Падняпроўе і Прыбалтыку (Седов, 1967, с. 137). Шырокае іх распаўсюджанне звязана з мясцовай выпрацоўкай жалеза. Нашыя экземпляры па стратыграфічным паказчыку можна аднесці да першых стагоддзяў н.э. Узор тардзіраванай у верхняй частцы булаўкі (мал. 6: 16) з'яўляецца даволі рэдкай знаходкай, і дакладных аналогій ёй па-

куль не выяўлена.

Фрагмент познелатэнскай фібулы (мал. 6: 13) мае кароткую спружыну, ніжнюю цеціву і круглую ў сячэнні іглу. Бліжэйшыя аналогіі такім фібулам ёсць у зарубінецкай культуры (Кухаренко, 1961, с. 54, табл. 14, 9) і датуюцца яны мяжой н.э. (Амброз, 1959, с. 150). Падобную цэлую фібулу з Малышак А.Р. Мітрафанаў датаваў I ст. да н.э. – 1 ст. н.э. (Митрофанов, 1978, с. 36, мал. 22: 16).

Асаблівую цікавасць уяўляе наканечнік дзіды з развітым, ці прафіляваным, пяром (мал. 6: 1). Такі тып з гарадзішча-сховішча Дзямідаўка Я.А.Шміт адносіць да тыпу з полымяпадобнай формай з серыі варыянтаў з закругленай часткай пяра (Шмидт, 1995, с. 105 – 117, мал. 1: 2). В.Казакявічус паказвае шматлікія аналогіі іх ва Усходняй Прыбалтыцы, Фінляндыі, Швецыі і Нарвегіі і адзначае, што самыя ранніе наканечнікі з прафіляванай формай пяра сустракаюцца ў Латвіі і ў Даніі, дзе датуюцца III ст. н.э. З тэрыторыі Латвіі гэтыя наканечнікі распаўсюджваюцца ў суседнія землі балтыйскіх плямёнаў Усходняй Прыбалтыкі (і Беларусі – В.Ш.); а з Даніі – і на іншыя паўночна-еўрапейскія тэрыторыі (Казакявичюс, 1988, с. 36 – 40). В.В.Сядоў уключае такія вырабы ў комплекс правінцыйна-рымскіх па паходжанні рэчаў і лічыць, што ў эпоху вялікага перасялення народаў арэал такіх наканечнікаў (Дзямідаўка – В.Ш.) перамяшчаецца з Сярэдняй Еўропы ў Паўднёва-Усходнюю Прыбалтыку і Тушамлінскі рэгіён (Седов, 1998, с. 63. мал. 3: 8). Наш экземпляр трапіў на гарадзішча, хутчэй за ўсё, па Заходняй Дзвіне ад латгалаў і селаў, дзе яны былі шырока распаўсюджаны ў V – VI стст. (Latvijas PSR archeologija, 1974, 157 lpp; 39: 12, 21 tab.).

Вырабы з бронзы (мал. 7) не маюць вузкага датавання і добра вядомы ва Усходняй Еўропе, у тым ліку і ў арэале балцкіх старажытнасцей на тэрыторыі Беларусі і сумежных рэгіёнаў. Што да бранзалетападобных (мал. 7: 1 – 4) скроневых кольцаў з круглага ў сячэнні дроту, то апошнім часам В.В.Сядоў схільны звязваць іх з эпохай вялікага перасялення народаў і ідэнтыфікаваць са славянскімі старажытнасцямі (Седов, 1994). Нашыя экземпляры маюць некалькі іншую форму (з моцна заходзячымі канцамі і завіткамі ў некалькі абаротаў) і часта сустракаюцца на помніках позняга этапа культуры штрыхаванай керамікі (Археалогія Беларусі, 1999. с. 171, мал. 49: 19 – 22).

На гарадзішчы былі выяўлены 2 печы-дамніцы (мал. 9) круглай формы і амаль аднолькавых памераў. Дыяметр горна 0,4 – 0,6 м. Захаваўшаяся вышыня складала каля 0,5 м. На тэрыторыі вакол горнаў сабрана некалькі тысяч кавалкаў жужалю, прыкладна 40 кг. Жалеза ўтрымлівалі толькі некалькі дзесяткаў кавалкаў. Крыц не выяўлена. У 15 м ад дамніц зафіксавана канструкцыя (магчыма свяцілішча) ў выглядзе канічнай ямы глыбінёй звыш 2 м (мал. 10). Запаўненне яе складала інтэнсіўна чорная зямля, якая ўтрымлівала шматлікія косткі жывёл, дробныя камяні, гладкасценную і штрыхаваную кераміку, некалькі дзесяткаў касцяных пласцінак з рэбраў жывёл з адтулінамі (мал. 3). Тут былі тахсама знойдзены амулеты з разцоў і іклаў жывёлаў з нарэзкамі для падвешвання. Побач са згаданай ямай на глыбіні 0,5 м у мацерыку было зафіксавана скапленне чалавечых і жывёльных костак, а таксама пласцін з адтулінамі, некалькі амулетаў з іклаў і разцоў з нарэзкамі. Плацоўка аснавання дна ямы круглая па форме (дыяметр 1 – 1,2 м) утрымлівала інтэнсіўна чорны гумус з перапаленымі косткамі, вуглямі, камянямі. Размяшчэнне камянёў сведчыць аб наяў-

насці агменю круглай формы. Пад камянямі выяўлены буйныя кавалкі жужалю. Паўсюдна канстатаваны дробныя кавалкі жужалю, перапаленыя косткі жывёлаў (конь, кабан). Што датычыць чалавечых костак, то па вызначэнню А.Разлуцкай яны належалі мужчыне ва ўзросце каля 20 год.

Аснову керамічнага матэрыялу з раскопак складае ляпны гладкасценны посуд (52 – 57 %), прычым да днепрадзвінскага можна аднесці 10 – 15 %, астатні мае банцараўска-тушамлінскія рысы. На другім месцы – штрыхаваная кераміка – ад 25 да 30 %; кераміка з расчосамі складае 1 – 4 %, і, нарэшце, ганчарная – 10 – 15%.

Размеркаванне керамічнага матэрыяла па пластах выглядае наступным чынам:

Пласты	Гладкасценная		Штрыхаваная (%)	З расчосамі (%)	Ганчарная (%)
	ДДК-%	БТК-%			
	4,2	53,5	25,8	1,5	15
II	8,8	46,9	26,9	1,4	15,1
III	14,6	39,3	36,0	3,4	6,7
IV	15,9	40,7	32,6	3,53	8,0
УСЯГО:	10,9	45,1	30,3	2,71	11,2

У керамічнай калекцыі з гарадзішча толькі 1 фрагмент з ружанцовым арнаментам тшцінецкага выгляду можа паказаць на перыяд сярэдняй бронзы. Да якога часу адносяцца вышэйпамянёныя касцяныя пласціны і амулеты з іклаў і разцоў з нарэзкамі застаецца загадкай. Аналогіі касцяным пласцінам з адтулінай нам невядомыя. Неабходны радыявуглярodны аналіз для высвятлення датавання.

Аналіз матэрыялаў сведчыць пра тое, што з мяжы н.э. элементы культуры штрыхаванай керамікі на паселішчы пачынаюць дамінаваць. У матэрыялах гарадзішча можна знайсці асаблівасці, якія Я.А.Шміт назірае ў развіцці днепрадзвінскай культуры на апошнім этапе (Шмидт, 1992, с. 131 – 143), яны звязаны з уплывам зарубінецкай культуры ў Верхнім Падняпроўі. Працэс фарміравання старажытнасцей тыпу Банцараўшчыны-Тушамлі можна выявіць па некаторых дадзеных (прафіліроўка посуду, з'яўленне новых рэчаў, будаўніцтва абарончых умацаванняў і да т.п.). Наяўнасць керамікі з расчосамі і некаторых асаблівасцей у матэрыяльнай культуры, якія групуюць у апошні час у помнікі тыпу Заазер'я (Лопатин, 1991), можна, на наш погляд, разглядаць як прамежкавы этап у фарміраванні старажытнасцей 3-й чвэрці або як лякальны варыянт тушамлінскай культуры познарымскага часу.

Матэрыялам гарадзішча адпавядае пункт гледжання В.В.Сядова аб прытоку значных мас насельніцтва з арэалу правінцыйна-рымскіх культур і фарміравання новай тушамлінскай культуры як сімбіёзу мясцовых і прышлых элементаў (Седов, 1998, с. 64). У больш паўночных тэрыторыях, у тым ліку і Пскоўшчыны, гэты працэс быў спалучаны з узаемадзеяннем мясцовых традыцый днепра-дзвінскай культуры на апошняй стадыі з прынесенымі новымі элементамі прышлага насельніцтва, што і выклікала фарміраванне культуры ранніх доўгіх курганоў поўначы Беларусі і Пскоўшчыны.

Матэрыялы гарадзішча Клішына паказваюць складаную карціну этнакуль-

турных узаемаадносінаў рэгіёна, які знаходзіцца ў зоне памежжа розных археалагічных культур. Геаграфічнае становішча помніка на шляхах, што звязваюць паўночныя, заходнія і паўднёвыя тэрыторыі басейнаў Зах.Дзвіны і Дняпра, адбілася ў асаблівасцях матэрыяльнай культуры разгляданага паселішча.

Спіс скарачэнняў:

ГАЗ - Гістарычна-археалагічны зборнік. Мінск

ИАК - Императорская археологическая комиссия

МИА - Материалы и исследования по археологии СССР

РА - Российская археология

САИ - Свод археологических источников

СА - Советская археология

ABS - Acta-Baltico-Slavica. Białystok

ДДК - днепра-дзвінская культура

БТК - банцараўска-тушамлінская культура

Спіс літаратуры:

Амброз А.К., 1959. Фибулы зарубинецкой культуры. МИА, № 70. М. Амброз А.К., 1965. Раннеземледельческий культовый символ («ромб с крючками»). СА. № 3.

Археалогія Беларусі. 1999. Жалезны век і ранняе сярэднявечча. Т. 2. Раздзел3. Культура штрыхаванай керамікі (А.А.Егарэйчанка). Мінск.

Голан А., 1994. Миф и символ. М.

Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. 1987. Мінская вобласць. Кн. 1. Мінск.

Казакявичюс В., 1988. Оружие балтских племен II – VIII веков на территории Литвы. Вильнюс.

Кухаренко Ю.В., 1961. Зарубинецкая культура. САИ. Вып. Д1– 19. М.

Лопатин Н.В., 1991. Южные традиции в керамике смоленского Поднепровья и северной Белоруссии в первой половине I тысячелетия н.э. – В кн.: Археология и история Юго-Востока Руси. Курск.

Митрофанов А.Г., 1978. Железный век Средней Белоруссии. Минск.

Медведев А.М., 1996. Посоховидные булавки. ГАЗ. № 7. Мінск.

Романов Е.Р., 1903. Еще 2 клада близ древнего Лукомля. В кн.: Известия ИАК. Прибавление к вып. 6. Хроника и библиография. Вып. 4. СПб.

Рыбаков Б.А., 1994. Язычество древних славян. М.

Кузавініс К., 1970. Пра балтыйскія макратапонімы і этнонімы. Пытанні беларускай тапанімікі. Мінск.

Седов В.В., 1967. Булавки восточных балтов в эпоху раннего железа. В кн. ABS. Т 5. Białystok.

Седов В.В., 1987. Балты. Финно-угры и балты в эпоху средневековья // Археология СССР. М.

Седов В.В., 1994. Из этнической истории населения средней полосы Восточной Европы во второй половине I тысячелетия н.э. РА, № 2. М.

Седов В.В., 1998. Белорусское Подвинье и Смоленское Поднепровье в период Великого переселения народов. РА, № 2. М.

Шадыро В.И., 1985. Ранний железный век Северной Белоруссии. Минск.


Шадыро В.И., Овчинникова Р.И., 1992. О финно-угорском субстрате на севере Белоруссии (гидронимия и археология). В кн.: Археология и история Пскова и Псковской земли. Материалы семинара. Псков.

Шмидт Е.А., 1992. Племена верховьев Днепра до образования Древнерусского государства. М.


Шмидт Е.А., 1995. Вооружение и снаряжение воинов-всадников тушемлинских племен Поднепровья. ГАЗ, Мінск.

Штыхов Г. В., 1971. Археологическая карта Белоруссии. Памятники железного века и эпохи феодализма. Вып. 2. Минск.


Latvijas PSR arheologijja, 1974. Riga.




Мал. 1. План і месца-размяшчэнне гарадзішча Клішана




Мал. 2. Гарадзішча Клішана. Вырабы з крэменю (1 – 14), косткі (15 – 17)




Мал. 3. Гарадзішча Клішана. Амулеты з рэбраў (1 – 12), зубоў і разцоў (13 – 20) жывёлаў




Мал. 4. Гарадзішча Клішана. Гліняныя праселкі і грузікі




Мал. 5. Гарадзішча Клішана. Арнаментыка на кераміцы, праселках і грузіках: 1 – 7, 9 – гліна; 8 – костка



Мал. 6. Гарадзішча Клішана. Вырабы з жалеза



Мал. 7. Гарадзішча Клішана. Бронзавыя ўпрыгожанні



Мал. 8. Гарадзішча Клішана. Узоры керамічнага матэрыялу: ганчарная (1– 5), ляпная гладкасценная і штрыхаваная (6 – 23), з расчосамі (24 – 27)

ГІСТАРЫЧНЫ НАРЫС МЯСТЭЧКА БОБР

КРАЯЗНАЎСТВА

Яніна Дэмух



Мястэчка Бобр узьнікла дзякуючы вялікай гандлёвай магістралі, што праляга ла з захаду на ўсход, з волі вялікага князя літоўскага Жыгімонта Аўгуста праз намаганьні вядомага дзяржаўнага дзеяча Ераніма Аляксандра Хадкевіча. Адбылося гэта ў 1559 г.: «Чиним знаменито сим нашим листом... з ласки нашое господарское на просьбу пана... Ходкевича... на реце Бобре, в селе Забобровью, во властном кгрунте его милости место садити и в нем корчмы и торг мети ему даем», бо, маўляў, «тое де место и торг там не будеть на жадной шкоде и переказе местом и корчмам нашим, бо одаль от всих мест наших». Так і пачалася поўная слаўных і драматычных падзеяў гісторыя Бабра.

Але ў дадзеным прывілеі ясна й выразна згадваецца сяло Забаброўе, ці проста сяло Бобр, якое існавала тут задоўга напярэдадні. Сяло тое ўпершыню згадваецца ў дакумэнтах ажно пад 1516 г., калі Іван Васілевіч Красны з князёў Друцкіх завяшчае яго разам зь сёламі Сакалавічы й Нехудава сваёй жонцы. А ўжо яна, напэўна, прадала іх ці завяшчала некаму іншаму. Такім чынам, 1516 г. лічыцца часам першай згадкі Бабра ў гістарычных дакумэнтах.

НАЗВА

Назва мястэчка Бобр паходзіць ад аднайменнай ракі. Назва ж ракі паходзіць, паводле навуковай літаратуры, ад г.зв. «бабровых гоняў». Але падаецца сумнеўным, што сярод скрозь балцкіх гідронімаў (Мясрэда, Можа, Доўтар, Эса, Югна) адзіны Бобр выпадае й мае ў сваёй аснове славянскія карані. Але, відаць, яшчэ здаўна нашыя продкі-беларусы атая-самлялі балцкае «Бобр» зь беларускім «Бабёр». Сталага веку мястачкоўцы й цяпер называюць мястэчка «Бабёр», а ў крыніцах XVI ст. таксама не ўжываецца форма «Бобрскі», але «Баброўскі». Такім чынам, пытанне этымалёгіі назвы Бобр яшчэ не закрытае.

Вернемся да пачатку гісторыі Бабра й асабліва пільна засяродзім на гэтым сваю ўвагу, бо менавіта ў пачатку й можна знайсьці тлумачэньні перапэтыяў далейшага лёсу нашага мястэчка.

НАСЕЛЬНІКІ

Насялялі мястэчка, паводле згаданага ўжо прывілею, вольныя людзі, «а не отчие наши господарские, ани тож князские и панские». Вось іхныя імёны: Шчасны Лях, Іван Лукамлянін, Сьцяпан Гудзень, Ходар Гічула, Кот Яскавіч, Бадак Касьцініч ды іншыя. Сярод сьпісу ў сотню прозьвішчаў няма аніводнага, якое б сустракалася на сёньняшні дзень. Хіба толькі, можна меркаваць, Шчасны Лях даў пачатак роду Ляшковых, прозьвішча якіх вельмі распаўсюджанае сярод сучасных мястачкоўцаў. Робім

выснову, што насельніцтва было прышлым, плынным, якім застаецца й на сёньняшні дзень. Гэтая асаблівасьць паўплывала на фармаваньне мэнтальнасьці жыхароў, у прыватнасьці такіх рысаў, як прадпрыймальніцтва, непакорлівасьць, вальналюбства, задзірлівасьць, ганарлівасьць. Гэтаму спрыяў таксама й той фактар, што ў Бабры ня склалася родавай дынастыі ўладальнікаў, пераемнасьці гаспадароў, што выхоўвала ў местачкоўцаў недысцыплінаванасьць, беспакаранасьць.

ЯН ЕРАНІМ ХАДКЕВІЧ

Пасьля сьмерці Ераніма Хадкевіча ў 1561 г. Баброўскі маёнтак перайшоў у спадчыну да ягонага адзінага сына Яна Ераніма – выдатнага ваеначальніка часоў Лівонскай вайны. Ён пастаўляў са сваіх маёнтакаў 360 конных ваяроў – нямала нязнаных герояў стала на абарону Айчыны.

У 1573 г. Ян Еранім Хадкевіч аддаў у заклад адной з шасьці сваіх сясьцёр, – Крысьціне, і ейнаму мужу Станіславу Пацу – маёнтак Бобр. Зь інвэнтара тае перадачы можна даведацца, што мястэчка Бобр мела 71 дом, млын, гасьцінны дом.

ЗАКЛАДНОЕ ПРАВА

Не пашчасьціла Бабру з пастаянным гаспадарлівым уладальнікам. Аляксандар, сын Яна Ераніма Хадкевіча, пасьля сьмерці Паца перадае закладное права Ляву Сапегу, той – свайму слузе Станіславу Галінскаму, той жа – шляхцічу Крыштафу Камару. І ўрэшце, абцяжараны даўгамі маёнтак Аляксандар у 1614 г. канчаткова прадае Камару. Ізноў складзены новы інвэнтар: за 41 год насельніцтва Бабра значна вырасла, у ім знаходзілася 180 аселых мяшчанскіх двароў (пляцаў) на абодвух берагох ракі. Мост і млын з двума коламі здаваліся ў арэнду. Пад 1614 г. упершыню згадваецца Баброўская царква й сьвятар Фёдар, якому належалі пляц і валока, вольная ад усіх падаткаў. Сярод сьпісу мяшчанаў згадваюцца й былыя прозьвішчы, але шмат і новых: Арцём і Амяльян Друцкія, Ахрэм і Сьцяпан Ліцьвіны, Якаў і Амяльян Маскалі.

ЗЬБІЦЬЦЁ ГАБРЭЯ

У 1624 г. Бобр зноўку трапляе ў гістарычныя аналы. Цікава адзначыць, што нагода вельмі нагадвае сучасную – баброўскія мяшчане зьбілі й абрабавалі праежджага габрэя-гандляра з Магілева Арона Якубовіча. У 1636 г. у Бабры дык і ўвогуле быў забіты падданы суседняга сяла Шырневічы. Падаецца, што крымінальная сытуацыя не на многа з тае пары зьмянілася.

НЕВЯДОМАЯ ВАЙНА

У 1636 г. Крыштаф Камар памёр. Сьлед Бабра губляецца на некалькі дзесяцігодзьдзя. Напэўна, гэта зьвязана зь Невядомай вайной (1654 – 1667), якую разьвязала Масковія супраць Рэчы Паспалітай. Гэтая вайна з 213 дамоў, што былі ў Бабры, пакінула 95, звыш паловы насельніцтва загінула ці разьбеглася.

УЛАДАНЬНЕ САПЕГАЎ І АГІНСКІХ

Пасьля Невядомай вайны мястэчка Бобр перайшло ва ўладаньне Сапегаў, родавае гняздо якіх знаходзілася ў Чарэі. У гэты час ў Бабры дзейнічала вуніяцкая царква, знаходзіўся двор Сапегаў. Бэнэдыкт Сапега заклаў у 1700 г. Бобр Яну Лендарфу. Удава апошняга Крысьціна Абрамовіч у 1773 г. паўторна пабралася шлюбам з князем Марцыянам Міхалам Агінскім, і праз гэты шлюб Бобр перайшоў да князёў Агінскіх. У 1750 г. ён належыць старэйшаму сыну Ігнацыю. Ягонай жонкай была траюрадная сястра Алена, дачка Казіміра Дамініка Агінскага, – асоба вельмі адукаваная.

Пры Алене ды Ігнацыі Бобр пражыў пэўны ўздым. Мястэчка тады мела каля 100 двароў і было буйнейшым з усіх паселішчаў Крупсакага раёну. Агінскія заснавалі касьцёл найсьвяцейшай панны Марыі, які пачаў дзейнічаць у 1760 г. Бобр стаўся цэнтрам князёў Агінскіх. 01.01.1762 г. намаганьнямі Ігна цыя Бобр атрымаў магдэбурскае права й герб з выяваю Барыса й Глеба. Бобр быў адзіным мястэчкам у Крупскім раёне, які меў магдэбурскае права.

У 1763 г. удава Алена перапрадала маёнтак пляменьніку Міхалу Казіміру Агінскаму, будучаму гетману Вялікага Княства Літоўскага, кампазытару й заснавальніку славутагз тэатру ў Слоніме. Потым Бобр перайшоў да Ксаверыя Агінскага. Нейкі час маёнтак, абцяжараны даўгамі гетмана Міхала Казіміра Агінскага, знаходзіўся ў арэндзе Францішка Друцкага-Любецкага; на той час меў 228 дамоў.

ІНКАРПАРАЦЫЯ

У склад Расейскай імпэрыі Бобр трапіў у выніку другога падзелу Рэчы Паспалітай у 1793 г. Новая ўлада прынесла новыя парадкі. Была скасаваная царкоўная вунія, праведзеная прысяга на вернасьць расейскай імпэратрыцы й г.д. Непакорлівая шляхта, што памятала дзяржаўную незалежнасьць, вымушаная была ці цалаваць ручку Кацярыне II, ці эміграваць, ці падымацца на паўстаньні супраць акупацыйнага рэжыму. Міхал Клеафас Агінскі, аўтар славутага палянэзу «Разьвітаньне з Радзімай», стаўся уладальнікам Бабра ў 1803 г. У 1811 г. ён стварыў праект утварэньня Вялікага княства Літоўскага у складзе Расейскай імпэрыі. Праект быў адмоўлены царом. У 1823 г. Агінскі зь сям'ёй выехаў у Італію.

1812 ГОД

У Айчынную вайну 1812 г. у Бабры стаяў французскі гарнізон. Пры адступленьні ноч з 12 на 13 лістапада Напалеон правёў у Бабры. Бобр быў «сожжен... со всеми улицами. Церковью Грекоуниатскою, с мельницами, плотинами и многими в господарском дворе строениями» – пісаў у 1813 г. копыскі павятовы прадвадзіцель дваранства (маршалак).

ЦЭРКВЫ Й ЛАЎКІ

Далей мястэчка Бобр на нейкі час зноў губляецца. У 1842 г. Бобр – ва ўладаньні графа Іосіфа Міхала Тышкевіча. У гэтым жа годзе была пабудаваная новая Мікалаеўская царква замест старой вуніяцкай, абрабаванай і спаленай у час вайны 1812 г. У 1862 г. быў пабудаваны касьцёл замест драўлянага, але пасьля паўстаньня 1863 г. быў зачынены ўладамі. У 1862 г. была ўтвораная народная вучэльня.

У 1877 г. мястэчка набыў сапраўдны статны саветнік (райца) Аляксандар Фёдаравіч Барталамей, памяць аб гаспадарлівасьці якога жыве й па-сёньня. У 1885 г. заснаванае паштовае адзьдзяленьне, затым – плятформа «Бобр», у 1881 г. – валасное праўленьне, а таксама камора судовага сьледчага.

У канцы XIX ст. – пачатку XX ст. у Бабры былі 2 вадзяныя млыны, скураны завод, крупадзёрка, бровар (належалі Барталамею), млын, лячэбніца, аптэка купца Лейбы, царкоўна-прыхадзкая школка, 3 малітоўныя габрэйскія дамы, пастаялы двор, карчма, 35 гандлёвых лавак, хлебазапасны магазін, 2 вінныя лаўкі, прадпрыемства па вытворчасьці піва й садавінавых напояў Брэйгера, цагляны завод братоў Лазінскіх (1904 г. – 62 работнікі), цагляны завод братоў Пружыніных (53 работнікі). На зімовага й летняга Міколу (6 сьнежня й 19 траўня) праводзіліся кірмашы. У 1863 г. было 1113 насельнікаў, у 1880 –2239, у 1910 – 2340.



Закінутая недабудаваная паліклініка ў Бабры. Стан на 2001 г.

У ЧАСЫ БАЛЬШАВІЗМУ

Пасьля рэвалюцыйных падзеяў у Расейскай імпэрыі пачаўся новы пэрыяд. Афіцыйную вэрсію гісторыі Бабра савецкага часу можна прачытаць у афіцыйных крыніцах. Але многае змоўчана, ня вывучана – антысавецкі рух, рэпрэсіі, калябарацыянізм. Гісторыя Бабра савецкага пэрыяду яшчэ чакае свайго дасьледчыка.

Спынімся ў агульных рысах на гэтым пэрыядзе. Не найлепшыя часы надыйшлі для Бабра пасьля бальшавіцкага пераваротy ў кастрычніку 1917 г. Барталамей, напярэдадні прадаўшы лес, пасьпеў зьехаць з брычкаю золата (па расповедах местачкоўцаў) ў Парыж. На месцы ягонага маёнтку ў 20-ыя г.г. пасьля адыходу нямецкай акупацыі была ўтвораная камуна. Камунары-камбедаўцы забралі ўвесь рыштунак, гаспадарчыя пабудовы, бровар, маслабойку. Жылыя памяшканьні адыйшлі да школы. У 1928 г. быў створаны калгас «Красная ніва».

Касьцёл быў пераўтвораны ў клюб, у якім у 30-ыя г.г. пускалі кіно. Баброўскую царкву ў 1938 г. рашэньнем старшыні тагачаснага сельсавету таварыша Крывашэева й старшыні калгасу таварыша Цодзіка было загадана разабраць і прадаць на дровы ва Ўкраіну. Касьцёл жа пры наступленьні немцаў у 1941 г. згарэў. Немцы разабралі ягоныя муры й выбрукавалі дарогу ад маста да шашы. На былым месцы, дзе раней стаяў касьцёл, пасьля вайны збудавалі памяшканьне НКВД (цяпер дзіцячая бібліятэка), а на месцы пахаваньняў сьвятароў – прыбіральню (якая, дарэчы, існуе й зараз).

У 20-ыя г.г. у нашай мясцовасьці існаваў супраціў савецкай уладзе. Гэта былі ўзброеныя групы Моніча й Шпількі, аб якіх нашым сучасьнікам амаль нічога невядома. Зразумела, езьдзіў па мястэчку ў 30 г.г. і г.зв. «чорны воран». Сярод местачкоўцаў былі як ахвяры, так і «стукачы». Дзейнічаў негалосны сталінскі закон «на 10 жыхароў – адзін данасіцель». Зь ліку мноства рэпрэсаваных ахвяраў рэабілітавана толькі каля дваццаці чалавек.

ВАЙНА

Апошняя вайна не ўкладваецца ў клясычныя рамкі Айчыннай вайны, яна, пасутнасьці, зьяўлялася й грамадзянскай вайной, у якой існавалі дзьве палітычныя сілы: камуністычная й нацыянальная. Местачкоўцы апынуліся ў гэтай вайне па розных бакох, сярод іх былі й калябаранты. Пасьля выгнаньня фашыстаў нямецкая акупацыя зьмянілася савецка-расейскай. Цалкам за гады вайны загінула каля паловы насельнікаў Бабра – больш за тысячу. Ёсьць і памяць пра Галакост – магіла габрэяў каля мястэчка Бобр.

ШТО МАЕМ?

За савецкія гады некалі прыватнаўласьніцкая гаспадарка была пераўтвораная ў сацыялістычную. У 30-ыя г.г. у Бабры дзейнічала сьлесарская майстэрня «Ударнік», кавальская арцель «Мэталіст». У 1944 г. працаваў лесазавод. На сёньня ў Бабры існуюць лясьніцтва, калгас «Бобр», жывёла-гадоўчая фэрма, майстэрні, лесазавод, 4 крамы (зь іх 2 – прыватныя), бар, дрэваапрацоўчы камбінат (зачынены ў 1990 г.), [illegible]ртаза[illegible] (зачынены таксама).

Пасьля ваенныя гады ў Бабры існавалі дзіцячы дом, які згарэў у 80-ыя г.г., працуе сярэдняя школа, дзіцячы сад, летнік упраўленьня беларускай чыгункі, дзьве бібліятэкі, дом культуры, адзьдзяленьне сувязі, КБА, мэдпункт, аптэка. У 1994 г. была адбудаваная новая мураваная Мікалаеўская царква, у 2000 г. адчынілася пратэстанцкая царква.

Гэта ўсё – скупая статыстыка. А што за ёй? Хочацца парадаваць. Местачкоўцы за гады савецкай улады самаахвярна згарэлі на працы. Але так і не змаглі ані пабудаваць сабе катэджу, ані купіць аўтамабіля, ані зьезьдзіць у Парыж. Не ўдалося ім утрымаць у мястэчку й сваіх дзяцей, якія разьляцеліся па сьвеце, шукаючы лепшай долі й не жадаючы дабраахвотна браць на сябе ярмо сваіх бацькоў (3 трох тысячаў жыхароў у 1969 г. сёньня ў Бабры налічваецца толькі крыху больш за тысячу). А СССР у гэты час пускаў спадарожнікі, будаваў арматы танкаў, дапамагаў Эфіопіі, Кубе, Аўганістану, Манголіі й безьлічы іншым марыянэткавым рэжымам. Савецкая прапаганда «трубіла» пра гэтыя дасягненьні , і звычайныя людзі, якія ня мелі каляровага тэлевізара, гарачай вады, каналізацыі, прыроднага газу (якога ў Бабры няма й дагэтуль) і хадзілі па цёмных неасфальтаваных вуліцах, шчыра ганарыліся тымі ўяўнымі «дасягненьнямі». Старыя людзі Бабра настальгуюць па брэжнеўскім «застоі», разьвітым сацыялізьме, вераць у калгасы, вераць беларускай тэлевізіі. Аднак аніводнага прыгожага прыватнага 2-павярховага катэджу ў Бабры за 73 гады савецкай улады так і не зьявілася. Спытаеце, чаму? Мо, усе гультаі ды пьяніцы? Не, хутчэй, падманутыя ды ашуканыя. Старыя прадпрыемствы зачыненыя, стаяць – непрыватызаваныя. Ого, каб жа людзі не пабагацелі! А моладзь плаціць падманутаму пакаленьню бацькоў непавагай, нігілізмам, пьянствам, дэградацыяй да жабрацтвам душы.

НОВАЯ ГЕНЭРАЦЫЯ

Ды ўсё ж дэмакратызацыя ды беларусізацыя ў 1991 – 1994 г.г. дала свой плён. Зьявілася новая генэрацыя моладзі. Вось жа нехта малады, каму няма і дваццаці, павесіў 1 кастрычніка 2000 г. на коміне бароўскага бровару бел-чырвона-белы сьцяг! Заўтрашні дзень належыць нам, маладым. Тым, хто любіць сваё мястэчка, ганарыцца ягонай гісторыяй ды зьбіраецца тут жыць і працаваць. Нас мала, але мы ёсьць.



Стан на 2001 г.

Закінуты недабудаваны дзіцячы садок у Бабры.

БЕЛАРУСКІЯ АСІЛКІ З МАЛОГА ПАЛЕССЯ

КРАЯЗНАЎСТВА

Міхаіл Баравуля

Да гэтага часу на поўдні Крупскага, Барысаўскага, а таксама ў паўднёвай частцы Бярэзінскага раёнаў сярод мясцовых старажылаў бытуе мноства быляў і небылічак пра мясцовых жыхароў, якія валодалі калісьці незвычайнай сілай У памяці народнай захаваліся і імёны некатарых з іх: Ціт Баравуля з Крупскага і Барыс Агеевіч Цішкавец з Вяляціч Барысаўскага раёнаў. Згодна сцвярджэнню асноўнай часткі нашых інфарматараў, незвычайная сіла гэтым волатам была дадзена ад прыроды, і толькі некаторыя з апавядальнікаў паведамляюць, што атрымалі «мацакі» («мацак» – ад слова «моц», «моцны»), фізічную моц у час фізічнай работы. Мой дзед, Ермачонак Міхаіл Фёдаравіч (в. Лаўніца Барысаўскага раёна, 1899 г.н.), запэўніваў, што акрамя прыродных дадзеных мясцовыя жыхары мелі звычку займацца і штодзённымі спецыяльнымі трэніроўкамі.

«Старыя нават смяяліся з Барыса Агеевіча Цішкаўца, які ў маладыя гады бегаў з бервяном на плячах па лугах і балотах, прысядаў з ім, круціў яго на руках. За гэта ўсё людзі спачатку лічылі яго крыху прыдуркаватым».



Баравуля Міхаіл Адамавіч, *нарадзіўся 8.1.1951. у в. Гумны Крупскага раёну. Краязнаўца, паэт, філёляг, дырэктар СШ в.Старая Слабада, кіраўнік зьвязу скаўтаў Малога Палесься.*

Успамінаў ён і яшчэ пра нейкага пасляпоўніка асілка Б.А.Цішкаўца, які жыў у вёсцы Лаўніца. Прозвішча гэтага чалавека, на жаль, запамятаваў, але добра помню, што сваю фізічную сілу ён выкарыстоўваў вельмі арыгінальна.

«Леснікі, сцвярджаў мой дзед, не дазвалялі вазіць дровы або будаўнічы не купіўшы яго, на кані. Гэта лічылася крадзяжом. А вось калі ты на плячах прынясеш дрэва з лесу, то ніхто за гэта не штрафаваў, і крадзяжом гэта не лічылася. Дык наш лаўніцкі (называлася яго імя) пойдзе ў лес, высеча там дрэва, раскрыжуе яго і кіламетры два (да лесу было далекавата) бяжыць з ім па полі. Так ён да сенакосу і нацягаў на плячах будаўнічага лесу на лазню і стопку, да восені змог і зрубіць яе. Смяяўся ўсё з леснікоў: пакуль у іх новы закон выйдзе, я сабе і новую хату пастаўлю.»

Адносна такіх людзей у нашай мясцовасці ніколі не ўжывалі тэрмін «волат», «багатыр» ці «асілак». Багатырамі ў нас да гэтага часу называюць багатых, але толькі не фізічна моцных людзей («Багатыр знайшоўся – пяць мільёнаў паклаў на вяселлі пляменніка», «У нас багатыроў няма – усе на палучку жывуць»).

На нашу думку, да людзей, якія валодаюць рэальнай незвычайнай сілай, больш правамерным будзе ўжыванне тэрміна «сілач». У вашай мясцовасці іх нярэдка яшчэ называюць «мацакамі» .

Сілач Ціт Баравуля з вёскі Гумны (1840

– 1918).

Паданні (былі і небылічкі) пра сілу Ціта Баравулі з вёскі Гумны Крупскага раёна захаваліся да нашага часу толькі сярод яго старажылаў. Яны лічаць, што набыў Ціт сваю сілу ў працы цяжкай фізічнай у асноўным пры раскарчоўцы ляд (участкаў зямлі сярод лесу), калі прыходзілася тапаром валіць стогадовыя дрэвы, раскрыжоўваць іх, звозіць іх на кані, рыдлёўкай і тым самым карчаваць пні, зносіць і зваліць сухі. Займаўся Ціт і нарыхтоўкай вугалю для металургічнага завода ў вёсцы Чэрнеўка (Барысаўскі раён, 18 км ад Гумнаў), які ў мінулым стагоддзі належаў вялікім князям Раманавым і быў заснаваны імі ж. Даўно няма на нашай зямлі ні Ціта, ні вялікіх князёў Раманавых, ні металургічнага завода, але ў вакольцах Гумнаў да гэтага часу засталіся абкапаныя конаўкай круглыя плоскія бугры дыяметрам да 10 – 12 метраў. Гэта рэшткі збудаванняў вуглякопаў мінулага стагоддзя.

А выпальвалі вугаль, як сцвярджаюць старажылы, наступным чынам: бярвенні лісцевых парод (часцей бярозы), пабітыя на плашкі і добра падсушаныя, ставіліся стажком плашка да плашкі вышынёю да трох метраў, а пасля з усіх бакоў абкладваліся дзёрнам і абсыпаліся зямлёю, але так, каб толькі ўверсе і з чатырох бакоў заставаліся адтуліны. Знізу складня плашак падпальвалася, а дым выходзіў праз верхнюю невялічкую адтуліну. Дрэва павінна было не гарэць, а павольна тлець. Таму вуглякоп на працягу трох дзён і начэй дзяжурыў каля сваёй «домніцы» і назіраў, каб не дай Бог дзе-небудзь збоку паміж дзёрнам складні не завіўся дымок ці складня дроў не загарэлася вялікім полымем. Для гэтага на праваліны дзёрну зноў і зноў насыпалася зямля. Калі вугаль быў гатовы, дзёран і зямля акуратна здымаліся, вугаль выкапваўся з зямлі, прамываўся вадою і ў спецыяльных фурах адвозіўся ў Чэрнеўку на металургічны завод. Пры такой рабоце Ціту не было роўных: ён адной рукой у складню трохметровыя плошкі (траякі), ды так хутка, што яго таварышы па працы ўдваіх не паспявалі іх падаваць. А калі пачыналі абкладваць драўніну дзёрнам, то не па адным дзёрне цягнуў ён да складні, а па цэлым стосе.

Займаўся Ціт і пчалярствам (бортніцтвам). Расказваюць, што мог пад пахамі адразу несці дзве калоды пчол, адзін падымаў борці на таўшчэзныя сосны і елкі. Сала і мяса ён ніколі не еў падсмажаным або адварным, а толькі сырым (салёным і добра падсушаным).

Расказваюць пра Ціта Баравулю і тры легенды, якія крыху дапаўняюць партрэт гэтага вясковага сілача.

Пабіліся аб заклад. На бару ва ўрочышчы Яраш, з левага боку дарогі, да гэтага часу ляжыць горка гліны, добрых паўвоза будзе. Мой дзед Барыс гаварыў, што з'явілася гэта гліна тут вось як. Атрымалі ў Чэрнеўцы гуменскія мужчыны грошы за работу, добра выпілі і слова за слова спрачацца пачалі: хто з іх колькі цаглін-сырцу з Чэрнеўкі да Гумнаў данясе без адпачынку. Падышоў і Ціт. «Данясу штук дваццаць, – сказаў ён. – На гарнец гарэлкі б'юся на заклад».

Наклалі мужчыны Ціту на спецыяльнае прыстасаванне дваццаць штук сырых цаглін, узяў ён іх на плечы і подбегам пашыбаваў на Гумны. Ды так хутка, што яго таварышы ледзь паспявалі за ім. Беглі, кажуць, языкі высалапіўшы. Стаміліся страшэнна (гэта ж не смешкі 18 км у адзін бок), а Ціту хоць бы што: шыбуе наперадзе іх і не аглядваецца нават.

– Стой, Ціт, давай адпачнём і перакусім!

А Ціт у адказ з ухмылкай: – А вы ж сказалі, каб без адпачынку. Перахітрыць хочаце?

Засталося да Гумнаў недзе кіламет-

ры паўтары, не больш. Забеглі мужыкі з апошніх сіл наперад, разаслалі каля дарогі світку, паклалі на рушніку закуску, паставілі гарэлку.

– Кідай ты, Ціт, гэтую гліну. Выйграў, сядай з намі. Дома жонкі выпіць не дадуць спакойна.

Толькі тады паверыў ім Ціт. Паставіў ён цэглу на зямлю пад сасонку і прысеў побач. А тут і дождж пайшоў. Цэгла ўся і размякла. Так і ляжыць яна цяпер грудам гліны сярод дарогі.

Калі папярэдняя быль апавядае аб сіле і тэхніцы пераносу цяжару Ціцам (подбегам пашыбаваў да роднай вёскі), то наступная сведчыць аб тым, што ён вельмі добра валодаў тэхнікай рукапашнага бою. (З аповеду Баравулі Адама Пракопавіча, 1928 г.н., запісана ў 1970 годзе).

Чаму луг на Беразіне застаўся за гумнянамі. "Гумняне раней жылі ў Рэпішчы, што недалёка ад урочышча Лысы Бераг на Бярозе. Калі ж пачалі замест рэпы садзіць бульбу, то рашылі пераехаць на свае асноўныя землі, дзе стаялі іх гумны з ёўнямі, а сена з луга вазіць на конях дамоў, ужо ў новую вёску. Большасць жыхароў і пераехала ў цяперашнія Гумны (так пасля і назвалі вёску), а некаторыя ў Аздзяцічы, Мётчу, Ліванава і Вяляцічы. Доўгі час на сенакосы гумнян ніхто вока не клаў, але аднойчы аздзяцікія неяк сабраліся, гэтак чалавек дваццаць, і рашылі скасіць гуменскія сенакосы ўціхую. А была тады такая завядзёнка: калі адзін раз скасіў, то наступны год можла касіць смела – не спі у шапку.

Ну, косяць, значыць, яны каля Лысага Берага, аж косы свішчуць на ўсю ваколіцу.

А Ціт гуменскі неяк быў у Чэрнеўцы. Яму і падказалі яўрэі чэрнеўскія, што на гуменскіх сенакосах робіцца. Паслаў Ціт у Гумны чалавека за мужчынамі, а сам схапіў касу і на Лысы Бераг. Аздзяцікія ўбачылі, што нехта адзін нясецца на іх з касой, але спакойна так сабе ідуць у пакосе, бо што адзін чалавек можа зрабіць, думаюць, супраць такой ватагі. Калі той падбег бліжэй, то яны і пачалі акружаць яго з косамі наперавес. Тут Ціт і разышоўся: як шморгнуў касой у адзін бок, косы ў пярэдніх за колькі метраў з рук паляцелі. Ён ім кассём-кассём у плечы і да наступных – і ў тых толькі косы на сонцы заблішчэлі. Кажуць, разагнаў ён усіх аздзяціцкіх, косы іх пазбіраў, сам сеў каля будана і пачаў луг сцерагчы. І сцярог, пакуль гумняне на конях не прыехалі.

А пабітыя аздзяціцкія прыбеглі да сваёй пані і пачалі скардзіцца на Ціта. Тая выслухала сваіх і кажа: – Чыя сіла, хай той лугам і валодае! Так гуменскі луг і застаўся за гумнянамі.

Ціт Баравуля адрозніваўся ад навакольных сялян не толькі сваёй сілай, але яшчэ і тым, што не баяўся ніякіх забабонаў, мог уступіць у спрэчку нават з чараўнікамі і ведзьмарамі, заўсёды заступаўся за пакрыўджаных, бо быў вельмі справядлівы чалавек. (Запісаў Баравуля М.А. ад Ермачонка Міхаіла Фёдаравіча, 1899 г.н. в.Лаўніца Барысаўскага раёна).

Ціт і навасельскі чараўнік. У Старай Маталызе раней стаяла смалакурня, а каля яе была карчма, якую трымаў яўрэй. У нядзелю ў тыя часы ніхто не працаваў, людзі часцей за усё ездзілі ў госці, хадзілі ў царкву ці адпачывалі. Мужчыны збіраліся і ў карчме: выпіць, закусіць, пагаварыць, аб падзеях у свеце даведацца.

Аднойчы да стараматалыжскага карчмара ўнадзіўся есці і піць на дармаўшчынку адзін навасельскі чараунік (з вёскі Наваселле Бярэзінскага раёна). Прыйдзе ў карчму і з пагрозамі: – Абрамка, стаўляй на стол закуску і выпіўку, а то счарую і цябе, і тваіх дзяцей, і жонку, і скаціну.

Абрам (а яўрэй гэты чараўніцтва ой як баяўся!) і поіць, і корміць гэтага чараўніка і месяц, і другі... А той настолькі стаў нахабным, што сяброў пачаў з сабою калі-некалі прыводзіць. Паглядзеў Абрам, што і разарыцца так нядоўга.

Аднойчы ў нядзелю, ідучы ці то з Чэрнеўкі, ці то з Вяляціч, зайшоў у карчму Ціт. Абрам пасадзіў яго і расказаў пра сваю бяду. – Дзе той чараўнік? – спытаў падвыпіўшы Ціт. – Пакажы мне яго, Абрамка.

А чараўнік ужо на парозе і апрануты ва ўсё святочнае, белае і вышыванае. Садзіцца за асобны стол і кліча Абрама: – Абрамка, накрывай жа хутчэй стол, а не то счарую. – Паспрабуй счараваць лепш мяне, – гаркнуў з-за суседняга стала Ціт.

Згроб ён чараўніка ў ахапку, ускінуў сабе, як барана, на плечы і панёс да бочкі з дзёгцем. Акунуў адной рукой чараўніка ў дзёгаць разам з галавою.

Падняў над бочкай і пытае: – Ці будзеш чараваць? Навасельскі чараўнік маўчыць, Ціт яго яшчэ раз у бочку з галавою: – Ці будзеш чараваць? І так да таго часу, пакуль чараўнік не папрасіў літасці. З таго часу і чараваць забыўся, і ў карчму да Абрама – ні нагою (Запісаў Баравуля М.А. ад бацькі ў 1971г.)

Сілач Барыс Агеевіч Цішкавец з в.Вяляцічы (1890 – 1960).

У дзяцінстве нічым асаблівым, як кажуць старыя, будучы сілач не выдзяляўся. Ведаў аб яго сіле толькі бацька, але нікому сынам не хваліўся, бо баяўся, каб людзі не сурочылі. А даведаўся ён пра тое, што сын вельмі моцны, аднойчы ранняй вясной, калі яны паехалі па дровы ўтраіх на санках. Стаяла адліга, і снег ужо добра размок. Нагрузілі яны ў лесе добры воз бярэзніку і пайшлі побач з санкамі. У лагчынцы, дзе снегу за зіму намяло значна больш, і ўжо паказалася талая вада, конь і завяз. Як не натужваецца конік, а не можа выцягнуць воз. Стары Агей хацеў ужо з другім сынам скінуць крыху бярэзніку, але Барыс спыніў іх. Распрог ён каня, узяўся сам за аглоблі і выцягнуў санкі з дрывамі на ўзгорачак.

Праз нейкі час даведаліся пра сілу Барыса і вяскоўцы. А было гэта так. Летам усе хлопцы ганялі коней на начлег. І была ў Вяляцічах і навакольных вёсках такая гульня; хто хутчэй з начлегу сваіх коней дадому прыгоніць. Гэта каб пахваліцца сваімі коньмі, іх хуткасцю і ўкормленасцю. З самага лугу імчалі начлежнікі навыперадкі, хто хутчэй каго абгоніць, збіваючы ў адстаючых ездакоў шапкі. А Барыс быў па прыродзе вельмі спакойны і ціхмяны. Вось адзін з галавы яму шапку скінуў. Барыс яе падняў і далей едзе на кані. А тут і другі скінуў, і трэці... Барыс раззлаваўся. Падняў ён яшчэ раз шапку, нацягнуў яе на самыя вушы і пачаў даганяць свавольнікаў. У аднаго шапку з галавы схапіў, у другога, у трэцяга... І вырваўся на сваім коніку наперад, калі сабраў шапкі ва ўсіх начлежнікаў. Першым даскакаў на кані да вёскі, дзе на самым яе краі стаяла клець, саскочыў з каня каля яе, адной рукой падняў за вугал, паклаў усе шапкі на камень і апусціў клець на месца. Прыскакалі на конях начлежнікі, паспарабавалі падняць пабудову, каб забраць з-пад вугла свае шапкі, і колькі не тужыліся ўсім гуртам, не змаглі гэта зрабіць. Прыйшлося ім Борыка цэлы дзень улагоджваць, каб аддаў ім шапкі. Той на вачах амаль усяго свайго пасёлка (а іх ў Вяляцічах дванаццаць) і прарабіў гэта, адной рукой падняўшы будынак за вугал. Пасля з ім пачалі баяцца так жартаваць і ўсе пачалі, ад старога да малога, называць не Борыкам, а Барысам Агеевічам.

Памятаю, як расказваў мне дзед і другія мясцовыя жыхары яшчэ пра тое, што выступаў пасля Барыс Агеевіч Цішкавец як барэц і ў Беларусі, і ў Расіі, і нават у Парыжы, дзе яго і скінулі, так і не здо-

леўшы перамагчы, замежныя сілачы з другога паверха і пры гэтым моцна паламапі яму рэбры. У 20-ыя гады, у час грамадзянскай вайны і пасля яе, хадзіў ён па вёсках і выступаў у клубах, якія тады толькі пачыналі арганізоўвацца. (З аповеду Ермачонка Міхаіла Фёдаравіча, 1899 г.н., в.Лаўніца).

Расказваў мне бацька і другія нацкія старажылы, што Барыс Агеевіч Цішкавец, выступаючы ў Начах, усіх здзіўляў сваей незвычайнай сілай: завязваў у вузел металічныя цвікі, разгінаў падковы, пальцамі згінаў медныя манеты, адным ударам рукі забіваў у дрэвы цвікі, папярэдне закруціўшы іх шляпкі ў кольцы, каб не параніць пры ўдары руку. Рабіў і шмат чаго іншага. Але некалькі яго каронных нумароў, а дакладней расказаў пра іх, мне запомніліся на ўсё жыццё. Людзі на яго выступленні ішлі са сваімі лаўкамі і табурэткамі, бо мэблі ў клубе не было, ды і выступленні праходзілі на вуліцы. Вось Барыс Агеевіч неяк выйшаў на сярэдзіну пляцоўкі каля клуба, абвёў усіх прысутных вачыма і спытаў: – Хто ў вас тут самая тоўстая баба?

Паказалі яму адну такую жанчыну. Ён за грошы ўгаварыў яе сесці на табурэтку. Тая села. Пасля гэтага сілач адной рукой падняў табурэтку з жанчынай над сабой і пранёс яе па крузе. І гэта не ўсё. Не апускаючы табурэтку з жанчынай на зямлю, паставіў ён адну ножку табурэткі сабе ў зубы і яшчэ пранёс гэты больш чым стокілаграмовы груз па крузе, а пасля дзвюма рукамі прыпадняў над сабой і акуратна паставіў на зямлю.

Ці яшчэ расказвалі. Ляжаў каля клуба вялізны валун. Барыс Агеевіч зняў з шулы вароты, паклаў іх сабе на грудзі, лежачы дагары на зямлі, і загадаў мужчынам ускаціць той камень на вароты. Тыя, чалавек дзесяць ці болей іх было, з горам напалам гэта зрабілі. Барыс Агеевіч некалькі разоў выжаў вароты з валуном над сабой і адным рыўком скінуў валун на зямлю.

Або прасіў ён прынесці доўгі-доўгі металічны лом. Клаў яго сабе на плечы і прасіў як мага больш мужчын, самых моцных і важкіх, павіснуць з двух бакоў на канцах лома. Мужчыны павісалі, колькі гэта магло зрабіць. І Барыс Агеевіч дзвюмя рукамі падымаў лом з павісшымі на ім людзьмі. Пры гэтым лом заўсёды згінаўся дугой ад цяжару (З успамінаў Мікалая Філіпавіча Шастакова , былога жыхара в.Нача Крупскага раёна).

Да вайны, у час вайны і пасля яе Барыс Агеевіч працаваў загадчыкам мельніцы ў Чэрнеўцы. Я сам бачыў, як ён на другі паверх яе па сходцах насіў пад пахамі адразу чатыры мяхі зерня. Па два пад кожнай. За некалькі хвілін адной рукой ён мог нагрузіць поўную машыну мукі. Лепшага грузчыка шукаць не трэба было. Мяхі, здавалася, самі ўспрыгвалі на кузава.

Даведаліся пра сілу Барыса Агеевіча і немцы і пасля сталі вельмі паважаць яго. А было гэта так. Ехаў неяк ён на кані. А недалёка ад маста праз раку Бобр у гэты час забуксавала нямецкая грузавая машына. Немцы спынілі Барыса Агеевіча і загадалі яму распрагаць каня, каб канём выцягнуць машыну з гразі, бо самі, колькі не ўпіраліся, не змаглі гэта зрабіць. Сілач і паказвае немцам: каня распрагаць не трэба, я сам выцягну машыну. А тыя ў рогат, пальцамі каля скроні круцяць: прыдурак, значыць. Іх чалавек дванаццаць – і то не змаглі машыну выштурхнуць, а гэты адзін бярэцца. А Барыс Агеевіч падышоў да машыны ззаду, стаў да яе спіной, прыпадняў крыху кузава над зямлёй і адзін выштурхнуў яе з гразі.

А пасля вайны ён наказаў неяк аднаго хвалько – прымака, які прыстаў у прымы ў Манчы да адной жанчыны. Вядома, чалавек быў са свету, аднекуль з Сібіры, і не ведаў пра сілу Барыса Агее-

віча. Дык неяк на Троіцу сабраліся мужчыны каля мельніцы і разгаварыліся. Сібірак (а быў ён высокі шыракаплечы) і вырашыў выпіць на задарма, і таму пачаў падбухторваць памерацца сілаю А ў гэты час з мельніцы выйшаў Барыс Агеевіч. Адзін з пашых лаўніцкіх, таксама не зломак, і скажы сібіраку: – А ты лепш вунь з тым мужчынам пазмагайся!

А Барыс Агеевіч быў невысокага росту, хоць і каржакаваты, крэпкі, як смаг[illegible]. Уся сіла яго была ў руках і мускулах.

Сібірак і заве яго да сабе: «Давай падужаемся. Хто на лапаткі ляжа, той і гарэлку ставіць!»

Падышоў Барыс Агеевіч, нахіліўся над сібіраком і павольна так правёў яму адным толькі пальцам па рэбрах. Мы думалі, што побач нямецкі кулямёт запрацаваў – так громка затрамцелі рэбры. Сібірак счырваневў увесь, як рак, ды ў кусты кінуўся, а мы ў рогат!

У апошнія гады жыцця Барыс Агеевіч жыў у вёсцы Мётча Барысаўскага раёна, працаваў на мельніцы. У Мётчы ён памёр. Быў у яго сын, таксама моцны, але ўжо не такі, як бацька (З успамінаў Ермачонка Сяргея Міхайлавіча, в. Лаўніца).

БАРЫСАЎСКІЯ КУРАПАТЫ

КРАЯЗНАЎСТВА

Нікіпар Баркоўскі

Амаль ўсім жыхарам горада Барысава вядомы знакамітыя "чычагаўскія" батарэі, ці проста "батарэі", што разьмешчаны на правым беразе ракі Беразіна побач з гарадзкім краязнаўчым музэем. Названы яны так у памяць падзей 1812 года й зьвязаны з імем рускага адмірала Чычагава, што перасьледаваў французскую армію Напалеона пад час адступленьня. Фактычна "батарэі" – гэта умацаваньне гарадзкога прадмесьця (плошча 1700 кв.м.) зь вялікімі абарончымі валамі й глыбокімі акопамі, парослымі цяпер рэдкім хваёвым лесам. Але ж мала хто з барысаўцаў ведае, што за савецкім часам бальшавікі пераўтварылі іх у месца масавых растрэлаў жыхароў Барысаўшчыны й Крупшчыны. Па сьведчаньні нашага вядомага гісторыка Юркі Віцьбіча тут растраляна каля 1200 чалавек!

Пачалося ўсё у далёкім 1919 годзе, калі ў сувязі з актывізацыяй дзеяньняў на польскім фронце Менск прыслаў у барысаўскі ваенкамат (якім кіраваў латыш Бенгер) загад аб прызыве ў чырвоную армію мужчын узросту ад 20 да 30 год. Гэты, колькасна вялікі, прызыў барысаўскія ўлады застаў абсалютна не падрыхтаванымі, – мясцовыя начальнікі не мелі нават мабілізацыйнага пляну. Для харчаваньня на перасыльным пункце мелася толькі дзесяць пудоў аўса. Памяшканьні, г.зв. баракі, былі халодныя й зусім непадрыхтаваныя нават для часовага пражываньня. Акрамя холаду, яшчэ мучыў і голад. Тыя крохі, што мабілізаваныя ўзялі з дому, абдзяліўшы галодныя сем'і, скончыліся празь дзень-два. Адпаведна ж загаду ваенкама на кожны дзень выклікаліся па дзьве воласьці з павету. Людзі прыбывалі сотнямі…

Каб выправіць крытычнае становішча, харчкамісар г. Барысава, таварыш Баршай арганізаваў дзьве экспэдыцыі. Адна зь іх рэквізавала па горадзе пасьцелі, коўдры, падушкі, сталы, крэслы для навабранцаў. Другая ў вёсках павету, адкуль толькі што прыбылі прызыўнікі, адабрала ў іхных бацькоў, братоў, жанок і дзяцей апошнія мізэрныя рэшткі хлеба й пакінула іх на галодную сьмерць. Калі чуткі пра гэтыя акцыі ўладаў дайшлі да перасыльнага пункту, абурэньню мабілізаваных не было канца. Яны адразу ж пакінулі баракі й накіраваліся да будынку харчкаму.

У нядзелю, 16 сакавіка, Барысаў быў уражаны паходам тысячаў мабілізаваных у цэнтр гораду, дзе знаходзіліся дзяржаўныя ўстановы. Але ўсе адказныя камуністы раёну разьбегліся, толькі ваенны камісар Бенгер накіраваў каравульны батальён супраць паўстанцаў, аднак той адразу перайшоў на іхны бок. Пасьля гэтага й Бенгер на пэўны час зьнік, а мабілізаваныя й чырвонаармейцы батальёну, разагнаўшы такім чынам усе савецкія ўстановы, разышліся па сваіх вёсках і дамох, адмовіўшыся абараняць савецкую ўладу.

На заўтра было арыштавана некалькі сотняў жыхароў горада, якіх западозрылі ва ўдзеле ў паўстаньні, або ў спачуваньні яму. Больш за 100 чалавек, па загаду

камісара Бенгера, было растраляна ў хваёвым лясочку "батарэі". На сяньня мы ведаем прозьвішчы толькі трох удзельнікаў-кіраўнікоў гэтага паўстаньня, атрымаўшага ў тагачаснай савецкай прэсе назву "Барысаўскі пагром чорнай сотні". 23 сакавіка ў 12 гадзін ночы, па прыгавору ваенна-палявога суда на "батарэях" былі растраляны: Апанас Вусікаў, Казімір Палітыка і Пінчук (імя не названа)...

1923 год – скончыліся войны, на Беларусі савецкая ўлада. Але лічыць мірным той час не выпадае. Фактычна працягвалася грамадзянская вайна, але партызанскімі мэтадамі. У пачатку кастрычніка 1923г., першыя старонкі вядучых заходнеэўрапэйскіх газэт падавалі сэнсацыйную навіну з СССР: на чыгунцы пад Крупкамі быў прыпынены й абрабаваны хуткі цягнік №1, у якім ехалі прадстаўнікі замежных дыпляматычных місій і вядомыя савецкія дыпляматы. Акцыю зьдзейсьніў партызанскі атрад, якім кіраваў шырока вядомы Юрка Моніч.



Што нам вядома аб ім? Нарадзіўся знакаміты беларускі атаман у вёсцы Вялікія Жаберычы Барысаўскага павету (зараз Крупскі р-н) у 80-х гадох XIX стагодзя. Скончыў настаўніцкую сэмінарыю, працаваў вясковым настаўнікам. З пачаткам І-й Сусьветнай вайны Моніч прызваны ў войска, атрымаў афіцэрскі чын. У Грамадзянскую служыў у барона Ўрангеля, далей... У газэце "Беларусь" ад 3 сьнежня 1919г. чытаем: "...Начальнік штаба беларускага партызанскага адзьдзела падпаручнік Г. Моніч зьвярнуўся да БВК (Беларуская Вайсковая Камісія) з паведамленьнем, што ён хоча перайсьці пад загад Беларускага ваеннага камандаваньня для змаганьня з бальшавікамі й вызваленьня з-пад іхняга гнёту рэшты Беларусі..." Таксама вядома, што атрад Моніча зьяўляўся падразьдзяленьнем тайнай палітычнай арганізацыі "Беларуская сялянская партыя "Зялёны дуб", якая дзейнічала на Беларусі з 1920 па 1932 г.

Зразумела, што НКУС абрынуў на Крупшчыну ўсю сваю моц. Карныя атрады шукалі Моніча, але безвынікова, паймалі толькі памочніка атамана Мавідовіча. Напрыканцы зімы 1923 года барысаўская гарадзкая міліцыя загадала жыхарам шэрагу вуліц, што вялі ад ускраіны гораду да турмы, не выходзіць са сваіх дамоў і зачыніць усе вокны й брамы. Празь некаторы час па гэтых вуліцах пад канвоем прайшоў тысячны сялянскі натоўп. Тут былі поўнасьцю ўсе жыхары роднае вёскі Моніча Вялікія Жаберычы, вёскі Кругліца і разам са сваёй вёскай Пярэсіка йшоў схоплены, акрываўлены Мавідовіч. Таксама тут йшлі сяляне з васьмі найбліжэйшых да Крупак вёсак. У Барысаве адбыўся хуткі пралетарскі суд: надзвычайная тройка ЧК судзіла партызан і сялян, як саўдзельнікаў партызанаў. 22 чалавекі атрымалі растрэл, гэта – Д.Асінскі, Ф.Філіпёнак, П.Корнышаў, Г.Загалавец, С.Сабалеўскі й Сьпір.Сабалеўскі, Г.Сабалеўскі, С.Ліпчэнка, Г.Каструкоў, І.Іваноў, А.Аляхновіч, А.Казак, І.Бібін, Г.Буйвідовіч,

Ф.Наўроцкая, С.Ткачэнка, А.Хаецкі й Р.Хаецкі, І.Прыгажонак, Е.Палякова й Т.Палякова, Е.Іванова; васьмярых прыгаварылі да 10 год, 23 – да трох год, 1 – да 6 год, 2 – да 5 год і 1 – да 8 год турмы. Акрамя гэтага, па сьведчаньні Юркі Віцьбіча: "...штоночы на "батарэі", ужо палітай крывёю паўстанцаў, прыводзілі на растрэл групы сялян. Усяго было растраляна каля 300 чалавек".

...Пра Барысаўскі галодны бунт пачатку 30-х гадоў ужо распавядалі сучасныя рэспубліканскія газэты, але праўды ніколі не бывае зашмат. З пачаткам калектывізацыі зьнік хлеб і ў гарадах Беларусі (як і ў СССР), была ўведзена карткавая сістэма. Усё насельніцтва з 1928 па 1933г. пры атрыманьні харчовых нормаў было падзелена на наступныя катэгорыі:

1-я катэгорыя. Камуністы, што ачольвалі партыйныя, савецкія й прафсаюзныя ўстановы (гэтак званыя адказныя работнікі). Работнікі цяжкай фізычнай працы, як кавалі, качагары, пільшчыкі, грабары й г.д. Яны атрымлівалі 1 кг. хлеба на дзень.

2-я катэгорыя. Работнікі менш цяжкай працы – 500 г. хлеба.

3-я катэгорыя. Работнікі на лёгкай рабоце – 300 г. хлеба.

4-я катэгорыя. Службоўцы й дарослыя ўтрыманцы асобаў усіх катэгорыяў – 150 г. хлеба.

5-я катэгорыя. Дзеці – 100 г. хлеба.

Барысаў – горад лёгкай індустрыі. З гэтае прычыны балышыня ягоных жыхароў атрымлівала ад 300 да 500 г. хлеба на дзень.

У канцы красавіка 1933г. у Барысаве была атрымана непасрэдна з Масквы, мінаючы сталічны Менск, дырэктыва аб зьніжэньні харчовых нормаў. Паводле яе:

1-я катэгорыя мелася атрымаць па 500 г. хлеба;

2-я катэгорыя – па 300 г. хлеба на дзень;

3-я катэгорыя – па 150 г. хлеба на дзень;

4-я катэгорыя – па 100 г. хлеба на дзень.

Дарослым утрыманцам і дзецям у хлебе было зусім адмоўлена.

На камуністаў гэтае афіцыйнае зьніжэньне нормаў па сутнасьці, не пашыралася. Кожнага зь іх цалкам забясьпечваў распаўсюджаны ў савецкай рэчаіснасьці "блат" г.зн. забесьпячэньне з чорнага ходу падуладных ім складаў і крамаў. У бухгалтарскіх справаздачах "блат" менаваўся як "усушка", "выцек", "раструшчваньне", "недапёк" і г.д. Затое ўсё астатняе насельніцтва было асуджана на галодную сьмерць.

І вось 3 траўня 1933г. галодныя жанчыны, дзеці выйшлі раніцай на вуліцы Барысава й накіраваліся да дзяржаўных установаў з патрабаваньнем хлеба. Па дарозе яны ўбачылі падводы з хлебам, што перавозілі яго з тутэйшых складаў да чыгуначнай станцыі для вывазу. Абураны галодны натоўп затрымаў гэтыя падводы й разабраў той хлеб. Аднак яго было мала, каб накарміць усіх галодных. Тады а 2-3 гадзіне апоўдні натоўпы, што па-ранейшаму складаліся пераважна з жанчынаў й дзяцей, пачалі разбураць харчовыя крамы. Тутэйшы конны атрад НКУС і міліцыі пачаў разганяць людзей, топчучы жанчын і дзяцей коньмі, аднак безпасьпяхова. Адзін зь міліцыянтаў, што стрымлівалі націск галодных на харчовую краму, нечакана закрычаў: – Жанчыны! Маткі! Жонкі! Сёстры! Навошта вы гэтак мардуецеся і без усялякай карысьці калечыце сябе й дзяцей! Ідзіце да сваіх дамоў. Ідзіце да фабрыкаў й цягніце сваіх мужоў, сыноў ды братоў. Няхай яны бароняць вас. Тады хутчэй будзе толк.

Заклік міліцыянта пачулі. Работнікі самай вялікай у Барысаве запалкавай фабрыкі "Беразіна" нечакана спынілі

працу й патрабавалі ад адміністрацыі павялічэньня хлебных нормаў. Пачалося ні што іншае, як забароненая й неўласьцівая для савецкіх умоў забастоўка. Парторг фабрыкі, адказваючы на патрабаваньні рабочых, з трыбуны крычаў:

– Таварышы! З кім змагаецеся? Самі з сабою? Са сваёй работніцка-сялянскай уладай! Вярніцеся назад! Вярніцеся да сваіх асірацелых машынаў, на якіх вы куяце сусветную пралетарскую рэвалюцыю. Калі раней мы недаядалі на работах ужуям, дык цяпер мы галадаем на страх ім. Кожнае зярнятка хлеба ёсьць удар па капіталістычных акулах.

Са словамі "цецярук", "болбат", "талалай" абураныя работнікі схапілі парторга й пацягнулі на раку Беразіну тапіць, але пашкадавалі й толькі кінулі ў ваду. Між тым жанчыны, да якіх цяпер далучыліся й мужчыны, павярнулі ад крамаў да тутэйшых партыйных устаноў й будынку НКУС. Сакратар Барысаўскага райкому КП(б)Б зьвярнуўся да галодных людзей з ушчувальнай прамовай, якая нагадвала прамову парторга з фабрыкі "Беразіна". Аднак калі парторга толькі напалохалі, дык сакратара зьбілі на горкі яблык. Убачыўшы гэта, усе астатнія партыйныя й савецкія службоўцы пахаваліся хто куды. Толькі энкавэдысты зь вінтоўкамі густым частаколам акружылі будынак НКУС. Натоўп абураных, галодных людзей напіраў, ужо пачуліся стрэлы ў паветра... Хісткае становішча выратаваў начальнік НКУС. Ён выйшаў на балкон зь нейкай паперкай у руцэ й сказаў, што кагадзе атрымаў тэлеграму з Масквы, якая дазваляе захаваць старыя харчовыя нормы. Задаволены натоўп пачаў паступова меншаць, шмат хто радаваўся перамозе...

Уначы барысаўскія энкавэдысты разам зь менскімі, прыбыўшымі на дапамогу, арыштавалі 1400 (!) барысаўцаў. Фабрыка "Беразіна" ў сувязі з арыштам работнікаў часова спынілася. Празь некалькі дзён прыехала надзвычайная сэсія рэўтрыбуналу БССР й пачала судзіць арыштаваных. 1200 чалавек былі сасланы на тэрмін ад 8 да 10 год у сібірскія лягеры, бяз права ліставаньня (!), 200 барысаўцаў былі растраляныя на сумнавядомых "батарэях"...

Паміж імі быў барысаўскі дарэвалюцыйны галава Паўлоўскі, ксёнз-дэкан тутэйшага касьцёлу Марызевіч, два міліцыянты, работнікі "Беразіны" й іншых барысаўскіх фабрыкаў. Аднак пераважную бальшыню складалі жанчыны, дзяўчаты й амаль дзеці. Яны прасілі свайго роднага беларускага хлеба...

Выкарыстаная літаратура:

Юрка Віцьбіч. Антыбальшавіцкія паўстаньні й партызанская барацьба на Беларусі. Нью-Ёрк. 1996.

Анна Касинская, Сергей Крапивин. Ограбление поезда №2, "Народная газета" 27-29 верасьня 1997 г. ст.12-13.

Газэта "Звезда", №№ 402,407; сакавік 1919 г.

Газэта "Звезда", №53, сакавік 1924 г.

ЗАБЫВАЦЬ НЕЛЬГА
(У раённую кнігу "Памяць")

КРАЯЗНАЎСТВА

Андрэй Аляхновіч

Гэты артыкул ужо больш года ляжыць у рэдакцыі раённай газэты: "Крупскі веснік". І, відаць па ўсяму, ня будзе надрукаваны. Часы зьмяніліся... Але ж гісторыя – гэта перш за ўсё праўда! Таму мы зьмяшчаем гэты матэрыял так, як ён быў падрыхтаваны для публікацыі у газэту.

Напрыканцы студзеня 2002г. у Літаратурным музеі імя Янкі Купалы ў Менску адбылася прэзентацыя першай кнігі серыі "Беларускі індэкс рэпрэсаваных". Аўтарам зьяўляецца гісторык Ігар Кузьняцоў, вядомы нам па кнізе "Канвеер смерці . Дакумэнты . Сьведчаньні . Успаміны . " (чытай раёнку ад 14 сакавіка 1998 г. стар.2). Новая праца навукоўца называецца " Індэкс уражэнцаў Беларусі, рэпрэсаваных у 1920 – 1950 гады ў Заходняй Сібіры ". У ёй утрымліваюцца пайменны сьпіс і кароткія зьвесткі пра 1261 ураджэнца Беларусі, зьнішчанага сталінскім рэжымам на тэрыторыі цяперашніх Новасібірскай і Томскай абласьцей Расейскай Фэдэрацыі, а таксама вытрымкі з дакумэнтаў тых гадоў .

Прачытаўшы кнігу , яшчэ раз пераконваешся, што пэрыяд ленінска - сталінскіх рэпрэсіяў у СССР патрабуе ня толькі глыбокага вывучэньня, але і шырокай грамадзкай дыскусіі аб камуністычным генацыдзе ў Беларусі. Не зрабіўшы гэтага мы асуджаны зноў і зноў наступаць на адныя ж і тыя граблі , -- гісторыя паўтараецца...

Вядома ж, нас зацікавіў разьдзел кнігі, дзе прыведзены сьпіс рэпрэсаваных. Там мы адшукалі прозьвішчы нашых землякоў . Нарадзіліся яны , задоўга да 1917 года, калі яшчэ не было Крупскага раёну, а нашы землі дзялілі між сабой Барысаўскі павет Менскай губэрні і Сеньненскі павет Магілёўскай губэрні. А нашы Крупкі ў той час лічыліся мястэчкам Бобрскай воласьці Сеньненскага павету.

Мы падаем тут ня толькі прозьвішчы нашых землякоў, але й жыхароў суседніх рэгіёнаў, якія маюць прозьвішчы, што вельмі часта сустракаюцца на Крупшчыне .

Старонка 38. Амяльянчык Марк Міхайлавіч, 1884 г., нарадзіўся ў вёс. Баркі Менскай губ., пражываў у г.Томску, загадчык кніжнай крамы. Арыштаваны ў 1937 г . Растраляны.

Стар . 46 . Белікаў Аўрам Ігнацьевіч, 1897 г., нарадзіўся ў вёс. Гапонаўка (Гапончы ці Гапоны Сеньненскага павету) Магілёўскай губ., пражываў у пасёлку Слабадзінка Зыранскага раёну ЗСК, член калгасу "Пуць Сталіна". Арышта-



Аляхновіч Андрэй Пятровіч, *нарадзіўся 8.4.1963. у м. Халапенічы Крупскага раёну. Краязнавец, педагог, куратар харугвы скаўтаў Малога Палесься.*

ваны ў 1937 г . Асуджаны на 10 год пазбаўленьня волі і 5 год паражэньня ў правох.

Стар . 47. Белякоў Павал Ігнацьевіч, 1894 г., нарадзіўся ў вёс. Гапонаўка (Гапонічы ці Гапоны Сеньненскага павету) Магілёўскай губ., пражываў у вёс. Паўлаўка Зыранскага раёна ЗСК, аднаасобнік. Арыштаваны ў 1937 г. Растраляны.

Стар . 61. Галуза Сямён Андрэевіч, 1877 г., нарадзіўся ў вёс. Арэшкавічы Барысаўскага павету (Менскай губ.), пражываў у вёс. Нікольская Крывашэінскага раёну, аднаасобнік. Арыштаваны ў 1938 г. Растраляны.

Стар. 72. Дэнгер Генрых Аўгуставіч, 1889 г., нарадзіўся ў вёс.Чарняўка Магілёўскай губ., пражываў у г.Томску, начальнік сэктара збыту трэста "Томлес ". Арыштаваны ў 1937 г. Асуджаны на 10 год пазбаўленьня волі і 5 год паражэньня ў правох .

Стар. 93. Каранькоў Павал Іванавіч, 1907 г., нарадзіўся ў вёс.Высокае Магілёўскай губ., пражываў у пасёлку Барзуноўка Кажэўнікаўскага раёну, не працаваў. Арыштаваны ў 1937 г. Растраляны.

Стар. 93. Каранькоў Фёдар Іванавіч, 1899 г., нарадзіўся ў вёс.Высокае Магілёўскай губ., пражываў у вёс.Рамашоўка Кажэўнікаўскага раёну, аднаасобнік. Арыштаваны ў 1938 г. Растраляны.

Стар. 100. Кульля Вольга Фёдараўна, 1902 г., нарадзілася ў вёс.Шчаўры Магілёўскай губ., пражывала ў вёс. Лебацер Чаінскага раёну, не працавала. Асуджаная на 10 год пазбаўленьня волі і 5 год паражэньня ў правох .

Стар. 117. Міхневіч Кірыл Ігнацьевіч, 1883 г., нарадзіўся ў вёс. Слабада Барысаўскага павету Мінскай губ., пражываў у пасёлку Новы Труд Цегульдзецкага раёну, член калгаса «18-ы Кастрычнік». Арыштаваны ў 1938 г. Растраляны.

Стар. 148. Старадубцаў Іван Васільевіч, 1882 г., нарадзіўся ў вёс.Казубец Барысаўскага павету Мінскай губ., пражываў у вёс.Ваўкадаеўка Кажэўнікаўскага раёну, аднаасобнік. Арыштаваны ў 1938 г. Растраляны.

Стар. 152. Тайнікаў Дарафей Гаўрылавіч, 1869 г., нарадзіўся ў вёс.Калодніца Магілёўскай губ., пражываў у пас. Камень Каўпашэўскага р-ну, аднаасобнік. Арыштаваны ў 1938 г. Асуджаны на 5 год пазбаўленьня волі і 3 гады паражэньня ў правох.

Стар.166. Юнко Трафім Мацьвеевіч, 1879 г., нар. у вёс.Стары Сакол Барысаўскага пав., пражываў у пас.Каменны Каргасокскага р-ну, член нестатутнай сельгасарцелі «Гігант». Арыштаваны ў 1937 г. Растраляны.

ГУЛЬНІ МАЙГО ДЗЯЦІНСТВА

КРАЯЗНАЎСТВА

Пятро Аляхновіч




Аляхновіч Пятро Нікіпаравіч, нарадзіўся 10.8.1930. у м. Халапенічы Крупскага раёну. Краязнаўца, апантаны садавод, пчаляр і пэдагог. У мінулым выдатны спартоўца, трэнэр, дырэктар Крупскай дзіцяча-юнацкай спартовай школы ў 1966-1984 г.г.

І. «ХОВАНКІ»

Па жэрабю выбіралі «вядучага» і «капітана» (колькасць ўдзельнікаў гульні была неабмежаваная). Вядучага ставілі ў кут і завязвалі вочы. Гульня праводзілася на вуліцы, у хмызняку, зімою магла праводзіцца і ў памяшканні. Усе хто гуляў, разбягаліся ў розныя бакі хавацца. «Капітан» хаваўся апошнім і голасна крычаў: «Ужо», г.зн. «вядучаму» можна было ісці шукаць. Той, каго знаходзілі першым, станавіўся «вядучым». Так павінны былі быць знойдзены ўсе ўдзельнікі гульні. Па ўмовах гульні ніхто не мог выкрыкваць і падказваць месца сховішча астатніх. Хто парушаў гэта правіла, станавіўся «вядучым». Бывала і так, што гульня доўжылася шмат часу. Калі былі знойдзены ўсе, то «капітан» збіраў іх у гурт, новому «вядучаму» завязвалі вочы і гульня працягвалася ў некалькі этапаў. Перамагаў вядучы, які хутчэй за іншых знаходзіў усіх, хто ўдзельнічаў у гульні.

ІІ. «ЯМАЧКІ»

На роўнай пляцоўцы з мяккім грунтам (глебай), у адзін радок (лінію) рабілася столькі ямачак, колькі было ўдзельнікаў гульні – мінус адна ямачка. Кожны, хто гуляў, выкалупваў невялікай вострай палачкай сабе ямачку, потым пяткай босай нагі кружыў у ямачцы, пакуль яна не станавілася гладкай. Па жэрабю выбіраўся «вядучы». Калі ўсё было зроблена, кожны ўдзельнік гульні станавіўся тварам да сваёй ямачкі на адлегласці аднаго кроку ад усіх ямачак. Па ўмовах гульні палова ўдзельнікаў павінна была размяшчацца з аднаго боку, палова – з другога боку ад лініі ямачак. Па камандзе «Пачынай» вядучы павінен быў пакаціць невялічкі гумавы, лаптавы мячык уздоўж усіх ямачак па самым краі. Мяч павінен быў уваліцца ў чыю-небудзь ямачку. Як толькі гэта здаралася той, у



чыю ямачку трапіў мяч, павінен быў хутка схапіць яго з ямачкі і кінуць у любога ўдзельніка гульні, каб яго «асаліць» – папасці. Усе ж у гэты момант павінны былі разбягацца ў розныя бакі, у тым ліку і «вядучы».

Той, каго «асалілі», станавіўся «вядучым». Калі ж удзельнік з мячом прамахнуўся, то ён зноў станавіўся «вядучым».

Другі варыянт. Па ўмовах гульні выбіралася два «вядучых», якія станавіліся тварам насупраць адзін аднаго. Гэта рабілася дзеля таго, каб каціць мяч паўз паміж ямачак хутчэй і некалькі разоў, каб збіць з панталыку гуляючых і прытупіць іх руплівасць. Гэты варыянт прыдаваў гульні больш азарту.

Удзельнік гульні, якога «асалілі», станавіўся «вядучым», а «вядучы» займаў яго ямачку.

Гульня без пераможцы. Прыярытэтам валодаў той, хто зусім не быў «асаленым» і «вядучым». Звычайна гэта вяртлявы хлопчык альбо дзяўчынка, якія ў канцы гульні маглі сказаць: «А ў мяне ні разу не папалі!»

III. «ЦУРКА»

На роўнай пляцоўцы альбо на вясковай вуліцы маляваўся квадрат, прыкладна 80 х 80 см, «Цурка» – гэта чатырохгранная палачка, выструганая з цвёрдага дрэва, даўжынёй 12 – 18 см і шырынёй кожнай грані 2 – 3 см з завостранымі краямі, і на кожнай грані нажом вырэзваліся рымскія лічбы I, II, III, IV. Невялічкая дошчачка даўжынёй каля 60 – 70 см называлася «лоптачка», з аднаго канца якой рабілася ручка, што абстругвалася нажом, каб спрытней трымаць «лоптачку». Лоптачкай наносіліся ўдары па «цурцы».


Умовы гульні. Гулялі ўдваіх. Па жэрабю адзін з удзельнікаў пачынаў гульню. Браў у руку «лоптачку», клаў «цурку» у сярэдзіну квадрата па дыяганалі, удараў «лоптачкай» па заструганым канцы «лоптачкі» так, каб «цурка» падскочыла ўгару, і ў паветры спяшаўся выканаць па ёй яшчэ адзін удар. «Цурка» адлятала ў «поле» на адпаведную далечыню ад квадрата і падала на зямлю. Удзельнік гульні падыходзіў, глядзеў на лічбу на паверхні «цуркі» і наносіў яшчэ столькі ўдараў, колькі было напісана на яе баку (напрыклад, III), адбіваючы як мага далей ад квадрата. Пасля гэтага другі павінен быў узяць «цурку» у адну руку і кінуць з усяго размаху ў бок квадрата, стараючыся папасці ў яго. Калі гэта здаралася, то «лоптачка» пераходзіла да яго і ўдзельнікі гульні мяняліся ролямі. Калі «цурка» ў квадрат не трапляла, то патрэбна было наносіць удары па «цурцы», зноў адбіваючы як мага далей ад квадрата столькі разоў, колькі лічба паказвала на паверхні «цуркі» пасля яе кідання ў квадрат.

Так гульня працягвалася да таго часу, пакуль не вызначаўся спрытнейшы, які валодаў «цуркай» большы тэрмін.

Другі варыянт. У некаторых выпадках пры дамоўленасці абодвух удзельнікаў вакол квадрата на адлегласці 3 – 4 крокі праводзілася лінія і рабілася кола дыяметрам 3 – 4 метры. У такі квадрат лягчэй было закінуць «цурку».

IV. ЛАПТА (РУСКАЯ)

Гульня праводзілася на роўнай пляцоўцы памерамі 10 – 15 м х 30 – 50 м, каб паблізу не было высокіх дрэў, плотаў, канаў і вялікіх камянёў, наогул ніякіх перашкод Умовы гульні. Гуляюць дзве каманды, кожная можа мець ад 3 да 10 і больш удзельнікаў. Кожная каманда выбірае капітана. Па жэрабю адна каманда атрымлівала права «нападаць» і пачынала гульню, другая «абараняцца» – ішла ў «поле». Капітан каманды «абаронцаў» падкідваў угару мяч, а тыя, хто «нападаў» па чарзе выконвалі ўдары па мячы, адбіваючы яго ў «поле». Апошнія шыхтаваліся на лініі нападзення і раз-



мяшчаліся ў адну калону тварам да таго, хто падаваў мяч. Капітан станавіўся ў канцы калоны. Гэта звычайна самы лепшы ў камандзе ігрок. Першы з ігракоў бярэ ў руку «лоптачку», становіцца тварам да падаючага мяч. Падаючы падкідвае ўгару вышэй галавы мяч. Нападаючы павінен зрабіць у гэты момант замах і выканаць удар па мячы. Калі ўдар па мячы адбыўся і мяч паляцеў у «поле», нападаючы павінен кінуць на зямлю «лоптачку» і як мага хутчэй пабегчы да лініі «выратавання» ў поле, дакрануцца або наступіць на лінію і прыбегчы назад на лінію кону. Удзельнікі гульні, якія абараняюцца, ловяць у полі мяч і стараюцца ім «асаліць» нападаючага, а калі гэта ім удасца, то нападаючая каманда прайграла і павінна ісці ў «поле», а «абаронцы» павінны нападаць. Калі ж гэты нападаючы «выратаваўся», г.зн. прыбег на лінію кону і яго не «асалілі», то ён зноў мае права выконваць удар па мячы пасля таго, як гэта зробяць усе ўдзельнікі з яго каманды.

Ігракі нападаючай каманды працягваюць выконваць па чарзе ўдары па мячы і «выратоўваюцца».

Калі ж выконваючы ўдар прамахнуўся, то ён павінен перадаць «лоптачку» наступнаму ўдзельніку гульні, а сам стаць за апошнім у калоне і чакаць, пакуль яго хто-небудзь не «выручыць». Калі ж усе ўдзельнікі нападаючай каманды прамахнуцца і не «выручацца», то ігрок, які прамахнуўся апошнім, і той, хто падае мяч ідуць на лінію «выратавання» «на гранаткі». Яны становяцца тварам адзін да аднаго на адлегласці тры крокі, ігрок з мячом пачынае падкідваць угару вышэй галавы мяч і лавіць яго. Нападаючы павінен як мага хутчэй ірвануць і пабегчы да кону, як толькі палічыць гэта мэтазгодным. Ігрок з мячом павінен дагнаць яго і «асаліць» мячом, а сам хутчэй дабегчы да лініі кону. Калі гэта ўдасца, то нападаючая каманда прайграла і павінна ісці ў «поле», а каманда, якая абаранялася, павінна ісці нападаць. Калі ж ігрок з мячом не «асаліў» нападаючага, то гульня працягваецца і ўсе ўдзельнікі нападаючай каманды маюць права выконваць удары па мячы ў ранейшым парадку. Нападаючая каманда можа прайграць «падачу» і ў тым выпадку, калі ігрок-абаронца ў «полі» зловіць мяч (свячу) у паветры, калі гэты мяч не дакрануўся да паверхні зямлі. Выйграе тая каманда, якая больш нападала.

V. ЛАПТА «ФРАНЦУЗСКАЯ», ЦІ, ЯК МЫ ЯЕ НАЗЫВАЛІ, «ХАЛОПЕНІЦКАЯ»

Умовы гульні. Колькасць удзельнікаў не абмяжоўвалася, але не менш трох. Інвентар: гумавы малы мяч і «лоптачка». Пляцоўка памерамі як і ў «рускай» лапце. На пляцоўцы на адлегласці 8 – 10 м ад лініі кону праводзіцца паралельна ёй лінія лоўлі мяча.

Па жэрабю вызначаюцца ігрок, які першым будзе выконваць удар па мячы, ігрок, які будзе падкідваць яму мяч, астатнія знаходзяцца ў «полі» і размяшчаюцца строга па парадку, пачынаючы ад лініі лоўлі мяча.

Ігрок, які выконвае ўдар па мячы, па-

вінен як мага далей адбіць у «поле» мяч. Пасля таго, як мяч упадзе на зямлю, ігрок у «полі» павінен узяць яго ў руку і з таго месца, дзе ён падняў мяч, кінуць убок кону, а ігрок, які падкідваў мяч, павінен яго злавіць, не выбягаючы за лінію лоўлі ўбок «поля». Калі гэта адбудзецца, то ігрок, які злавіў мяч, будзе наступным выконваць удар па мячы, ігрок, які кідаў яму мяч, будзе падкідваць мяч, а той, хто выконваў удар, ідзе ў «поле» на месца таго, хто кідаў з «поля» мяч. Ігрок, які выконваў удар па мячы, прайграе і ў тым выпадку, калі ён, выконваючы ўдар, зрабіў «свечку», г.зн. мяч паляцеў далёка ўгору, а любы ігрок ў «полі» злавіў мяч у паветры. Тады гэты ігрок ідзе да кону выконваць удар па мячы, а яму падкідвае мяч той самы ігрок. Удзельнік гульні, які выконваў удар, ідзе ў «поле» на месца таго, хто злавіў мяч

Ігрок, які выконвае ўдар па мячы, працягвае гэта рабіць да таго часу, пакуль ігрок, які падкідвае мяч, не зловіць яго ад кідка з «поля» або не заробіць пры ўдары «свячу», і яе не зловяць у «полі». Калі ігрок, які выконвае ўдар па мячы, прамахнецца, то ўдар паўтараецца. Пераможцам становіцца той, у каго больш удараў па мячы.

VI. «КРОПКІ»

У гэту гульню гулялі ў асноўным дзяўчаты. На роўнай пляцоўцы абазначаўся квадрат 10 х 10 м. Па вуглах ставіліся кропкі. Дзяліліся на дзве каманды, якія павінны былі складацца з 2 – 4 чалавек. Па жэрабію адна каманда станавілася на «кропкі», другая – адвольна размяшчалася ўнутры квадрата.

Ігракі з каманды, што стаялі на «кропках», перакідвалі паміж сабой малы лаптовы мяч, ігракі ўнутры квадрата перабягалі з месца на месца далей ад ігрока, які валодаў мячом. Скарыстаўшы момант, ігракі на «кропках» імкнуліся знянацку «асаліць» мячом супернікаў у квадраце. Калі гэта ўдавалася, то ігрок, якога «асалілі», выходзіў з гульні і павінен быў пакінуць квадрат. Калі былі «выбіты» усе ігракі з квадрата, то каманды мяняліся ролямі.

Выйгравала каманда, якая хутчэй выбівала з квадрата сваіх супернікаў.

VII. БЕГ «НАВЫПЕРАДКІ»

На роўнай пляцоўцы або на вуліцы ўсе ігракі станавіліся на адной лініі тварам у адным напрамку. Па камандзе «Марш!» яны павінны былі на вялікай хуткасці бегчы да якога-небудзь прадмета: дрэва, слупа, плота, куста. Пераможцам быў той, хто першым дабег і дакрануўся рукой да гэтага прадмета.

VIII. «НА БАРЦА»

Барацьба праводзілася на якім-небудзь «мяккім» месцы: на густой траве, на палянцы, пакрытай мохам, на саломе, на сене. Два хлопцы браліся абедзвюма рукамі за тулавы адзін другога «крыж на крыж». Патрэбна было любым прыёмам зваліць суперніка на зямлю. Пераможцам аказваўся той, хто быў наверсе.

IX. ПУСКАННЕ «ЗМЕЯ»

«Змея» рабілі так: прамавугольнік памерамі прыблізна 40 х 60 см рабілі з лучыны і звязвалі ніткамі. Потым па верху з двух бакоў прыклейвалі газеты ці шпалеры. Рабілі са стужак «хвост» для раўнавагі, з процілеглага боку прычэплівалі тоўстую моцную нітку або аборанку даўжынёй да 50 метраў.

Запускалі «змея» такім чынам: адзін хлопец браўся за свабодны канец ніткі, другі – браў у рукі «змея». На роўнай пляцоўцы яны разбягаліся супраць ветру. Узлёт угару «змея» залежаў ад хуткасці разбегу і ад правільнай яго канструкцыі.

ВЁСКА ДАКУДАВА (Крупск. р., Аршанскай акр.)

(Культурна-гістарычны нарыс)

ГАРТАЮЧЫ СТАРЫЯ ВЫДАННІ

Васіль Самцэвіч

І. КАРОТКАЯ ГІСТОРЫЯ І МЕСЦАПАЛАЖЭННЕ ВЁСКІ

Аб гісторыі вёскі Дакудава мала што вядома.

У пачатку XVIII ст. в.Дакудава ўваходзіла ў склад Барысаўскага староства і перажывала ўсе асноўныя моманты эканомічна-гістарычных падзей, якія мелі месца на тэрыторыі Барысаўшчыны: барацьбу Польшчы і царскай Расіі, прыгоннае права, барацьбу праваслаўя з каталіцтвам, нямецкую і польскую акупацыі.

Да часоў утварэння Савецкай Беларусі в.Дакудава ўваходзіла ў склад Менскай губ., Барысаўскага павету, Лошніцкай воласьці. Пасьля раёнаваньня 1923 г. вёска Дакудава ўваходзіла ў склад Крупскага раёну Барысаўскай акругі. Цяпер уваходзіць у Аршанск. акругу.

Вёска знаходзіцца ад Менску на адлегласьці 105 вёр., ад Барысава ў адлегласьці 27 вёр. З гэтымі гарадамі яна зьвязана гасьцінцам і чыгункай. Да бліжэйшай чыгуначнай станцыі 7 вёр.; раённы асяродак (м.Крупкі) знаходзіцца ў адлегласьці 17 вёр. У Крупках адбываюцца кірмашы, ёсьць агрономічны і вэтэрынарны пункты, пошта, больніца. Аднак-жа трэба сказаць, што сяляне в.Дакудава з часу раёнаваньня ніяк не прызвычаіліся наведваць м.Крупкі; іх больш прыцягвае г.Барысаў, дзе адбываюцца больш багатыя кірмашы, ёсьць больш багатыя коопэратыўныя крамы з вялікім выбарам розных тавараў, сельска-гаспадарчыя склады; туды-ж аддаюць некаторыя сяляне і сваіх дзяцей вучыцца ў гарадзкія сямілеткі і тэхнікум. Слаба зьвязана вёска з Крупскай поштай і больніцай. У гэтай справе вёска мае большую сувязь з с.Лошніцай, быўшым валасным асяродкам (10 вёр.). Вёска зьвязана з Лошніцкай поштай лістаносцам, які 2 разы ў тыдзень прыносіць і адносіць паштовыя корэспондэнцыі.

У 2½ вяр. ад вёскі праходзіць М.-Бел.-Балт. чыгунка. Бліжэйшая чыгуначная і паштовыя станцыя Прыяміна знаходзіцца ў 7 вёр.

На працягу каля 2-х вёр. з паўднёвага ўсходу на паўночны захад уздоўж балота з паўночнага боку расьцягнулася вёска. Балота і далей агібае вёску з усходн. і заходняга канцоў вёскі. На паўднёвым баку вёскі раскінуліся вясковыя палеткі. З трох бакоў вёску абкружаюць лясы, дзе яшчэ нядаўна было шмат дзікіх зьвяроў: ваўкі, лісіцы, мядзьведзі і інш. Зараз лясы ў значнай меры ўжо зьнішчаны.

Шляхі зносін вёскі з суседнімі вёскамі надзвычайна дрэнныя. Мясцамі праз самую вёску ў дажджлівую восень і раннюю вясну нельга ня толькі праехаць, але нават і прайсьці. Вясной на вуліцы гразнуць каровы. Дарогі ў трох кірунках (на паўн., паўн. усх. і паўн. зах.) ідуць праз балоты, найлепшыя шляхі зносін магчымы толькі зімой, калі маразы моцна закуюць балоты. Летам прыходзіцца рабіць вялікія аб'езды ў некалькі вёрст,

каб выбрацца на гасьцінец ці на больш буйную дарогу, асабліва ў паўн. і паўн.-зах. кірунку. Дарогі на Вялікія Жаберычы, Ратуцічы, Начу на балотах маюць грэблі, якія праложаны невядома калі. У час вайны 1914 – 17 г.г. гэтыя грэблі папраўляліся, а цяпер вельмі сапсуліся, Папраўкі дарогі і грэбляў ня робіцца. Толькі ў паўднёвым кірунку магчым праезд ва ўсе пары году бяз значных перашкод. Астатнія дарогі знаходзяцца ў ...ньмі ...ным становішчы.

II. АСЕЛЬНІЦТВА ВЁСКІ

Вёска да Кастрычнікавай Рэволюцыі падзялялася на дзьве часткі: «мужыкоў» і «шляхту». «Шляхта» была эканомічна больш моцнай групай, але і кожная з гэтых груп была неаднолькава па сваім сацыяльным складзе: некаторыя «мужыкі» былі багацей за сярэдняга «шляхціца» і некаторая частка «шляхты» ня мела хлеба на цэлы год. У часы паншчыны «мужыкі» належалі спачатку да Радзівіла, а потым (з 40-х гадоў XIX ст.) да б. в. кн. Мікалая Мікалаевіча. Адбываць паншчыну хадзілі вярсты за 4⅓ у фольв. Валянцінава (цяпер «Галубы»). Пры вызваленьні ад прыгону сяляне в.Дакудава атрымалі зямлю ў розных кавалках.

«Шляхта» – ранейшыя арандатары зямлі ў таго-ж Мікалая Мікалаевіча. Мясцовыя старажылы апавядаюць: пры царыцы Ганьне (якой – ня ведаюць) быў нейкі прыдворны дваранін Ходасаў, які з цягам часу абяднеў і распрадаў сваю маёмасьць. Патомкі яго, ня маючы сродкаў на пражыцьцё, сталі арандаваць у памешчыкаў фольваркі і сваімі ўласнымі рукамі апрацоўвалі зямлю. Адзін з іх заарандаваў зямлю ў Радзівіла па суседзтву з вёскай Дакудава. Вёска ў той час знаходзілася ў іншым месцы (цяпер уроч. «Старае сяло»). Патомства разрасталася, зямля драбілася. З цягам часу патомкі Ходаса згубілі сваё дваранства і сталі называцца «вольнымі хлебаробамі». Іх паселішча звалася «хутар Дакудава». Замест грашовай платы за арэнду яны хадзілі адбываць некалькі дзён у месяц паншчыну ў той-жа самы фольв. Валянцінава. Але неяк, прыблізна каля 1855 г. яны сталі дамагацца, каб зьвярнуць сабе зноў дваранства і ў 1861-2 г. ім удалася гэтага дабіцца. Але з боку эканомічнага становішча жыцьцё іх не зьмянілася: яны засталіся арандатарамі ў Мік. Мік. аж да самай лютаўскай рэволюцыі 1917 г. Мік. Мік альбо яго намесьнікі ў любы час маглі адабраць ад іх зямлю з будынкамі, выкінуць іх з наседжанага гнязда. Такія выпадкі ня раз мелі месца ў іх жыцьці.

У свой час насельніцтва вёскі складалася з некалькіх «фамілій», з якіх першае месца займалі Хадасевічы і Бараны. З цягам часу насельніцтва павялічвалася, наяжджалі новыя гаспадары.

У сучасны момант маем такі склад вёскі:

УЗРОСТ	Мужчын	Жанчын
Да 7 год ...	38	24
Да 10 год ...	24	17
Да 16 год ...	25	28
Да 55 год ...	119	129
Старэй	18	14
Усяго	224	212

III. ЗЯМЛЯБУДАЎНІЦТВА І ЗЯМЛЯКАРЫСТАНЬНЕ

Насельніцтва вёскі займалася і займаецца пераважна сельскай гаспадаркай і мае ў сваім карыстаньні 300 дзес. пахаці, 88 дз. сенажаці, (на 60 % балот-

най), і 50 дз.выгану. Рэволюцыя зямлі сялянам не дала з тае прычыны, што паблізу ня было ні зямель памешчыкаў, ні запасных.

Зямля разьмяркоўвалася і разьмяркоўваецца наступным чынам:

Насельніцтва	Душ	Дз. пах. зямлі	Сенажаці	Выгану	Усяго дз. на адну душу
"Шляхта" ...	208	160	36	40	1,13
Сяляне ...	228	140	52	10	0,9
Усяго ...	436	300	88	50	

Калі мы паглядзім, як разьмяркоўваецца зямля паміж паасобнымі групамі насельніцтва, дык убачым наступную карціну:

Катэгорыі сялян	Лік двароў	Лік едакоў	Землі ўсіх відаў	Прыходзіцца ўсяго дз. на 1 душу	Коняй	Кароў
Безьзямельных	2	5	–	–	–	–
Ад 1 да 2 дз.	19	84	36	0,43	17	24
Ад 2 да 3 дз.	12	41	28	0,68	13	18
Ад 3 да 5 дз.	43	196	199	1,00	48	96
Ад 5 да 8 дз.	19	91	137	1,50	41	41
Ад 8 да 16 дз.	3	19	38	2,00	8	11
Усяго	**98**	**436**	**438**		**127**	**190**

Такім чынам бачым, што вёска мае пераважна серадняцкі склад насельніцтва (61,2%) і ў значнай частцы – бядняцкі (30%). Досыць яскравы малюнак клясавай розьніцы вёска мела да часоў рэволюцыі. Пасьля рэволюцыі частка зямлі ад найбольш заможных перайшла да малазямельных. Эканомічная няроўнасьць паступова зьнішчаецца, але «шляхта» яшчэ не пазбавілася сваіх «шляхецкіх» дробна-буржуазных поглядаў і ня зусім зьліваецца з «мужыкамі» ў агульна-грамадзкіх справах.

Зямлякарыстаньне як у «шляхты», так і ў «мужыкоў» цераспалоснае. Але «шляхта» перад вайной 1914 г. правяла нейкае зямлябудаўніцтва: усё поле разьбілі на чатыры зьмены, паменшыў-

шы лік і павялічыўшы велічыню палос. Тут на аднаго гаспадара прыходзіцца ад 6 да 8 кавалкаў пахаты і 3 – 4 кавалкі сенажаці. Велічыня розная: нарэзы («разы») – ад 1/2 да 3 дз. і «наддаткі» – ад 1/10 да 1/2 дз.

Другі выгляд у «мужыкоў»: тут пануе трохпалёўка. Некаторыя гаспадары, маючы 4 1/2 дз. зямлі, маюць да 20 кавалкаў пахаты і 12 кавалкаў сенажаці. Велічыня таксама ад 1/40 да 1 дз.

Але ня гледзячы на тое, што ў «шляхты» чатырохпольле, – пладазьмен вядзецца ў іх па сыстэме трохпольля, нават, як самі яны кажуць, горш: 1 – папар; 2 – жыта; 3 – яр і 4 – яр. Правільнага севазвароту завесьці ня можна па тэй прычыне, што кожны гаспадар, які захоча завесьці на сваім палетку той ці іншы пладазьмен, – залежыць ад сваіх суседзяў, бо згаварыцца ўсе адразу ніяк ня могуць. І ці можна завесьці шматпольле з правільным пладазьменам на 3-х дз., якія раскінуты ў 20 кавалках. І ў зьвязку з гэтым – апрацоўка зямлі вядзецца падзедаўску. Пераважна сеюць: жыта, авёс, бульбу, ячмень, гарох, грэчку. Толькі ў апошнія гады зьявілася канюшына, віка, лубін; некаторыя асобныя гаспадары прабуюць сеяць сэрадэлю, але няўдала; кармавыя буракі, турнэпс пачынаюць займаць досыць значнае месца ў гаспадарцы. З гэтай прычыны, дзеля падняцьця сваёй гаспадаркі, некаторыя гаспадары маюць вялікае жаданьне аддзяліцца на хутары, каб можна было весьці гаспадарку паводле ўсіх правіл агрономіі.

Большая палова насельніцтва вёскі, чуць ня ўсе «мужыкі» маюць жаданьне правесьці зямлябудаўніцтва, але дзякуючы таму, што іх не набіраецца 2/3, і зямлі ў кожнага з іх вялікая нястача, – справа гэта ня можа крануцца з месца. «Шляхта»-ж, якая мае больш і лепшую зямлю, злучыцца з «мужыкамі» для зямлябудаўніцтва ня хоча. Яна лічыць «мужыкоў» мужыкамі, галыцьбой, з якімі зьвязвацца можна тады, калі ад гэтага ім бывае яўная выгода. І ў зьвязку з гэтымі анормальнасьцямі ў зямлякарыстаньні, дзякуючы вялікаму недахопу зямлі, некаторыя сяляне імкнуцца перасяліцца на Кубань. Яшчэ раней, задоўга да вайны, некаторыя сяляне прадавалі свае палеткі, маёмасьць і пераяжджалі ў Сібір, на Каўказ. З трох двароў, якія перасяліліся ў Сібір, не вярнулася ніводнага. На Каўказ перасяліўся адзін гаспадар, які праз нейкі час вярнуўся назад.

IV. ТЭХНІКА СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ

Першы плуг зьявіўся на сяле, прыблізна, гадоў трыццаць-трыццаць пяць таму назад у досыць багатага селяніна з «шляхты». Гэтая «машына» зразу зацікавіла ўсю вёску, і калі запрэглі каня ў плуг, зьбеглася паўвёскі глядзець, як урачыста гаспадар гэтай «машыны» прагнаў баразну на гары ў самым сяле. У пяцягу 10 – 15 год саха ўжо скарыстоўвалася толькі ў асобных гаспадароў. І яшчэ гадоў каля 12 – 15 таму ў вёсцы быў гаспадар, які зусім не хацеў прызнаць плуга і выводзіў свае роўныя баразёнкі сахой. Цяпер-жа сохі сустракаюцца досыць рэдка. На ўсё сяло ёсьць 9 сох, якія скарыстоўваюцца толькі для абкопваньня (падмешваньня) бульбы, дый то саха пачынае замяняцца асыпнікам. Тып плугоў, якія сустракаюцца ў сялян – звычайны аднаконны плуг, якія робяць саматужнікі-кавалі. Вельмі рэдка сустрэць плуг фабрычнага выробу тыпа «Сухені». Звычайна за работу плуга з матар'ялам плоцяць 10 – 12 руб.

Бароны ўжываюцца свайго выробу: рамы драўляныя, а зуб'і жалезныя. Дзе-ні-дзе сустракаюцца бароны з драўлянымі зуб'ямі, якія скарыстоўваюцца для скараджэньня бульбы. І толькі, як сьведка мінуўшчыны, – у

аднаго гаспадара ў хлеве вісіць продак бараны – смык. Звычайна кожны гаспадар мае столькі барон, колькі мае і коняй.

Больш багатыя гаспадары маюць веялкі, саламарэзкі, малацілкі з прыводамі. Іншых машын, дзякуючы малазямелью і вузкапалосіцы, – няма.

Усяго ёсьць: – веялак – 3, саламарэзак – 5, малацілак – 2, прыводаў – 2.

Усе іншыя сельска-гаспадарчыя прылады, як: косы, сярпы – усё гэта здабываецца ў сельска-гаспадарчым складзе НКЗБ у Барысаве.

V. АГРОНОМІЧНАЯ ДАПАМОГА

Агрономічны вучастак знаходзіцца за 17 вёрст у м.Крупках. Сяляне агронома ў вёсцы амаль што ня бачаць. Аднак, нельга сказаць, каб гэтая вёска адставала ў сельскай гаспадарцы ад іншых. Хаця агроном бывае досыць рэдка, працы амаль што ніякай не праводзіць, тым часам сярод самаго насельніцтва прыкмячаецца імкненьне да лепшага зямлякарыстаньня і апрацоўкі зямлі. Выдзяляюцца асобныя гаспадаркі і гаспадары, якія робяць розныя досьледы з розным угнаеньнем (штучнае, тарфяное, попел) і рознай апрацоўкай глебы, пасеваў.

У 1926 г. некаторыя сяляне пасеялі жыта радавой сеялкай. У аднаго гаспадара ёсьць пладовы выхавальнік, у якім у гэтым годзе налічваецца да 4½ тысяч дрэўцаў. Прабуюць разводзіць племяны скот, асабліва сьвіней. Праўда, усё гэта робіцца без усялякай сыстэмы, выпадкова, бо сталых кіраўнікоў у гэтай справе няма. Але і гэта выпадковасьць дала свае вынікі як па палепшаньні глебы, гатунку скаціны, так і разьвядзеньні пасяўных траў (канюшына, віка), корань-плодаў (буракі, турнэпс, нават марква), лубіну і інш.

У гэтым годзе організавалася мэліорацыйнае Т-ва, якое задалося мэтай асушыць каля сотні дзесяцін балота пры самай вёсцы. У склад яго ўвайшлі карэнныя сяляне. Праца яшчэ толькі распачынаецца.

VI. КООПЭРАЦЫЯ І ГАНДАЛЬ

Аб коопэрацыі насельніцтва мала чаго ведае. Ніякіх коопэрацыйных устаноў ня было і няма. У спажывецкіх таварыствах няма ніводнага члена з сялян. Толькі ў выпадку востpай патрэбы той ці іншы селянін зварочваецца да раённага (у Крупках) сельска-гаспадарчага таварыства, запісваецца ў лік сяброў. Такім чынам, з вёскі запісалася ў сябры с.-г. Т-ва ў м.Крупкі 8 сялян вёскі. Усе тавары, патрэбныя для сваёй гаспадаркі, купляюць на рынку ў прыватных гандляроў. Часта прыходзіцца чуць скаргі на коопэратывы за іх высокую цану на тавары.

Камітэту сялянскай дапамогі, як асобнай адзінкі, ня існуе ў вёсцы, а пры сельсавеце ў сяле Нача (за 7 вёрст). Сярод насельніцтва Камітэт мала заслужыў увагі, бо нічым сябе ня выявіў, ніякай працы не вядзе і імкненьне да яго вельмі нязначнае. З усяе вёскі сябрамі камітэту толькі 23 чал., галоўным чынам сераднякі. Беднаты ня можа ўступіць у члены, бо ня мае сродкаў на ўступленьне, багатыя-ж зусім ня хочуць запісвацца, бо, як яны самі кажуць, камітэт ім не патрэбен.

VII. НАРОДНАЕ ЗДАРОЎЕ

Вёска пабудавана пры самым балоце. Адным канцом яна ўразаецца проста ў балота. Дзякуючы блізкаму суседзтву балота, блізкасьці грунтоўных вод, студні сустракаюцца вельмі часта. Праўда, абсталяваньне іх кепскае; драўляны, абросшы мохам зруб глыбынёй ад ½ да 3 арш., вілы каля студні, перась-

вер з крукам – вось і студня. Вада аддае балотам, глеем. Вуліцы мятуцца досыць рэдка, бо большую частку году на вуліцах гразь. У той-жа час, калі суха, сьмяцьцё ссоўваюць у груд, пераносяць і скідаюць у дрыжніку. Апошні займае значную частку двара; на яго скідаюць усялякае сьмяцьцё, памыі і г. д.

Памяшканьні трымаюцца брудна. Падлогу звычайна мыюць к такім рэлігійным сьвятам, як Каляды, Вялікдзень, Тройца, Пакроў. Праўда, у апошнія часы ляне с[illegible]ае хаты будуюць на дзьве ловы, якіх першая зьяўляецца орнай, дзе сьпяць, працуюць, корміць сьвіней і інш. дробную жывёліну, а другую палову трымаюць больш чыста.

Ня гледзячы на такія ўмовы жыцьця, насельніцтва вёскі досыць здаровае. Пошасных хвароб бывае вельмі мала, асабліва сярод дарослых. Сухотнікаў мала. Увесь цяжар хвароб выносяць на сваіх плячох дзеці, за якімі дагляду няма амаль ніякага, асабліва летам. І розныя хваробы на жывот, скураныя, прастуда, кохлік (коклюш) зьяўляюцца прычынай сьмяротнасьці дзяцей. Ёсьць выпадкі прыпадачных хвароб. Калецтва дзіцяці ад недагляду, рахіт (крываножка, крыварўча) досыць частае зьявішча.

Лекавай дапамогі на месцы няма. У тым выпадку калі з чалавекам бывае сур'ёзная хвароба (гарачка, калецтва) – зьвяртаюцца да доктара ў Крупкі ці ў Лошніцу (17 і 10 вёр.) Дактары наогул вельмі рэдка бываюць у вёсцы. За гэты 1926 г. ні фэльчар, ні доктар ні разу сюды не заглядваў. Лякарствоў адчуваецца недахоп, лекаркія сілы слабыя, а ў зьвязку з гэтым сялянства слаба верыць у моц мэдыцыны. Часта сяляне зварочваюцца да мясцовых лекароў-шаптух і шаптуноў. І якія толькі хваробы ня лечуць шэптамі?! Якіх спосабаў няма! І ў карыце, і на лаўды пад сукам, і на зачынку, і пад прыпечкам... і чаго, чаго ні выдумае цёмны селянін, а яшчэ больш – хітры шаптун! Праўда, у вёсцы былі выпадкі, калі шаптун на ўсё жыцьцё застаўляў дзіця калекай, але вера ў іх яшчэ не пагасае. Не малую ролю ў жыцьці вёскі іграюць «бабкі» (павітухі). Звычайна ў бабкі бяруць тых кабет, якія самі мелі некалькі дзяцей, а цяпер па старасьці, ці па іншай якой прычыне, згубілі надзею мець дзяцей. Да акушоркі, якая знаходзіцца ў Крупках і ў Лошніцы, ніколі не зьвяртаюцца.

VIII. НАРОДНАЯ АСЬВЕТА

Да 90-х гадоў мінулага сталецьця граматныя людзі ў вёсцы былі рэдкім выключэньнем. У пачатку 90-х гадоў у вёсцы адчынілася школа граматы, дзе вучылі няўдачнікі-паповічы самымі архаічнымі мэтодамі. Псалтыр ды эвангельле былі асновай усёй навукі. Некаторыя сяляне пасылалі ў школу дзяцей толькі вучыцца маліцца богу. На гэтым часамі навука іх і канчалася.

К сучаснаму моманту мы маем наступную граматнасьць у вёсцы:

Узрост	Мужчын	Жанчын	Усяго	%
Ад 7 – 16 г.	23	23	46	49
Ад 17 – 25 г.	28	9	37	
Ад 26 – 55 г.	26	8	34	
Вышэй	1	–	1	
Усяго	**78**	**40**	**118**	

Якасьць гэтай граматнасьці вельмі нізкая, бо пераважная большасьць граматных ня скончыла нават школы граматы, ці сучаснае аднакамплектнае школы.

Школа знаходзілася і знаходзіцца ў наёмных будынках, пераносіцца кожны год з аднае хаты ў другую. Абсталяваньне школы надзвычайна дрэннае, дзецям няма на чым сядзець. Настаўнікі амаль штогод мяняліся і мяняюцца з прычыны дрэнных умоў працы. За ўвесь час існаваньня школы ў вёсцы сяляне ня бачылі ніводнага добрага настаўніка.

Ні нардому, ні хаты-чытальні, ні бібліотэкі, ніякіх гурткоў у вёсцы няма. Насельніцтва слаба ўцягнута ў культурнае жыцьцё і савецкае будаўніцтва. Няма каму павесьці працу, паставіць яе на належны шлях, а запатрабаваньні да лепшага новага жыцьця адчуваюцца, асабліва сярод моладзі. Часопісаў ніякіх не атрымліваецца. Газэты выпісваюць мала: «Крестьянская газета» – 3 экз., «Правда» – 1, «Зьвязда» – 1, «Гудок» – 1. Дзе-нідзе можна сустрэць яшчэ эвангельле, маліцьвеньнік, але рэдка. Культурныя мерапрыемствы прышчэпліваюцца слаба. Толькі асобныя гаспадары пачынаюць уводзіць у сваю гаспадарку тыя ці іншыя зьмены.

У гэтым годзе 4 гаспадары пасеялі жыта радавым сеўнікам. Ёсьць спробы ўжываньня тарфянага і попельнага (зольнага) угнаеньня, разьвядзеньня кармавых кораньплодаў (буракі, турнэпс, марква), пасеву лубіну. Настаўнік П.Самцэвіч разьвёў невялічкі (у 4 з паловай тысячы) пладовы выхавальнік.

Краязнаўчай працы і краязнаўцаў сярод насельніцтва няма. Ёсьць тры сябры членаў ячэйкі ЛКСМБ (ячэйкі знаходзяцца ў с.Нача), 2 кандыдаты КПБ, піонэраў няма.

IX. ВЯСКОВЫЯ ЗАБАВЫ І ЗВЫЧАІ

Вясна, лета і восень праходзяць у напружанай працы на гародзе, полі, сенажаці. Працуюць ад усходу і да захаду сонца мужчыны, жанчыны і дзеці. Нядзеля – дзень адпачынку. Зрэдка хто наведаў царкву (за 7 вёрст), дзе можна было сустрэць знаёмых, пагаварыць. Маліцца, мала хто маліўся, нават ня ўсе і ў сподведзь хадзілі. Мужчыны лічылі за лепшае сабрацца ды выпіць па паўбутэльцы. Зараз ужо і ў нядзелю працуюць, калі ёсьць сьпешная работа.

Узімку калядамі моладзь зьбіраецца на вечарынкі, наладжвае ігрышчы. Наймаецца хата, гарманісты і пачынаюцца танцы, з якіх першае месца займаюць «вальць», полька. Раней вельмі пашырана была «кадрыль». Вечарынкі не абыходзяцца бяз выпіўкі; досыць часта вечарынкі заканчваюцца бойкамі. Варожымі лягерамі раней у большасьці былі «шляхоцкія» і «мужыцкія» хлопцы.

Вечарынкі з танцамі зьяўляюцца адзінай забавай для вясковай моладзі. Ніякіх іншых забаў няма. Ні спэктакляў, ні хору, ні літаратурных ці палітычных вечароў вёска амаль што і ня бачыла.

«Шляхоцкія» хлапцы, часамі ня меўшыя ў гаспадарцы хлеба да новага ўраджаю, часта няпісьменныя, хаця і гулялі з «мужыцкімі» дзеўкамі, але ніколі на іх не жаніліся. Лепш жаніўся які-небудзь захудалы «шляхцюк» на зусім няўдалай «шляхцянцы», чым на аднэй з лепшых «мужыцкіх» дзяўчат. Так і мяняліся дзьве суседнія вёскі і паасобныя сем'і «шляхты» жанчынамі, з прычыны чаго амаль усе сем'і «шляхты» знаходзіліся паміж сабой у сваяцтве. Гэтай замкнутасьці ў «мужыкоў» зусім ня было. Гэтыя пережыткі мінулага, выкліканыя ўсё-ж

нейкімі саслоўнымі прывілеямі «шляхты» (дваран), засталіся ў значнай меры і цяпер.

Рэлігійныя забабоны ў вёсцы глыбокіх каранёў ня мелі. Насельніцтва к часам рэволюцыі да царквы і папоў адносіліся больш формальна. Моладзь яшчэ і раней досыць крытычна глядзела на ўсе абрады і падсьмейвалася над старымі, якія сьлепа верылі папом.

Увага: *Лічбовыя даныя сабраны і прадастаўлены ў карыстаньне П.Самцэвічам.*

ХАЛАПЕНІЧЫ – СТАРОНКІ ГІСТОРЫІ

ЮБІЛЕЙ

Стары ліцьвін

У 2001 годзе споўнілася 550 год мястэчку Халапенічы. На жаль, раённая ўлада не знайшла грошай, каб адзначыць гэты паважны юбілей, да якога, дарэчы, самі местачкоўцы рыхтаваліся, – нават быў падрыхтаваны плян сьвяткаваньня. Рыхтаваліся й скаўты Малога Палесься – быў падрыхтаваны невялічкі спэктакль па гісторыі Халапеніч, Алесь Пушкін браўся правесьці конкурс "Міс Халапенічы" й падрыхтаваў адмысловыя прызы. Таксама былі зроблены памятныя налепкі «Маім Халопенічам – 550», якімі плянавалася павіншаваць амаль усіх местачкоўцаў...

Будзем спадзявацца, што 555 год мы адзначым сапраўдным сьвятам!

1. Першы ўпамін – 1451г. – Наш кароль і вялікі князь Казімір пажалаваў канцлеру ВКЛ Міхаілу Кезгайлу (Кежгайлу) 10 даньнікаў і 11 цяглых сялянаў у шэрагу вёсак Лукомскай воласьці (былое Лукомскае княства), сярод якіх згадваюцца і Халапенічы.

2. Назва мястэчка – гідронім: «Халапея» (балт.); ХАЛА – возера, ПЕЯ – рэчка. Гэта значыць: **возера, утворанае рэчкай – Халапенічы.** Прыклад: прыток Дняпра – р.Халапея.

3. З 1555 па 1620г.г. – належаць папераменна: Шэметам, Завішам, Вішнявецкім, Дарагастайскім, Валадковічам, Нонхартам, Нароўнікам.

4. 1620 – 1644г.г. – належалі Мікалаю Млечку, харужаму Аршанскага павету. Стварыў маёнтак з цэнтрам у Халапенічах, збудаваў двор. У 1640 г., фундаваў у Халапенічах кармеліцкі касьцёл і кляштар. З 1621 па 1635 год Мікалай Млечка жывучы ў маёнтку вёў дзённік, у якім, акрамя іншага, зьмясьціў інвэнтар за 1620 г., плян панскага дому, апісаньне кухоннага начыньня, скаціны, гаспадарчых прыладаў, сьпіс рэчаў, падараваных ім Халапеніцкай вуніяцкай



царкве, лекарскія й кулінарныя рацэпты таго часу.

5. 1644 – 1670г.г. – належалі Мікалаю

Угары. *Налепка, падрыхтаваная скаўтамі Малога Палесься да юбілею Халопеніч.*

Цеханавецкаму, што быў старастам і ваяводай амсьціслаўскім.

6. 1670 – 30-я г.г. XVIII ст. – належалі Халецкім. Зь якіх Гедэон Халецкі у 1690 г. заснаваў кляштар дамініканаў пры ўжо існуючым былым кармеліцкім касьцёле (?). Яго сын Марцыян, староста навасельскі фундаваў дамініканскі кляштар у Халапенічах у 1700 г. Дарэчы, Марцыян Дамінік Халецкі быў першы з Халецкіх, хто ў сваё імя ўвёў назву маёнтка Халапенічы і пісаўся ў дакумантах наступным чынам: «Марцыян Дамінік з Хальча на Чэрніхаве й Халапенічах Халецкі, навасельскі староста».

7. 30-я г.г. XVIII ст. – 1855г. – належалі Храптовічам. Самы знакаміты з іх – Храптовіч Яўхім Ігнацы Юзаф Літавор (1729 – 1812) нарадзіўся ў в.Ясянец сучаснага Баранавіцкага р-ну Берасьцейскай вобласьці. Палітычны, грамадзкі і культурны дзеяч ВКЛ, публіцыст, паэт, перакладчык, мэцэнат, вучоны-гуманіст. Апошні канцлер ВКЛ (з 1793г.). Пісаў на польскай, лацінскай й беларускай мовах. Паходзіў са старадаўняга ліцьвінскага магнацкага роду, што карыстаўся гэрбам «Адравонж» і меў ва ўладаньні, сярод іншых, маёнткі Шчорсы, Вішнева, Бешанковічы, Зембін, Халапенічы. У Шчорсах сабраў знакамітаю бібліятэку (10 тыс. тамоў).

У 1783 г. даў Халапенічам шэраг гандлёвых і эканамічных ільгот. Лепшых сялян вызваляў ад прыгону й пераводзіў на грашовы аброк (в.Яўхімаўка – зараз: Якімаўка). Займаўся разумнай мэліярацыяй вакол мястэчка. У 1786 г. пабудаваў і адчыніў у Халапенічах шасьціклясную школу (2 двухпавярховых й 1 трохпавярховы будынкі). У ёй дзеці шляхты й сялян вывучалі латынь, матэматыку, гісторыю, права, земляробства, садаводства й пчалярства. У маёнтку стварыў дваровую бібліятэку. Распаўсюджваў сярод сялян агранамічныя веды (каровы «ціролькі»).

Ягоны сын Адам працягваў мэліярацыю вакол мястэчка. У 1828 г. пабудаваў драўляную вуніяцкую царкву ў Халапенічах у выглядзе карабля. У 1840 г. адкрыў у мястэчку больніцу й аптэку для сялян (адзіную на ўвесь Барысаўскі павет). Вучыў сялян культурнаму земляробству.

8. 1772 – 1793 г.г. – пасьля першага падзелу нашай краіны, Аршанскі павет быў падзелены на дзьве часткі, большая зь якіх з цэнтрам у Воршы апынулася ў Расейскай імпэрыі. Другая, заходняя частка разам з Халапенічамі засталася ў складзе нашай дзяржавы. Паводле каралеўскага прывілея 1775 г. Халапенічы былі прызначаны адміністрацыйна-судовым цэнтрам гэтае часткі Аршанскага павету. Менавіта тут сталі адбывацца паседжаньні гродзкага й земскага судоў Аршанскага пав. Рэчы Паспалітай. Гэта ўзвысіла мястэчка ў эканамічным і культурным плянe.

9. 19 кастрычніка 1856 г. у ваколіцы Халапеніч, вёску Шчаўры прыехаў на дажынкі знакаміты Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч па запрашэньню свайго прыяцеля, уладара аднайменага маёнтка, Юліяна Рашкоўскага. Творчым вынікам паездкі сталіся: вершаваная аповесьць «Шчароўскія дажынкі», верш «Да пачцівых беларусаў» і вершаванае апавяданьне «Літаратурныя клопаты». А для сябе Беларускі пясьняр узяў у жонкі мясцовую шляхцянку – Марыю Паўліну Грушэўскую! Пабываў пісьменьнік і ў Халапенічах у свайго добрага знаёмага, уладара маёнтка Аляксандра Дамініка Лапы, падарыўшы яму свайго знакамітага «Гапона».

10. 25 сакавіка 1862г. – нарадзіўся Адам (у хросьце – Адольф) Ягоравіч Багдановіч (быў ахрышчаны па вуніяцкаму абраду ў Халапеніцкай праваслаўнай царкве!).



Былы касцёл у мястэчку Халопенічы. 80-я г.г. XX ст.

Фальклярыст, этнограф, мэмуарыст, бацька Максіма Багдановіча. Сабраны бацькам фальклёр Максім шырока выкарыстаў у сваёй творчасьці (напрыклад у вершы «Зьмяіны цар»). Акрамя іншых шматлікіх працаў Адам Ягоравіч пакінуў шыкоўныя успаміны аб Халапенічах XIX стагодзьдзя, якія сьмела можна лічыць энцыкляпэдыяй сялянскага жыцьця нашага мястэчка.

11. Вясна 1863 г. – атрад капітана Трашчынскага, сабраны ў ваколіцах Халапеніч, рушыў у бок Барысава на злучэньне з больш буйнымі паўстанцкімі фармаваньнямі й папаў у засаду ля вёскі Падбярэзьзе. Месца пахаваньня загінуўшых вядома.

12. 1875г. (?) – у сям'і местачковага шаўца Левіна нарадзіўся сын Міхаіл, які праз 20 год паехаў у Амэрыку й разбагацеў – у 1908 годзе ён ужо валодаў вялікай сеткай кінатэатраў. Пазнаёміўшыся з братамі Джозэфам і Мікаласам Шэнкамі (з Рыбінску), на пачатку 20-х гадоў Міхаіл Левін (Маркус Лоў) разам зь імі стварыў знакамітую кінакампанію МГМ (Мэтро – Голдвін – Майер), што сталася пачаткам Галівуда!

13. 1897г. – нарадзіўся Віктар Міхайлавіч Берман, выдатны навуковец, доктар мэдычных навук, прафэсар, аўтар падручніка «Прыватная эпідзіялёгія».

14. 1907г. – памёр Міхаіл Навумавіч Берман, доктар Халапеніцкай больніцы, які карыстаўся ўсенароднай любоўю й павагай далёка па-за межамі мястэчка (бясплатна лячыў бедных, «...Высокага сэрца быў чалавек!»).

15. 1918 – 1921 г.г. – у мястэчку й ваколіцах пасьпяхова дзейнічала "зялёная армія" на чале з атаманам Лукашом Семенюком (нарадзіўся ў в.Траянаўка Халапеніцкай воласьці), якога халапенцы, пасьля адступленьня немцаў у 1918 г. абралі сваім камісарам. У 1918 – 1919 г.г. савецкай улады ў мястэчку й воласьці амаль не існавала. А вось што дакладваў А.Чарвякову 28 кастрычніка 1920 г. Барысаўскі камісар аб становішчы ў павеце: "Зелёная армия в борисовском уезде разрослась до неимоверных размеров. Нет ни одной волос-

ти уезда, где не было бы банд. Особенно много их в некоторых волостях, где есть для них природные убежища... По слухам, по всему уезду имеется несколько тысяч бандитов. В настоящее время банды начали действовать открыто... Они напали на Гайна-Слободу и местечко Плещеницы, которое некоторое время находилось в руках бандитов... На беспартийной конференции в Холопеничах была принята резолюция, в которую внесены слова контрреволюционного пожелания: желаем мирным путём освободить Беларусь от польских и советских войск и дать ей возможность самоопределиться без чьей бы то ни было диктатуры."

16. У 30-я г.г. XX ст. у мястэчку працаваў настаўнікам беларускай мовы й літаратуры, вядомы краязнавец, сябра Інбелкульта Самцэвіч Пётра (нарадзіўся ў в.Дакудава Крупскага р-ну). Друкаваўся ў часопісе «Наш край», зьбіраў слоўнік тапонімаў Барысаўшчыны й Крупшчыны (забіты фашыстамі пры растрэле габрэяў ва ўрочышчы «Каменны лог» восеньню 1941г. – каля 900 чалавек).

17. Імі ганарымся:

- Бандарэнка Канстанцін Аляксандравіч, нарадзіўся ў 1918 г. Афіцэр, маёр, прайшоў баявы шлях ад Адэсы да сталіцы Чэхіі у франтавой выведцы, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, мэдалямі. З 1967 па 1987 г. працаваў начальнікам адзьдзела кадраў Адэскага пэдінстытута. Склаў грунтоўныя радаводы вядомых халапеніцкіх родаў: Бандарэнкаў, Баркоўскіх, Сазонавых, Скалубовічаў. Апублікаваў (на правах рукапісу) кнігі па гісторыі мястэчка.

- Ганчарэнка Андрэй Маркавіч, нарадзіўся ў 1933 г. Акадэмік Нацыянальнай АН Беларусі, доктар фізыка-матэматычных навук, прафэсар, Заслужаны дзеяч навукі БССР.

- Хадасевіч Уладзімер Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1933 г. Вынаходнік СССР, кандыдат тэхнічных навук, майстра спорту СССР.

- Зуёнак Васіль, нарадзіўся ў 1935г. Беларускі паэт, з 1990 па 1998 г.г. – старшыня Праўленьня Саюзу пісьменьнікаў Беларусі, аўтар больш 20-ці зборнікаў паэзіі.

- Грышановіч Валерый, нарадзіўся ў 1947г. Беларускі паэт. У1980-х г.г. рэдактар газэты «Знамя юности», у першай палове 1990-х гадоў – дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура». Аўтар паэмаў: «Пагоня вяртаецца на Беларусь» (1992), «Халопенічы» (1998).

- Мажэйка Зінаіда Якаўлена, (1933г.) вядучы навуковы супрацоўнік Інстытуту мастацтвазнаўства, этнаграфіі й фальклёру НАН Беларусі, доктар мастацтвазнаўства, Заслужаная дзяячка мастацтваў БССР, ляўрэатка Дзяржаўнай прэміі Беларусі, аўтарка звыш 200 навуковых прац, 7-мі дакумэнтальных этнамузыкальных кінастужак. Ейнае імя – у Кэмбрыджскім даведачным выданьні: «2000 выбітных інтэлектуалаў XX ст.» Амэрыканскім дасьледчыцкім біяграфічным інстытутам аб'яўлена «Чалавекам 2000г.» і ўзнагароджана Medal of honor.

«ГЭТЫ РАДАСНЫ СЬВЕТ...»

КНІГА

"Гэты радасны свет
Падарыла мне мова"

А.Котава, "Варажба травы"

Кніжная серыя "Бібліятэка часопіса "Маладосць" (№7,2001г.), дзе выдадзена першая кніга вершаў Алены Котавай "Варажба травы," падарыла магчымасць чытачам пазнаёміцца з гэтым прыгожым паэтычным светам, створаным самабытным мастаком слова і фарбы. Алена Адамаўна Котава жыве ў Менску і працуе выкладчыкам на аддзяленні дызайну Менскага дзяржаўнага архітэктурна-будаўнічага каледжа. Асноўная яе прафесія – мастак. Але слова падуладна ёй не менш, чым колеры.

Жыццё Алены некаторы час было звязана з мястэчкам Крупкі, з ракой Бобр, так хораша апаэтызаванай у адным з яе вершаў. Некаторы час Алена вучылася тут у школе №2. І цяпер тут, у Крупках, Алену чакае яе маці, Анастасія Пахомаўна.

Характэрнымі рысамі творчасці паэтэсы з'яўляюцца глыбінная сувязь з гісторыяй Беларусі, яе культурай, мастацтвам, надзвычай добрае валоданне самымі шырокімі пластамі лексікі беларускай мовы, неадольнае захапленне Яе Высокасцю Прыродай, вастрыня, шчырасць, прага самых высокіх пачуццяў. Паэтэсе ўласцівы толькі яе асабісты паэтычны погляд на свет, сваё індывідуальнае светабачанне. У краіну Паэзію Алена Котава прынесла сваю жыццёвую мудрасць.

Нярэдка ў творах аўтара сустракаецца паўтарэнне адных і тых гукаў, – алітэрацыя. Вось чатыры радкі з верша "Цішыня", якім адкрываецца зборнік:

Не шапоча пышная шыпшына,
Птушка ў застрэшшы не цвірчыць.
Не скрыгоча шынамі машына.
Шпаркі дождж у лісці не шуміць.



Тацяна Станіславаўна Каваленка, *нарадзілася ў г.Клецаку Менскай вобл.,скончыла Крупскую СШ №2 у 1980г. і філялагічны факультэт БДУ (1985г.) Працуе ў Крупскім краязнаўчым музэі. Паэтка, краязнаўца.*

Паўтор шыпячых гукаў тут – гэта толькі водгаласак апалай кроплі дажджу, гэта пошум ветру, які ўзгадваецца і мроіцца, калі прыслухоўваешся да цішыні. "Каб разумець вершы, іх трэба слухаць у цішы," – як бы настройвае чытача паэтка на самым пачатку сустрэчы.

Паэтэса жыве з адчуваннем повязі з мінуўшчынай, з продкамі. Якімі важкімі з'яўляюцца для яе "скарбы курганных

глыбінь": "прасцячок-чарапок", плеценыя з саломы і лазы "з адценнем золата старыя экспанаты", "пявучы арнамент" старадаўняга народнага адзення...

Цэлая баталія разыгралася – паўстала перад вачамі паэтэсы, калі ўбачыла яна Барысавы камяні з высечанымі на іх словамі. Яна пачула водгук даўніх ратных падзей, калі князь Барыс з дружынай бараніў сваю зямлю ад нашэсця ворагаў (верш "Барысавы камяні").

Нават адзінокая кветка, балотны жоўты касач, сарваны дзяўчатамі, нагадаў пісьменніцы князя, які загінуў у бойцы (верш "Балотны князь").

Паэзія Алены Котавай незвычайна настраёвая, паказвае, што аўтар – вельмі эмацыйны і ўражлівы чалавек. Верш "Лесавое" – лепшае падцвярджэнне гэтаму. На змярканні, у звычайным лесе, калі "гаснуць промні ў прымхах хвояў", яе лірычную гераіню раптам апаноўвае сапраўдны жах: "у чарах лесу – жаху джала". Рэчка асацыіруецца з ракой забыцця Летай, гераіні мрояцца самыя розныя пачвары, міфічныя стварэнні, падземнае царства, цмокі, багна, пасткі вакол... "Няўжо і гэта, што ў крыві – ад дзікіх продкаў?" – дзівіцца аўтар сама сабе. Але настрой мяняецца ў адно імгненне: знікаюць усе жахі да адзінага, а прычына ў тым, што закувала зязюля, і гэтага дастаткова, каб вярнуць чалавека да рэальнасці, да нармальнага стану. Спадае напружанне і ў чытача, якому ўжо паспеў перадацца вельмі трывожны настрой.

Верш "Майскі дождж" – гэта сапраўдны маленькі шэдэўр, імгненны здымак душэўнага стану чалавека, нашага сучасніка, які, здараецца, сярод людзей задыхаецца, дранцвее ад адзіноты, непаразумення, незапатрабаванасці, усемагчымых умоўнасцей, вымушанага маўчання, няшчырасці, нежадання прыняць іншага, мабыць, проста ад ператомленасці. Насустрач майскаму дажджу расчыняецца душа паэтэсы ажно да самага донца, да самага далёкага куточка, аж да таго, што паэтэса сама просіць прабачэння за гэту расчыненасць. Як да прыяцеля ці як да лекара звяртаецца яна да дажджу, хапаецца за яго, як за "ніць Арыядны", за "пуцяводны прамень". І ліўнем праліваецца ў аўтара жаданне расказаць пра ўсё, што было "закансервавана ў душы", нібы ў склепе; знікае, змываецца здранцвенне, нібы праходзіць атручэнне. Жвавым, нечаканым, чароўным, вясёлым, спагадлівым аказваецца дождж. З ім утульна.

Свежай, багатай, яркай вобразнасцю адзначаны амаль усе вершы паэтэсы. А верш, радок з якога ўвайшоў у загаловак гэтага артыкула, з'яўляецца адным з самых метафарычных, маляўнічых, і ў ім крэда аўтара: пісаць для таго, пісаць так, каб бязмежнае чароўнае мора роднай мовы адкрылася ўсім, каб, "хвалі вобразаў" са жменькамі "каштоўных каменьчыкаў кропак і косак" дакрануліся да кожнага.

Раней з вершамі Котавай Алены пазнаёміліся чытачы часопісаў "Полымя" і "Маладосць", а вось першая яе кніга ішла да чытачоў доўга. Між тым, гэта невялікая кніга ўвабрала ў сябе шмат цікавых паэтычных знаходак, не пакінула абыякавымі чытачоў. Летам 2002 г., на чарговым пасяджэнні секцыі паэзіі Алена Адамаўна Котава рэкамендавана для прыёму ў Саюз беларускіх пісьменнікаў.

Таццяна Каваленка,
супрацоўніца краязнаўчага музея г. Крупкі

РЭЧКА БОБР

Рэчка Бобр, бору сябра.
Стужкай срэбнай лугам вольна
Зіхаціць вада прывабна
У дымлівых купаў вольхаў.
Кропляй чыстаю ў дзяцінстве
На маім кірпатым носе
Зіхацеў ты і іскрыўся
У валасах, нібы ў калоссі.
Водар лугу, вецер з поля
Скрозь працяты пахам хвойным
Маладым буслам прыволле
Чыста, лёгка і спакойна
Быццам зараз за спіною
Пругка крылы развінуцца
Рэчка Бобр, мне з табою
Цэлы век не размінуцца.

***

Чарада курганоў –
Старажытнасці знак –
Шляху вольнага ўздоўж
Вартай-раццю глядзіць.
Раздарожжа вятроў –
Пылу горкага смак.
На сустрэчы шляхоў
Крыж каменны маўчыць.

На далоні ляжыць
Прасцячок – чарапок,
Скарб курганных глыбінь.
Стужка – хваля над ім
Шмат стагоддзяў бяжыць.
– Цур, славянскі гаршчок,
У хвалях часу не згінь
З даўнім продкам маім.

Срэбнай грыўны авал
Важыць тысячу год.
На пялёстках вянцоў –
Таямніца замоў.
Грыўнай лёс ахінаў
Шыю той, мо што род
– Пачынала з высноў.
Як пяе тая кроў!

Котава Алена Адамаўна,
"Варажба травы" Мн., "Дом прэсы", 2001г.

МАТЭРЫЯЛЫ ВЕЛАПАХОДУ

па маршруце: г.Крупкі – в.Прудок – в.Вялікае Горадна – могілкі былой в.Шырнавічы – г.Крупкі

ПЕРШАЯ ПУБЛІКАЦЫЯ

Валеры Арцюховіч

МЭТЫ ПАХОДУ

1. Пошук і азнесярэднявяковага могільніка ля в.Прудок.
2. Абсьледаваньне й вывучэньне могілак в.Вялікае Горадна.
3. Выяўленьне й дасьледаваньне гарадзішчаў ля в.Вялікае Горадна.
4. Пошук і вывучэньне могілак былой в.Шырнавічы.

УДЗЕЛЬНІКІ ПАХОДУ

1. Арцюховіч Валеры – вучань 10 «В» клясы.
2. Шкілёнак Андрусь – вучань 10 «В» клясы.
3. Шкілёнак Антось – вучань 7 «А» клясы.

ДЗЁНЬНІК ПАХОДУ

6.00. Збор удзельнікаў.

6.00 – 6.10. Інструктаж па тэхніцы бясьпекі, удакладненьне маршруту.

6.10 – 8.05. Рух да в.Прудок.

8.05 – 8.30. Сьняданак. Удакладненьне мэтаў паходу.

8.30 – 9.30. Пошук могільніка ў лясным масіве ля в.Прудок.

9.30 – 9.50. Рух да могілак в.Вялікае Горадна.

9.50 – 10.50. Абсьледаваньне й вывучэньне могілак в.Вялікае Горадна.

10.50 – 11.20. Пошук гарадзішча ля в.Вялікае Горадна.

11.20 – 12.00. Абед, адпачынак.

12.00 – 13.00. Абсьледаваньне гарадзішча №1 ля в.Вялікае Горадна.

13.00 – 13.30. Выяўленьне й дасьледаваньне гарадзішча №2 ля в.В.Горадна.

13.30 – 15.00. Рух да былой в.Шырнавічы.

15.00 – 15.30. Адпачынак, палуднаваньне.

15.30 – 15.50. Пошук могілак ля в.Шырнавічы.

15.50 – 17.00. Абсьледаваньнё й вывучэньне могілак ля в.Шырнавічы.

17.05 – 17.45. Рух да г.Крупкі.

АПІСАНЬНЕ ПАХОДУ

Апошняй вясновай раніцай мы выправіліся ў такі, доўгачаканы намі, велапаход. Надвор'е выдалася добрае, па-травеньску, цёплае й, здавалася, сама прырода спрыяе нам. У гэты раз наш шлях ляжаў у кірунку вёскі Вялікае Горадна, – што на поўдні Крупшчыны. Прыкладна празь дзьве гадзіны

***Валеры Арцюховіч**, нар. у г.Крупкі Менскай вобл. Вучань 11 "В" клясы СШ №3 г.Крупкі, капьёвы капья "Зубры" харугвы скаўтаў Малога Палесься. Займаецца ў краязнаўчым гуртку "Спадчына" СШ №3 (кіраўнік Пушкіна Яніна Аляксандраўна).*





нашы ровары ўжо не выглядалі такімі бліскуча-чыстымі – мы прыехалі да вёскі Прудок, першага пункту нашай вандроўкі. Адпачнуўшы й падсілкаваўшыся мы, спачатку запыталіся ў мясцовай жыхаркі і не атрымаўшы станоўчага адказу, пачалі самастойныя пошукі позьнесярэднявяковага могільніка, які па зьвестках археолягаў павінен знаходзіцца дзесьці недалёка ад вёскі, ва ўрочышчы «Дзяцінная Гара» (1). Але на гэты раз нашы пошукі не далі плёну. Параіўшыся, мы вырашылі не губляць часу й рушылі далей – у вёску Вялікае Горадна. Праяжджаючы празь вёску Выдрыца (што побач з в.Вялікае Горадна) мы апынуліся на мосьце праз раку Бобр (фота №1). Нас вельмі ўразіла шырыня ракі, – у параўнаньні з Крупкамі, тут яна шырэй у два разы! Гэту прыгажосьць немагчыма апісаць словамі, – лепей пабачыць (фота №2)! Непадалёку ад сучаснага маста засталіся сляды старога, драўлянага, і тырчаць з вады чорнымі дубовымі слупамі, як жаўнеры на варце... З двох берагоў ля моста засталіся насыпы старой дарогі, якая памятае не адно стагоддзе (фота №3).

ГІСТАРЫЧНАЯ ДАВЕДКА

Вёска Вялікае Горадна – адна з самых старажытных на Крупшчыне. Аб засяленьні гэтай мясцовасьці ў старажытныя часы сьведчыць гарадзішча жалезнага веку, што знаходзіцца каля вёскі і, цяпер не існуючы, курганны могільнік ля вясковых могілак (2). Вёска ж упершыню ўзгадваецца ў пісьмовых крыніцах пад 1517 годам. Менавіта тады, а таксама і ў 1526г., пасол Сьвяшчэннай Рымскай імпэрыі Сыгізмунд Гэрбэрштэйн праяжджаў празь вёску (3), (малюнак №1). У 1670г. Горадна Вышняе – сяло Барысаўскага старасьтва, 6 двароў. На мапе




Фота №2



Фота №3

«Менскае і Наваградскае ваяводствы» з «Атляса Рэчы Паспалітай» Я.А.Рызі Занноні, 1772г., назва вёскі напісана: «Horodnja» і выразна бачна вуніяцкая царква (мал. №2). У 1773 г. Горадна Верхняе, 18 «кунічных двароў»... У 1897 г. у складзе Вялікага Горадна (Вышняга Горадна), 46 двароў, 582 жыхары, хлебазапасны магазін, а таксама хутарскі двор – 6 жыхароў. У 1917 годзе ў складзе Вяляцкай воласьці Барысаўскага павета Менскай губэрні. З 1924 г. у Крупскім раёне. У 1930-я гады вяскоўцаў аб'ядналі ў калгас «Зорка». У 1941 г. у вёсцы 79 двароў, 437 жыхароў. На франтах II-й Сусьветнай вайны і ў партызанах загінулі 62 чалавекі, фашысты зьнішчылі 17 мірных жыхароў. Вёска была амаль поўнасьцю спалена. Зараз вёска ў складзе калгаса імя Кірава. На 01.01.1998 г. 82 гаспадаркі, 210 жыхароў.

Мал.1. Гэрбэрштэйн у санях (гравюра базэльскага выданьня 1556 г.)



МОГІЛКІ ВЁСКІ ВЯЛІКАЕ ГОРАДНА


Могілкі знаходзяцца побач з дарогай і з чатырох бакоў абкапаны ровам. Памеры іх па лініі поўнач-поўдзень – 40 мэтраў, а па лініі захад-усход – 60 м. (мал. №3). Могілкі шматканфэсыйныя: прысутнічаюць пахаваньні па каталіцкім, праваслаўным і стараверскім абрадах. Сярод прозьвішчаў найбольш распаўсюджанымі зьяўляюцца: Хвашчэўскія, Лучыны, Драніцы. Пры абсьледаваньні мы выявілі больш за 380 надмагільных камянёў і тры каменных крыжы вялікіх памераў, а таксама 7 выяваў, зь якіх 5 на камянях і 2 на каменных крыжах (мал. №4). У тым ліку знойдзены каменны (граніт «рапаківі») крыж без выявы, памерамі: у вышыню – 75см, у вышыню – 65см (фота №4), а таксама дзьве вялікія каменныя пліты памерамі: 80 х 50 см і 110 х 60 см. Акрамя каменных крыжоў на могілках ёсьць і драўляныя. Адзін зь іх дубовы, і на выгляд яму ўжо больш за сто гадоў (фота №5).




Мал.2.

Другі крыж (фота


Мал.3. Могілкі в.Вялікае Городна



Фота №4



Фота №5




№6) маладзейшы за першы, але ён цікавы тым, што да яго гарызантальнай перакладзіны, зьлева, прымацаваны невялічкі драўляны крыжык. Гэта можа азначаць, згодна з народнай традыцыяй, пахаваньне ў адной магіле маці і дачкі. Калі б крыжык быў прымацаваны справа, – гэта б азначала пахаваньне маці й сына.


Асобна трэба апісаць выявы на малюнку №4 – 4-г і 4-д Камень на мал. №4-г мае надзвычай нестандартныя памеры: шырыня – 50 см, а вышыня – 25 см, што насьцярожвае. Магчыма, гэты камень толькі ніжняя частка кампазыцыі?! Выява ж на гэтым камяні нагадвае язычніцкі салярны знак (на іншых могілках Крупшчыны нічога падобнага пакуль што не выяўлена). Але можна таксама выказаць меркаваньне, што верхняй часткай гэтай кампазыцыі (?) мог зьяўляцца каменны крыж з выявай чэрапа – тады выява на самім камяні сымбалізуе Галгофу?! (мал. №5).

Выява ж на малюнку №4-д увогуле ўнікальная (таксама, пакуль не мае сабе аналягаў), і што яна азначае – пакуль загадка. Мы мяркуем, што магчыма гэта, як і на малюнку №4-г, варыяцыя аднаго з язычніцкіх салярных знакаў, які зьяўляецца сымбалем агню ці сонца. «В 1957 году при раскоп-


Фота №6




Мал.4.



Мал.5.



ках в селе Лепесовке археолог М.Тиханова открыла сооружение I – IV веков с жертвенником посередине. Это было святилище – место, где древние славяне... «общались» с богами. Внутри жертвенника находились ритуальные чаши. На широком венчике одной из чаш были изображены двенадцать различных прямоугольных секций, и ни одного одинакового рисунка (мал. №6)... На



Мал.6.

трёх рисунках (1, 3, 6,) – четкие косые кресты. Их называют «поганскими крыжами». Это символы огня или солнца. В шестом рисунке косой крест повторен дважды и дополнен волнистой линией – обычным символом воды.» (4). Прымем гэтую важную інфармацыю да ведама, а менавіта – касыя крыжы ў язычніцкай міталёгіі зьяўляюцца сымбалямі агню ці сонца. Але, як культ сонца і агню можа быць зьвязаны з пахавальным абрадам?

Вядома, што да прыняцьця хрысьціянства ў нашых продкаў (і ўвогуле ў арыяў) існаваў абрад «ачышчэньня», калі нябожчыка спальвалі на вогнішчы. Месца пахаваньня попелу таксама абавязкова «ачышчалася» агнём. Увогуле, жыцьцё нашы продкі параўноўвалі з рухам сонца: «В ежедневном движении солнца младенчествующий предок видел целую жизнь живого существа, подобие своей собственной: оно родилось, быстро становилось юношей, затем мужем, исполненным сил, постепенно старело, наконец умирало, скрываясь на западе...» (5).

Культ сонца, як і шматлікія іншыя, працягваў «жыць» і пасьля прыняцьця хрысьціянства нашымі продкамі. А яго рэліктавыя праявы, у той ці іншай ступені, захаваліся й да нашых дзён.

Вось як, напрыклад, сьвяткуюць Вялікдзень у вёсцы Сомры Крупскага раёну. Падрыхтаваўшы ўсе абавязковыя стравы (велікодныя булкі, яйкі, соль і г.д.) іх кладуць на паднос, выходзяць за паўгадзіны да ўзыходу сонца ў двор і ставяць паднос на шулу (цэнтральны слуп звычайнай брамы). Як толькі сонейка ўзыйшло й кранулася промнямі ежы, – кажуць, што ўжо сьвянцонае – можна есьці!? Аналягічна сьвяткуюць Вялікдзень і у в.Варанцэвічы Талачынскага раёну (6).


Але вернемся да могілак вёскі Вялікае Горадна. У архіве скаўтаў Малога Палесься захоўваецца легенда: «Чаму ў Горадне радаўніца ў панядзелак?», якую паведаміла Драніца Надзея Ўладзімераўна, 1930 г.н. Ёй слова: «Раней бацюшкі не пасьпявалі пасіціць ўсе могільнікі. І яны рашылі, што на некаторых могільніках радаўніца будзе ў панядзелак. Адным з гэткіх могільнікаў стала Вялікае Горадна. Аднойчы жыхары вёскі вырашылі, што яны будуць спраўляць радаўніцу, як і ўсе, у аўторак, – сяроўна бацюшкі няма. Вось і пайшлі яны ў аўторак. Расклалі скацёркі, паставілі сьвечкі, каб памянуць продкаў. І тут паднялася такая бура, што некаторыя скацёркі занесла так, што іх не маглі знайсьці. Усе спужаліся й палічылі, што гэта ім за тое, што пайшлі ў аўторак, а не ў панядзелак. З тае пары жыхары вёскі рашылі, што будуць хадзіць на могілкі ў панядзелак, як ім і казаў бацюшка.» (6).

Акрамя могілак вёскі Вялікае Горадна, на іншых могілках Крупшчыны, скаўтамі Малога Палесься выяўлены таксама таямнічыя знакі, магчыма зьвязаныя з культам сонца (мал. №7). Гэта могілкі в.Сьвірыдаўка (№7-а і №7-б), в.Кіявец (№7-в), в.в.Дакучын і Радзіца (№7-г). Таксама сустракаюцца й спалучэньні хрысьціянскага крыжа з сонцам – в.Калодніца (№7-д) і в.Радзіца (№7-е).


ГАРАДЗІШЧЫ ЛЯ в.ВЯЛІКАЕ ГОРАДНА

Пасьля абсьледаваньня могілак мы рушылі на пошукі гарадзішча. Праехаўшы ўздоўж вёскі, напрыканцы зьвярнулі да ракі Бобр. Схаваўшы ровары, мы пачалі прачэсваць лясны масіў за вёскай і ў хуткім часе ўбачылі стромкі схіл, роў і вал гарадзішча (фота №7)! Узрадаваныя, мы абыйшлі яго кругом і вырашылі адпачыць. Абедалі на гарадзішчы. Пасьля адпачынку правялі абсьледаваньне – пляцоўка гарадзішча мае форму трохкутніка, даўжыня – 70 м,

Мал. 7.



вам. З паўночнага боку ў рове ёсьць перамычка. Паўднёвая частка пляцоўкі ў параўнаньні з паўночнай ніжэй на некалькі мэтраў. Скончыўшы дасьледаваньне гарадзішчаў мы рушым на роварах у адваротным накірунку, да былой вёскі Шырнавічы (выселена ў 30-я гады XX стагодзьдзя). Цяпер на месцы вёскі засталося поле, якое ўсе завуць



шырыня – 40 м. З заходняга боку па краі пляцоўкі захаваўся дугападобны вал вышынёй – 1,5 м. З поўначы і захаду гарадзішча абнесена ровам. З паўночна-заходняга боку маюцца дзьве перамычкі (мал. №8-а). У пашкоджанай скарбашукальнікамі яме мы знайшлі 14 кавалкаў гладкасьценнай і з дробнай штрыхоўкай ляпной керамікі, а таксама 1 кавалак ганчарнай. Акрамя керамікі знойдзена 6 кавалкаў шлаку й некалькі кавалкаў драўлянага вугалю. Прайшоўшы каля 100 мэтраў на захад мы ўбачылі другое гарадзішча, крыху меншае памерамі, прамакутнай формы (мал. №8-б). Пляцоўка мае памеры прыблізна 50 х 35 м. З паўночнага боку ўмацавана валам. З усходняга, заходняга й паўночнага бакоў гарадзішча абнесена ро-



Фота №7

Шырнаўскім. Пра вёску нагадваюць бадай што толькі камяні былых падмуркаў хат, што невялічкімі пагоркамі раскіданы па полю, ды старыя могілкі. А калісьці тут буяла жыццё...

ГІСТАРЫЧНАЯ ДАВЕДКА

Вёска Шырнавічы ўпершыню сустракаецца на старонках гістарычных дакументаў пад 1481 годам. Належала яна тады пану Юшку (Юрыю) Гойцавічу. Ён завяшчаў сваю «выслугу на вялікім князе Жыгімонце» – маёнтак Рэпухаў з сялом Воўкавічы і даньнікамі ў Шырневічах, – жонцы Ганьне Даўгірдаўне. Тая пасьля яго сьмерці выйшла за шляхціца Івана Ільлініча і ў 1481 годзе падаравала яму спадчыну першага мужа. У 1559 годзе Шырнавічы згадваюцца як уласнасьць вялікага князя Жыгімонта III Аўгуста і былі прыпісаны да Аршанскага замка, разам зь вёскамі сучаснага Крупскага раёна – Ігрушка, Сакалавічы. Паводле інвэнтара замкавай воласьці ў Шырнавічах на той час было 19 дымоў і 5 службаў. На мапе «Менскае і Наваградзкае ваяводзтвы...» (мал. №2) назва вёскі па-польску пададзена як: «Tirnowice», а таксама выразна відаць выява вуніяцкай царквы. У 1775 годзе ў вёсцы 26 двароў і з гэтага году яна ў складзе Бобрскай воласьці Сенькавецкага павету. З 1924 г. у складзе Крупскага раёну. У 1933 г. Шырнавічы, а таксама вёскі Маласаі і Красная Горка былі выселены з прычыны стварэньня



на іх месцы вайсковага палігона (7). Таксама, па некаторых зьвестках, вядома, што 28 жніўня 1514 г., на рацэ Бобр, недалёка ад Шырнавіч (фота №8) адбыўся бой паміж нашым войскам на чале з гетманам ВКЛ Канстанцінам Астроскім і маскоўскімі атрадамі ваяводы Івана Чалядніна, што ўцякалі на Ўсход (8). А празь некалькі дзён, 8 верасьня, на Крапівеньскім полі пад Воршай 30-ці тысячнае войска ВКЛ да званьня разьбіла 80-ці тысячную армію маскоўцаў, пабраўшы ў палон іх ваяводаў. Імя Князя Канстанціна Астроскага ўславіла ўся краіна – ад Вялікага Князя да сялянаў.




Фота №8

МОГІЛКІ БЫЛОЙ ВЁСКІ ШЫРНАВІЧЫ

Адпачнулі й папалуднавалі мы на прыгожым беразе ракі Бобр, якая ў гэтым месцы (ля былой вёскі Шырнавічы) вельмі маляўнічая й кручастая. Пошук могілак распачынаем пра-

ма ад берага ракі, у старым лесе. Праз пэўны час перад намі адкрываецца відовішча, даўно забытага людзьмі й парослага хмызьняком, могільніка (мал. №9). Сярод лесу, у цішы, пад старымі хвоямі й дубамі стаяць каменныя крыжы й надмагільныя ка[illegible]ічні... Памеры могілак: 60 [illegible] 0 мэтраў. Абсьледуем [illegible]ь могільнічік і, з жалем [illegible]рцы, [illegible]ным некалькі [illegible]рытых магілаў, – так [illegible]ныя «скарбашукальнікі», а насамрэч вандалы-бязбожнікі ўжо дабраліся й сюды... Складаем плян могільніка, замалёўваем самыя цікавыя камяні й прамалёўваем цікавыя выявы. Усяго мы налічылі 230 надмагільных камянёў і 3 каменных крыжы. Апошнія пахаваньні на могілках рабіліся яшчэ ў 50-х гадох XX ст., – ва ўсходняй частцы могільніка знаходзяцца тры магілы сучаснага тыпу, а на адной зь іх стаіць звычайны мэталічны крыж, зроблены з вадаправодных рураў і пафарбаваны ў блакітны колер. Акрамя Шырнавіч тут таксама хаваліся суседнія вёскі Слоўч і Красная горка.


Мал.9.



Намі было знойдзена 8 выяваў, зь якіх 5 – на камянях, а 3 — на каменных крыжах (мал. №10). Цікавай зьяўляецца выява на малюнку №10-а – перакладзіна крыжа па канцох мае завостраную форму, што пакуль ня мае аналягаў на Крупшчыне (фота №9 і №10). На ім выбіты праваслаўны крыж, ніжняя касая перакладзіна якога, як і на выяве на мал. №10-г, памылкова нахілена ўлева, а ня ўправа. Гэта вельмі распаўсюджаная зьява ня толькі на Крупшчыне, але й ва ўсёй краіне. Таксама цікавым зьяўляецца крыж на мал. №10-б, – вышыня яго 140 см., шырыня ў перакрыжаваньні –100 см., а таўшчыня – 25 см. Па сваёй форме ён ня мае пакуль паўтораў на Крупшчыне (фота №11). Гэты крыж зроблены з так званага «гнілога каменя» – чырвонага граніту «рапаківі». Пасярод могільніка ўзвышаецца насып вышынёй каля 60 см., і ў дыямэтры каля 4,5 мэтраў, вельмі падобны на курган.

Скончыўшы свае дасьледаваньні і ўзрадаваныя сваімі знаходкамі й адкрыцьцямі, але ўзрушаныя бязбожнымі

Мал.10.



ўчынкамі вандалаў, мы прачыталі «Ойча наш» на ўскрайку могілак і пачалі зьбірацца дадому. На запыленых і стомленых роварах мы рушым у Крупкі. Вандроўка скончана...

ЛІТАРАТУРА:

(1), (2). Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Крупскага раёна. – Мн: Беларуская Энцыклапедыя, 1999, с.26; 32.

(3). Сигизмунд Герберштейн: Записки о Московии. Издательство Московского университета, 1988, с.240.

(4). Драчук В.С.: Дорогами тысячелетий. – М: Молодая гвардия, 1977, с.195 – 196.

(5). Соболев А.Н.: Мифология славян. Загробный мир по древнерусским представлениям. – Спб.: Лань, 2000, с.96.

(6). Архіў харугвы скаўтаў Малога Палесься (захавальнік Аляхновіч А.П.). Тэчка: Легенды й паданьні Крупшчыны.


(7). Архіў харугвы скаўтаў Малога Палесься (...). Тэчка: Крупшчына ў часы ВКЛ.

(8). Спадчына: часопіс. – Мн, 1992, №6, с.4.



Фота №9

Мапа вялапаходу



Фота №10





Фота №11

КАСТРЫЧНІЦКАЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ І ГРАМАДЗЯНСКАЯ ВАЙНА Ў РАСІІ

МЭТОДЫКА. ВОПЫТ

Яніна Пушкіна

XI КЛАС

Урок-дыскусія з элементамі спектакля. Працягласць – дзве гадзіны.

Як паказвае вопыт, вучням цяжка ўявіць альтэрнатыўныя шляхі развіцця грамадства, гэтыя тэмы ўспрымаюцца імі аднабакова. Дыскусія з інсцэніроўкай гістарычных асоб робіць магчымым выявіць сутнасць рэвалюцыйных падзей у Расійскай імперыі на пачатку XX ст., дапамагае вырашыць і такія дыдактычныя задачы, як сістэматызацыя, замацаванне і абагульненне атрыманых раней ведаў. Некаторыя вучні не могуць вызначыць характар першай ці наступных за ёй рэвалюцый. У выніку дыскусіі ўсе вучні больш глыбока зразумеюць такія паняцці, як «непазбежнасць» і «выпадковасць» у гістарычным працэсе, ролю асобы ў гісторыі.

У гэтай дыскусіі імітуецца абмен думкамі паміж гістарычнымі асобамі першай чвэрці XX ст., якія выказваюць сваё стаўленне да рэвалюцый. Вучні выступаюць у ролі наступных гістарычных асоб:

1) Мікалай II, імператар Расійскай імперыі;

2) Раман Мар'ян Аляксандравіч Скірмунт, памешчык, беларускі шляхціц;

3) Міхаіл Іванавіч Цярэшчанка, капіталіст, беспартыйны;

4) Павел Мікалаевіч Мілюкоў, гісторык, старшыня ЦК Канстытуцыйна-дэмакратычнай партыі, дэпутат Дзяржаўнай думы;

5) Аляксандр Іванавіч Гучкоў, акцябрыст, старшыня III Дзяржаўнай думы (1910 – 1911 гг.);

6) Пётр Аркадзьевіч Сталыпін, рэфарматар, старшыня Савета міністраў Расійскай імперыі (1906 – 1911 гг.);

7) Лаўр Георгіевіч Карнілаў, генерал;

8) Аляксандр Фёдаравіч Керанскі, сацыяліст-рэвалюцыянер, старшыня Часовага ўрада Расійскай рэспублікі;

9) Уладзімір Ільіч Ульянаў (Ленін), рэвалюцыянер-бальшавік, старшыня Саўнаркама Савецкай Расіі;

10. Мікалай Мікалаевіч Суханаў (Гімер), рэвалюцыянер-меншавік;

11) Леў Давыдавіч Троцкі (Лейба

Пушкіна Яніна *нарадзілася ў в.Аталезь Стаўбцоўскага раёна. Закончыла Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя М.Горкага. Працавала настаўніцай у Аталезскай і Новасвержанскай сярэдніх школах Стаўбцоўскага раёна. Цяпер выкладае гісторыю ў крупскай СШ №3. Кіраўнічка скаўцкай адзінкі харугвы скаўтаў Малога Палесься.*



Бранштэйн), наркам па ваенных і марскіх справах, старшыня РВСР;

12) Міхаіл Афанасьевіч Булгакаў, пісьменнік;

13) Сяляне, рабочыя, салдаты (адвольныя ролі могуць быць калектыўнымі).

Ролі рабочага, салдата і селяніна прапаноўваецца дапрацаваць вучням самастойна. Астатнія вучні выконваюць ролю нешчадкаў.

Мэта кожнага ўдзельніка дыскусіі: [illegible]азаць сваё стаўленне да рэвалюцыі, адказаць на пытанні.

Кожны ўдзельнік дыскусіі выказвае свае палітычныя погляды на развіццё грамадства, якія стараецца абгрунтаваць і прапанаваць у якасці аптымальных. Іх погляды часткова альбо цалкам не супадаюць.

Падрыхтоўка да дыскусіі пачынаецца прыкладна за два тыдні да правядзення гэтага занятку. Кожны вучань абавязаны засвоіць праграмны матэрыял і азнаёміцца з біяграфіяй свайго героя, з яго стаўленнем да рэвалюцыі, яго палітычнымі поглядамі ці поглядамі яго партыі. Ролі размяркоўваюцца за два тыдні ў адпаведнасці з сімпатыямі вучняў.

Для ўрока патрэбны імянныя таблічкі, якія будуць стаяць насупраць кожнага ўдзельніка дыскусіі. Гэта можа быць складзены папалам аркуш паперы, на якім будзе выразна напісана: «У.І.Ленін, бальшавік» і г. д. Перад пачаткам урока гучыць песня І.Талькова «Россия».

На дошцы напісана назва тэмы ўрока, эпіграф і праблемныя пытанні:

«Гісторыя яшчэ не змалола той мукі, з якой будзе спечаны пшанічны пірог сацыялізму». Г.В.Пляханаў.

«Ці можна было пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі пазбегнуць грамадзянскай вайны?».


Таксама намалявана схема, якая будзе выконваць функцыю зрокавай апоры (гл. схему).

За сталы, расстаўленыя ў выглядзе літары «П», садзяцца ўдзельнікі дыскусіі, кожны – на сваё месца. На сталах пастаўлены імянныя таблічкі. Астатнія вучні займаюць месцы ў класе.

Настаўнік. Сёння вы знаходзіцеся ў незвычайным становішчы. За адным сталом сабраліся розныя людзі. У кожнага з вас свой погляд на падзеі, якія будзем абмяркоўваць. Вы можаце адкрыта іх выказаць і задаць пытанне. У Расіі адбыліся тры рэвалюцыі: дзве буржуазна-дэмакратычныя – 1905 – 1907 гг. і Лютаўская 1917 г., сацыялістычная – Кастрычніцкая, а таксама грамадзянская вайна. У краіне звергнуты царызм, і да ўлады прыйшлі бальшавікі. У грамадзянскай вайне Чырвоная Армія перамагла. У выніку лёсы мільёнаў людзей былі зламаны. Народы Расіі напаткала трагічная драма, якая не скончылася і сёння. Ці была альтэрнатыва кастрычніцкаму перавароту? У класе прысутнічаюць «гіста-

Схема

Змены форм палітычнага ладу ў выніку рэвалюцыйных падзей у Расіі (1905—1918 гг.)



рычныя асобы» і прадстаўнікі сучаснага пакалення. Вучні зададуць пытанні ўдзельнікам дыскусіі.

Аб'яўляюцца парадак правядзення дыскусіі і яе правілы.

Правілы дыскусіі. Удзельнікі дыскусіі прадстаўляюць сябе (не больш за тры хвіліны). Выступленні павінны быць кароткія, змястоўныя і яскравыя. Пачынае Мікалай II і гэтак далей па чарзе. Перабіваць выступоўцу забараняецца. Кожны з удзельнікаў адказвае на галоўнае пытанне гульні.

Калі ў сваім прадстаўленні «гістарычная асоба» не адказала на галоўнае пытанне, яно ставіцца ёй зноў. Затым кожная з «гістарычных асоб» па чарзе задае па тэме па аднаму пытанню любому з удзельнікаў. Потым «гістарычным асобам» задаюць свае пытанні школьнікі (але не больш за адно ад вучня). Забараняецца пераўтвараць працэдуру «пытанне – адказ» у дыспут-спрэчку. Рэкамендуецца перад тым як задаць пытанне, папярэдне яго правільна сфармуляваць пісьмова.

У ходзе дыскусіі ацэньваюцца ўменне аргументавана выступіць, лагічна адказаць на пытанні. Асобна могуць ацэньвацца і пытанні, калі яны зададзены ўмела, знаходліва, арыгінальна, ставяць праблему перад «гістарычнымі асобамі».

Прадстаўленне кожнага адбываецца па ходу гадзінікавай стрэлкі пачынаючы ад Мікалая II. Ён прадстаўляецца сам ці яго, напрыклад, прадстаўляе яго асістэнт.

Расійскі імператар Мікалай II. Мікалай II – апошні імператар Расійскай імперыі. На трон уступіў 2 лістапада 1894 г. Ён лёгка паддаваўся чужым уплывам. Меў выдатную памяць, свабодна валодаў нямецкай, французскай і англійскай мовамі, вельмі добра ездзіў на кані, грацыёзна танцаваў і быў выдатны стралок. Імператар вельмі раўніва ставіўся да любой буйной асобы сярод сваіх міністраў. Але разам з тым ён быў чалавек далікатны і міралюбівы. У пытаннях знешняй палітыкі быў надзвычай адчувальны да ўсяго, што закранала прэстыж Расіі – краіны, веліч і дабрабыт якой ён павінен быў адстойваць і захоўваць. Быў веруючы чалавек, добры сем'янін. Пакутніцкую смерць прыняў вельмі спакойна.

Далей ідуць прыкладныя прамовы ўдзельнікаў дыскусіі пра сваіх герояў.

Павел Мікалаевіч Мілюкоў. Нарадзіўся я ў 1859 г. у Маскве. Мой бацька быў прафесар архітэктуры. Калі я скончыў гімназію, адпрасіўся ў бацькоў на руска-турэцкую вайну. Служыў у санітарным атрадзе на Закаўказскім фронце. Вярнуўшыся ў Маскву, паступіў на гісторыка-філалагічны факультэт універсітэта, але мяне з яго выключылі за ўдзел у студэнцкіх хваляваннях. Аднак у 1882 г. я скончыў універсітэт. Мая дысертацыя, прысвечаная дзяржаўнай гаспадарцы пры Пятру I, была дастаткова грунтоўная. Мне нават хацелі прысвоіць ступень доктара навук. У 1895 г. я, будучы ўжо прыват-дацэнтам Маскоўскага універсітэта, за ўдзел у І з'ездзе студэнтаў быў высланы на 2 гады ў Разань. А пазней адсядзеў 3 месяцы ў турме, але ад сваіх перакананняў не адмовіўся. Я выступаю за парламент з заканадаўчымі функцыямі, за свабоду слова, сходаў, друку, сумлення, недатыкальнасць асобы і жылля, роўнасць у правах нацый і саслоўяў. Рэформы я разглядаю як сродак прадухілення рэвалюцыі. Як кіраўнік Канстытуцыйна-дэмакратычнай партыі выступаю за канстытуцыйны лад. Я праціўнік як Лютаўскай, так і Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года.

Аляксандр Іванавіч Гучкоў. Я ўзначальваю партыю акцябрыстаў. Яна была заснавана ў 1905 г. Крыху пра сябе. Я ўнук прыгоннага селяніна. На-

радзіўся ў 1862 г. у стараверскай купецкай сям'і. У час англа-бурскай вайны паехаў ваяваць у Афрыку супраць англічан і трапіў у палон. Затым вярнуўся ў Еўропу. Прымаў удзел у Македонскім паўстанні ў 1885 г. Скончыў Маскоўскі універсітэт, працягваў адукацыю ў Берлінскім, Цюбінгенскім і Венскім універсітэтах. У Расіі займаўся фінансавай дзейнасцю ў якасці дырэктара Маскоўскага ўліковага банка. У час рускаяпонскай вайны быў у Маньчжурыі як ... легат Чырвонага Крыжа.

Платформа нашай партыі: адзіная непадзельная дзяржава ў выглядзе канстытуцыйнай манархіі, усеагульнае выбарчае права, недатыкальнасць асобы і ўласнасці, продаж зямлі сялянам, мясцовае самакіраванне. Мы катэгарычна супраць любой рэвалюцыі.

Міхаіл Афанасьевіч Булгакаў. Нарадзіўся я ў 1891 г. у сям'і багаслова. Бацька не хацеў, каб яго першынец стаў святаром. Праз два гады пасля смерці бацькі, у 18 гадоў, я стаў студэнтам медыцынскага факультэта Кіеўскага універсітэта. У 1916 г. з дыпломам лекара я працаваў у франтавым шпіталі на Украіне, а потым – павятовым доктарам у Смаленскай губерні. Працу сваю вельмі люблю.

Пасля кастрычніцкіх падзей 1917 г. вярнуўся ў Кіеў. Быў сведкам крывавых падзей у горадзе. Іх чынілі і нямецкія акупацыйныя ўлады, і белагвардзейцы, і пятлюраўцы. Хто толькі не мабілізоўваў мяне і ад каго толькі я не ўцякаў! Пры Савецкай уладзе я заставаўся доктарам і пачаў пісаць. Нельга сказаць, што я цалкам салідарны з бальшавікамі, але мае раманы «Белая гвардыя» і «Бег» – мастацкае адлюстраванне таго, што я бачыў. Цэнтральная тэма маіх твораў – гэта барацьба дабра і зла.

Лаўр Георгіевіч Карнілаў. Нарадзіўся я ў 1870 г. у Казахстане. У 28 гадоў скончыў Акадэмію Генштаба. Ведаю некалькі ўсходніх моў, маю навуковыя працы. Першую сусветную вайну пачаў на Паўднёва-Заходнім фронце камандзірам брыгады, камандаваў дывізіяй. Прайшоў шлях ад юнкера артылерыйскага вучылішча да галоўнакамандуючага войскамі Расійскай імперыі. Заўсёды смела ішоў наперад. Думаю, што гэта і прыцягвае да мяне людскія сэрцы. Мне даводзілася караць салдат за непакорлівасць нават смерцю. Яшчэ мяне называюць «кадэцкім Напалеонам». Я прыхільнік моцнай улады.

Пётр Аркадзьевіч Сталыпін. Я паходжу з вядомага памешчыцкага роду. Мой бацька ўдзельнічаў у Крымскай вайне, сябраваў з Львом Талстым, быў прыбліжаным імператара Аляксандра II. Ад пачатку першай рэвалюцыі паспяхова змагаюся з рэвалюцыйным рухам і тэрорам. Спачатку быў гродзенскім, затым саратаўскім губернатарам, але мяне заўважылі, і з 1906 г. я пачаў займаць вышэйшыя дзяржаўныя пасады. Спачатку стаў міністрам унутраных спраў, а праз два месяцы ўзначаліў урад. Сваёй галоўнай задачай бачу навядзенне ў краіне парадку няхай і жорсткім метадам. Для таго каб прадухіліць далейшае развіццё рэвалюцыі, неабходна правесці шэраг буржуазных рэформ, найперш аграрную. Мяне не любяць рэвалюцыянеры, шмат разоў яны хацелі пазбавіць мяне жыцця, аднаго разу нават узарвалі мой дом у той час, калі я вёў прыём наведвальнікаў. Загінулі 27 чалавек і 32 былі паранены, у тым ліку мой трохгадовы сын і чатырнаццацігадовая дачка. За што загінулі людзі? У чым віна маіх дзяцей?

Аляксандр Фёдаравіч Керанскі. Я закончыў тую ж Сімбірскую гімназію, што і У.І.Ульянаў. А мой бацька быў дырэктар той гімназіі. У першым складзе Часовага ўрада я стаў

міністрам юстыцыі, пасля ліпеньскіх падзей 1917 г. – старшынёй і ваенным міністрам урада. Я прадстаўляю інтарэсы сацыялістаў-рэвалюцыянераў. Я шмат у чым не згодны з бальшавікамі, хоць таксама з'яўляюся рэвалюцыянерам. Мы – за дэмакратычную рэспубліку, за ўсеагульнае выбарчае права, перадачу зямлі ў грамадскую ўласнасць, нацыянальнае самавызначэнне. Пасля прыходу да ўлады бальшавікоў я вымушаны быў эмігрыраваць у ЗША, дзе выкладаў у шэрагу універсітэтаў, напісаў ненадрукаваную гісторыю Расіі. У час Вялікай Айчыннай вайны адстойваў інтарэсы Расіі і арганізаваў збор прадуктаў для насельніцтва СССР.

Мікалай Мікалаевіч Суханаў. Па сваіх перакананнях я меншавік. Нарадзіўся ў Маскве. Бацька быў чыгуначнік, але спіўся і хутка памёр. Так што я не ведаў, што такое сям'я. Выхоўвала мяне пераважна бабуля. Калі мне было 14 гадоў, маю маці па гучнай справе пасадзілі ў турму (гэта стала матэрыялам для напісання Львом Талстым драмы «Жывы труп»). Я стаў зарабляць урокамі, працаваў шмат і недахопу ў сродках не меў. Паступіў ва універсітэт, зблізіўся з рэвалюцыянерамі. Займаўся аграрным пытаннем, напісаў шэраг прац. Быў і ў турме, і ў ссылцы. Пры Савецкай уладзе працаваў пераважна эканамістам і рэдактарам перыядычных выданняў. Напісаў 7 тамоў «Нататак аб рэвалюцыі», кнігу «Аб сусветнай гаспадарцы». У 1930-я гг. быў рэпрэсіраваны Савецкай уладай як кіраўнік падпольнай арганізацыі меншавікоў.

Уладзімір Ільіч Ульянаў (Ленін). Пад маім кіраўніцтвам бальшавікі здзейснілі ў кастрычніку 1917 г. пераварот і потым яго назвалі Кастрычніцкай рэвалюцыяй. Маімі настольнымі кнігамі былі творы Маркса і Энгельса. Тое, пра што марылі мае настаўнікі, сталася рэальнасцю. Дзеля гэтага я прыклаў усю сваю волю і розум. Стаўшы на чале савецкага ўрада, я дамогся вынікаў, якія мелі лёсавызначальнае значэнне для ўсёй гісторыі XX ст. Упершыню ў гісторыі бальшавікі пабудавалі дзяржаву для працоўных. Уся ўласнасць стала грамадскай, назаўсёды было пакончана з класам эксплуататараў. Жорсткія ўмовы вымагалі жорсткіх метадаў. Толькі дыктатура пралетарыяту на чале з бальшавіцкай партыяй магла захаваць Савецкую ўладу. Мы выйшлі пераможцамі з грамадзянскай вайны, перамаглі васнную інтэрвенцыю. Я стварыў СССР, выпрацаваў асновы эканамічнай і культурнай палітыкі савецкага ўрада. Царква была аддзелена ад дзяржавы і ад школы. Мы стварылі новую ідэалогію.

Леў Давыдавіч Троцкі. Нарадзіўся я ў 1879 г. на хутары Янаўка Херсонскай губерні. Маці была пісьменная, а бацька малапісьменны прадпрымальнік і энергічны земляроб. Толькі пасля рэвалюцыі ён навучыўся чытаць і мог прачытаць загалоўкі маіх кніг. Бацька купіў у памешчыка Яноўскага 100 дзесяцін зямлі і яшчэ 200 дзесяцін узяў у суседніх памешчыкаў у арэнду. У нас быў свой паравы млын, майстэрня. У нашай сям'і было 8 дзяцей, засталіся чацвёра.

Арыштаваны быў першы раз праз год пасля заканчэння сярэдняй школы. Універсітэтамі служылі для мяне, як для многіх маіх аднагодкаў, турма, ссылка, эміграцыя. У царскіх турмах я сядзеў каля 4 гадоў. У ссылцы правёў каля 2 гадоў. Два разы ўцякаў з Сібіры. У эміграцыі жыў каля 12 гадоў у розных краінах Еўропы і Амерыкі. У першую сусветную вайну быў завочна прысуджаны да турэмнага зняволення ў Германіі (1915 г.), у наступным годзе быў высланы з Францыі ў Іспанію, а затым у Амерыку. Там мяне застала Лютаўская рэвалюцыя ў Расіі. Па да-

розе з Нью-Йорка быў у сакавіку 1917 г. арыштаваны англічанамі і знаходзіўся месяц у канцэнтрацыйным лагеры ў Канадзе.

Я ўдзельнічаў у рэвалюцыі 1905 і 1917 гг., быў старшынёй Петраградскага Савета дэпутатаў у 1905 і затым у 1917 г. Прымаў непасрэдны ўдзел у кастрычніцкім перавароце, быў членам урада. У якасці народнага камісара па замежных справах вёў мірныя перагаворы ў Брэст-Літоўску з дэлегацыямі Германіі, Аўстра-Венгрыі, Турцыі і Балгарыі. Каля 5 гадоў займаўся арганізацыяй Чырвонай Арміі.

Галоўным зместам майго жыцця, за вылікам гадоў грамадзянскай вайны, складала партыйная і пісьменніцкая дзейнасць. Дзяржаўнае выдавецтва ў 1923 г. пачало друкаваць мае творы. Яно паспела выдаць 13 кніг. Выданне было спынена ў 1927 г., калі пачаліся жорсткія ганенні супраць «трацкізму».

Я люблю і цаню дысцыпліну і сістэму ў рабоце, не выношу беспарадку і разбурэння.

Міхаіл Іванавіч Цярэшчанка. Нарадзіўся я ў 1887 г. Па адукацыі юрыст. Вядомы ў Расіі масон, буйны прамысловец і фінансіст. У 1915 – 1917 гг. займаў пасаду таварыша (намесніка) старшыні Усерасійскага ваенна-прамысловага камітэта. Удзельнічаў у 1916 – 1917 гг. у падрыхтоўцы палацавага перавароту, каб адхіліць ад улады цара Мікалая II. Мне было 30 гадоў, калі я ў Часовым урадзе займаў пасады спачатку міністра фінансаў, а потым – з мая па кастрычнік – міністра замежных спраў. З восені 1917 г. да вясны 1918 г. быў рэпрэсіраваны чэкістамі. Затым жыў у эміграцыі і дапамагаў грашыма беламу руху.

Раман Мар'ян Аляксандравіч Скірмунт. Нарадзіўся я ў 1868 г. у Парэччы на Піншчыне. Мой дзед і бацька былі слынныя памешчыкі-прадпрымальнікі. Праз іх Парэчча стала адным з эканамічных цэнтраў Палесся. Па спадчыне яно адышло мне.

На пачатку XX ст. я пачаў удзельнічаць у палітычным жыцці краіны. Быў абраны дэпутатам у I Дзяржаўную думу ад Меншчыны. У Думе я рашуча выступаў супраць ліквідацыі памешчыцкага землеўладання, бо перадача зямлі ў дзяржаўную ўласнасць зробіць яе гаспадаром не селяніна, а чыноўніка. Ад гэтага прайграюць усе, акрамя апошняга. Але я не вораг сялянам, я за тое, каб селянін станавіўся землеўладальнікам.

Я ніколі не быў канфармістам, напэўна, я прыроджаны баец. Аднойчы ў жніўні 1917 г., калі я прысутнічаў на нарадзе ў Маскве, адбылося наступнае. Яе ўдзельнікі крытыкавалі Часовы ўрад і ўзняліся з месцаў, калі ў залу ўвайшоў генерал Карнілаў. Я, у афіцэрскай форме, застаўся сядзець у першых шэрагах, бо быў праціўнік дыктатуры генерала Карнілава і не збіраўся гэтага хаваць нават на сходзе прыхільнікаў генерала.

У нацыянальным пытанні выступаю за роўнасць народаў і развіццё іх нацыянальных культур. У сакавіку 1917 г. узначаліў Беларускі нацыянальны камітэт. Быў, бадай, першым прыхільнікам барацьбы за дзяржаўны суверэнітэт Беларусі. У палітычнай дзейнасці я шукаў не ворагаў, а сяброў, хацеў яднаць усе палітычныя сілы Беларусі. Перакананы нават арыстакратаў супрацоўнічаць з сацыялістамі ў БНК. На Беларускую Народную Рэспубліку працавалі сацыялісты і магнаты, нават Радзівілы і Сапегі. Аднак, на жаль, супрацоўнічаць адмовіліся сацыялісты. Я таксама быў прыхільнік беларусізацыі. Фінансава падтрымліваў «Нашу Ніву». Са сваёй сястрой Канстанцыяй, якая пісала кнігі па беларускай гісторыі, склаў лемантар на мясцовай гаворцы.

Працаваў над слоўнікам беларускай мовы, а таксама пісаў вершы па-беларуску. На чале ўрада БНР улетку 1918 г. актыўна працаваў для міжнароднага прызнання Беларускай Рэспублікі. Я таксама не быў папулістам і ніколі не падманваў людзей абяцанкамі. Калі да ўлады прыйшлі бальшавікі, я зразумеў, што пад чырвонымі сцягамі адраджаецца яшчэ больш бязлітасная імперыя.

Настаўнік. Пасля знаёмства з «гістарычнымі асобамі», з іх біяграфічнымі звесткамі, прыступаем да разгляду галоўнага пытання: «Ці можна было прадухіліць грамадзянскую вайну?».

Мікалай II. Так, напэўна, усё было ў маіх руках... Прызнаюся шчыра, напачатку мяне абураў мяцежны дух маіх падданых. Як можна паквапіцца на ўладу манарха, якая ад Бога? І гэта рабіў богабаязны праваслаўны рускі народ? Ці ведаеце, як я перажыў крывавую нядзелю, колькі пакутаў выпала на маю душу? Я раскайваюся, што з маёй згоды была расстраляна мірная дэманстрацыя. Грэх крывавай нядзелі ляжыць на мне. Развіццё сацыял-дэмакратычнага руху павінна было прымусіць мяне звярнуць увагу на патрэбы народных мас. Каб не дапусціць грамадзянскай вайны, я адмовіўся ад прастола, але, напэўна, ужо было позна. О, мой доўгацярплівы народ, я таксама пацярпеў за цябе!

Асістэнт Мікалая II. Мікалай II і царская сям'я былі расстраляны бальшавікамі ў ноч з 16 на 17 ліпеня 1918 г. у Екацярынбургу. Мікалай II залічаны да ліку праваслаўных святых на Архірэйскім саборы ў 2000 г.

П.М.Мілюкоў. Так, грамадзянскую вайну можна было прадухіліць. Прадухіліць шляхам спынення рэвалюцыі. Бо рэвалюцыя ёсць экстрэмізм. Яе я параўноўваю з канём, што нясецца ўперад, але не вязе за сабою воз. Вышэйшым палітычным прынцыпам наша партыя лічыць дэмакратыю, але не тую дэмакратыю, якая адстойвае прыярытэт класа ці мас, а дэмакратыю як гарантыю правоў асобы. Класавая дэмакратыя, а тым больш дыктатура класа вядзе да ўшчамлення правоў і свабод іншых слаёў насельніцтва. Паміж імі непазбежна будзе саперніцтва, што вядзе да грамадзянскай вайны. Нашай краіне патрэбен мірны, рэфармісцкі шлях развіцця, удасканалення буржуазнага ладу. Неабходна было спыніцца пасля першай рускай рэвалюцыі, захаваць яе заваёвы, вырашыць зямельнае пытанне па ўзору I і II Дум і такім чынам пазбегнуць развіцця рэвалюцыі і ў далейшым грамадзянскай вайны. Памешчыкі і буржуазія атрымалі б палітычную ўладу, працоўныя – дэмакратычныя правы і свабоды, сяляне – зямлю. Краіна атрымала б магчымасць развівацца буржуазна-дэмакратычным шляхам.

А.І.Гучкоў. Грамадзянскую вайну можна было прадухіліць, калі б цар не адабраў назад заваёвы першай рускай рэвалюцыі. Мы цалкам былі згодныя з Маніфестам 17 кастрычніка 1905 г. Калі б цар гарантаваў дараваныя правы, працоўны народ не пайшоў бы за бальшавікамі, спыніўся б рэвалюцыйны рух і не ўспыхнула б грамадзянская вайна. Амаль ніхто не быў бы ўшчэмлены. Цар захоўвае сваю ўладу, памешчыцкае землеўладанне не ліквідуецца, буржуазія атрымлівае права кіраваць дзяржавай і развіваць капіталістычную гаспадарку, сяляне выкупляюць адведзеныя ім землі, саслоўі ўраўноўваюцца ў правах, працоўны народ удзельнічае ў выбарах і мае магчымасць мірным парламенцкім шляхам вырашаць свае пытанні. Шырока існуюць дэмакратычныя свабоды. Навошта рэвалюцыя? На гэтым этапе царызм вінаваты ў тым, што рэвалюцыя не была спынена. Я супраць удзелу неадказных людзей у

вырашэнні дзяржаўных спраў, я за ўрад, які адказны перад народнымі выбраннікамі.

П.А.Сталыпін. Калі ў 1907 г. пачынаў аграрную рэформу, я сказаў: «Дайце мне 20 мірных гадоў і вы не пазнаеце Расію!». Менавіта гэта рэформа магла выратаваць дзяржаву ад будучых катаклізмаў, у тым ліку і ад грамадзянскай вайны. Менавіта таму так жорстка я і змагаўся з рэвалюцыйным рухам. Неўтаймаванасць рэвалюцыйна настроеных мас перашкаджала ажыццяўленню перамен. Мне неабходна было абясшкодзіць актыўных рэвалюцыянераў, каб яны не падбухторвалі працоўных на рэвалюцыю. Ліберальі прапануюць вырашыць аграрнае пытанне, як гэта некалі збіраліся зрабіць I і II Думы. Так, сяляне атрымалі б зямлю ў прыватнае карыстанне. А ці падумалі Вы, спадар Мілюкоў, як бы адрэагавалі на прымусовае адчужэнне зямлі памешчыкі? Тут ужо б яны паднялі сапраўдную рэвалюцыю. Нельга было так радыкальна абыходзіцца з памешчыкамі. Ды і праблема ўся не ў захаванні памешчыцкага землеўладання, а ў захаванні сельскай абшчыны. Вось чаму рэформа прадугледжвала разбурэнне сельскай абшчыны. Гэта прывяло б да развіцця сельскай гаспадаркі па прускаму шляху: захавалася б і памешчыцкае землеўладанне, і сяляне сталі б гаспадарыць на сваіх хутарах-фермах па-капіталістычнаму. Мне б 20 мірных гадоў!

Р.А.Скірмунт. Грамадзянскай вайны можна было пазбегнуць толькі шляхам супрацоўніцтва і прымірэння ліберальў і сацыял-дэмакратаў у супрацьстаянні адзінаму працоўніку – бальшавікам. Але шмат было рознагалосся ў гэтых палітычных сілах, і ўсе яны недаацэньвалі небяспеку бальшавіцкай ідэалогіі. Бальшавікі прапануюць простыя спосабы вырашэння набалелых пытанняў. І ва ўмовах нерашучасці Часовага ўрада народ падтрымаў бальшавіцкі лозунг «Міру, зямлі, хлеба!». Народ не прайшоў школы сапраўднага парламентарызму, у дзяржаве не паспела скласціся грамадзянская супольнасць. Усё гэта прадвызначыла гістарычны лёс Расійскай імперыі.

Л.Г.Карнілаў. Грамадзянскую вайну можна было прадухіліць, толькі расправіўшыся з бальшавікамі. Я павінен быў выканаць асаблівую місію ў справе выратавання Айчыны ад чумы бальшавізму, улічваючы тое, што ідэалогія іх такая блізкая і зразумелая натоўпу. Я разглядаю дыктатуру пралетарыяту як катастрофу.

Пытанне стаіць рубам: альбо ўлада ваенная, альбо дыктатура пралетарыяту. Жалезам і крывёю патрэбна было пакончыць з бальшавізмам. Мая спроба ўсталяваць парадак удалася б, каб не здрадзіў спадар Керанскі. Ён і яго прыхільнікі перайшлі на другі бок барыкад. Каб не гэта, мы не зведалі б ні дыктатуры бальшавікоў, ні грамадзянскай вайны!

А.Ф.Керанскі. Нам, Часоваму ўраду, пасля перамогі Лютаўскай рэвалюцыі неабходна было дзейнічаць больш аператыўна і рашуча. Мы адцягвалі скліканне Устаноўчага сходу, бо на аснове ўсеагульнага выбарчага права ў абставінах палітычнай неадукаванасці мас прагрэсіўныя сілы маглі прайграць. Чым больш мы марудзілі, тым больш народныя масы расчароўваліся ва ўрадзе і тым больш людзей станавілася прыхільнікамі бальшавікоў, якія абяцалі народу мір, зямлю і хлеб. Патрэбна было найхутчэй склікаць Устаноўчы сход, магчыма, мы не набралі б большасці галасоў, але гэты сход быў бы больш законны і справядлівы, чым той урад, які стварылі бальшавікі.

Нявырашанасць зямельнага пытання ўзмацняла нашу бездапаможнасць.

Але вырашыць гэта пытанне мог толькі Устаноўчы сход, надзелены заканадаўчымі функцыямі. Гэтак жа, як і пытанне аб міры. А ў народа скончылася цярпенне.

Была яшчэ адна магчымасць прадухіліць кастрычніцкі ваенны пераварот, а значыць і грамадзянскую вайну. 24 кастрычніка 1917 г., напярэдадні пераваротy, Прадпарламент запатрабаваў ад Часовага ўрада перадаць зямлю сялянам і пачаць мірныя перагаворы з германскім блокам. Гэта была магчымасць затармазіць рэвалюцыю, але я адмовіўся... Аб чым цяпер шкадую.

М.М.Суханаў. Грамадзянская вайна – гэта вынік нашай непрадбачлівасці. Мы недаацанілі Леніна і бальшавікоў. А яны заваявалі сімпатыі простых людзей. Рабочы Расіі па сваёй культуры і свядомасці далёка саступае шараговаму заходнееўрапейскаму рабочаму. Палітычнае развіццё салдат таксама знаходзіцца на нізкім узроўні. Вось яны і паверылі бальшавіцкай прапагандзе.

На II з'ездзе Саветаў наш паплечнік Ю.Мартаў заклікаў стварыць агульнадэмакратычны ўрад з прадстаўнікоў усіх сацыялістычных партый. Але большасць Саветаў выказалася супраць. Троцкі адправіў нас «на сметнік гісторыі». У знак пратэсту меншавікі і правыя эсэры пакінулі II з'езд і тым самым развязалі рукі бальшавікам, зрабіўшы іх сапраўднымі гаспадарамі становішча, саступіўшы ім цалкам усю арэну рэвалюцыі. Мы сваімі рукамі аддалі бальшавікам манаполію над Саветамі, над масамі, над рэвалюцыяй. Па сваёй неразумнай волі мы забяспечылі перамогу «лініі Леніна». Так быў закладзены пачатак аднапартыйнасці і ў выніку – грамадзянскай вайны.

М.І.Цярэшчанка. Капіталісты – гэта энергічныя людзі, людзі справы. Ад нашых капіталаў залежыць развіццё прамысловасці, транспарту, сувязі. Такім чынам, мы рухаем прагрэс у эканоміцы. І заводы, і чыгункі ў Расіі будаваліся на нашы грошы.

Нашым дэвізам з'яўляецца свабода чалавека, свабода прадпрымальнасці і дэмакратыя. Мы не ва ўсім згодны з расійскім самадзяржаўем. Палітыка Керанскага нас задавальняла больш. Мы нікога не прымушаем працаваць. Чалавек сам павінен знайсці для сябе месца ў грамадстве і сваю працу.

Нас бальшавікі абвінавачваюць, што мы эксплуататары. Але мы самі працуем, кіруем вытворчасцю і вельмі рызыкуем, каб не разарыцца. Бальшавікі прыйшлі да ўлады шляхам ваеннага захопу ўлады і пад папулісцкімі лозунгамі «Мір – народам», «Зямля – сялянам», «Фабрыкі і заводы – рабочым». Сапраўды, бальшавіцкі ўрад на чале з Леніным вайну з Германіяй спыніў, але па віне бальшавікоў была распачата грамадзянская вайна, бо яны не пагадзіліся аддаць уладу Устаноўчаму сходу. Зямлю сяляне атрымалі толькі ў часовае карыстанне, а затым іх прымусілі ўступіць у калгас. Рабочы кантроль на фабрыках і заводах быў толькі часовым, а фабрычна-заводскія камітэты ў Савецкім Саюзе знаходзіліся пад кантролем дзяржаўных органаў. Фабрыкі і заводы належалі дзяржаве, а не рабочым.

У.І.Ленін. Грамадзянскую вайну выклікаў разгон Устаноўчага сходу. Каб мы пакінулі Устаноўчы сход як заканадаўчы орган дзяржавы, ніякай вайны б не было. Але хіба маглі мы, заваяваўшы ўладу, падзяліцца ёй ці аддаць яе іншым палітычным сілам? Не! Такі шанц выпаў, бадай, упершыню ў гісторыі – захапіць уладу ў свае рукі і пачаць Будаўніцтва сацыялістычнай рэспублікі. Усім асатнім палітычным партыям мы і сапраўды прапануем ад-

правіцца на сметнік гісторыі. Народ стаміўся ад доўгіх і пустых абяцанняў і нерашучасці ўлад. Ён чакаў практычных спраў. Усім патрэбен мір, сялянам – зямля, рабочым – фабрыкі і заводы. Усё гэта мы абяцалі і даём працоўнаму народу. Мы прыступаем да ажыццяўлення праграмы-максімум. З нашай дыктатурай павінны альбо згадзіцца, альбо – вайна. Хто не з намі, той супраць нас!

Л.Д.Троцкі. На мой погляд, нельга быць пазбоч[illegible]цуць грамадзянскай вайны. «Адкрыта кавалі волю мас на паўстанне, наша паўстанне перамагло. Цяпер нам прапануюць: адмоўцеся ад перамогі, заключыце пагадненне. З кім? Вартыя жалю адзінкі, вы – банкруты, ваша роля сыграна, ідзіце туды, дзе вам з гэтага часу належыць быць: у кошык для смецця гісторыі».

Не таму мы бралі ўладу, каб дзяліцца ёю з іншымі партыямі, а тым больш з буржуазіяй. Наша мэта, мэта бальшавікоў – сусветная рэвалюцыя, мы пра яе марылі. З гэтай нагоды Чырвоная Армія вяла савецка-польскую вайну. Войскі пад камандаваннем М.Тухачэўскага наступалі на Варшаву, а пад камандаваннем Сталіна – на Львоў. Узяць Варшаву – мара Леніна і Дзяржынскага і наша агульная стратэгічная памылка.

Вернемся да грамадзянскай вайны. У ёй я быў не проста ўдзельнік, а як народны камісар па ваенных і марскіх справах камандаваў усімі франтамі Чырвонай Арміі і флоту. Ленін даў мне поўную свабоду дзеяння. Чалавек я не ваенны, у войску не служыў, у першую сусветную вайну не ваяваў. Але скажу шчыра: баязліўцам не быў і ўмела выкарыстоўваў царскіх генералаў і афіцэраў. У Чырвонай Арміі я ўстанавіў строгую дысцыпліну. Улады ў мяне хапала. Я быў другім кіраўніком у дзяржаве пасля Леніна. Аднак я не быў авантурыстам. Мяне абвінавачваюць у зрыве перагавораў у Брэст-Літоўску. Тут маёй віны амаль што няма. Было рашэнне ўрада на такіх цяжкіх умовах мір не падпісваць. Мы спадзяваліся на сусветную рэвалюцыю і на рэвалюцыю ў Германіі. Стан паміж краінамі – ні міру, ні вайны – звычайная практыка большасці дзяржаў свету. Калі на пасяджэнні ЦК РСДРП (б) у ноч на 19 лютага 1918 г. разглядалася пытанне аб міры, я галасаваў, як і Ленін, за мір.

Настаўнік. Неабходна звярнуць вашу ўвагу на тое, якую ролю адыграў Леў Троцкі ў 1917 і ў 1918 – 1920 гг. Назва савецкага ўрада – Саўнаркам – гэта прапанова Троцкага. Роспуск Устаноўчага сходу – таксама яго прапанова. У верасні 1918 г. для агульнага кіраўніцтва ваеннымі дзеяннямі на франтах быў створаны Рэўваенсавет Рэспублікі (РВСР) пад старшынствам Л.Троцкага. Сапраўдным стваральнікам новай Рабочай Сялянскай Чырвонай Арміі (РСЧА) лічыцца Троцкі. Пра гэта Ленін гаварыў пісьменніку Максіму Горкаму.

Вы ведаеце, што пасля смерці У.Леніна Сталіну ўдалося адхіліць свайго равесніка і саперніка Троцкага ад улады і выслаць спачатку ў Алма-Ату (Казахстан), а затым за мяжу – у Турцыю.

На пачатку 1920-х гадоў Троцкага абвінавачвалі ў тым, што ён хацеў прымяніць армейскія прынцыпы для будаўніцтва сацыялізму і зрабіць прафсаюзы дзяржаўнымі. Фактычна Сталін так і зрабіў. Для кіравання эканомікай выкарыстоўваўся камандна-адміністрацыйны метад. Дзяржаўным прыдаткам як школа камунізму сталі ў Савецкім Саюзе прафсаюзы. Троцкі настойваў, каб у партыі дапускалася існаванне розных груп, фракцый. Гэты падыход быў асуджаны, і УКП(б) захавалася як адзіная маналіт[illegible]ная арганізацыя аднадумцаў, дзе панавала строгая дысцыпліна.

Троцкі – цікавы пісьменнік, умелы прамоўца, стратэг, інтэлігентны рашучы чалавек. Ён і за мяжой быў небяспечны для Сталіна. Стварыў IV Інтэрнацыянал, асуджаў Сталіна за яго вераломствы. У 1940 г. у Мексіцы Троцкага забіў агент НКУС, які за злачынства адсядзеў у турме, а пасля пераехаў у СССР і атрымаў узнагароду.

Падвядзенне вынікаў. Прапаноўваецца выказаць свае ўражанні, думкі, зрабіць высновы.

Напрыканцы ўрока можна прапанаваць вучням запоўніць анкету ўдзельніка дыскусіі. Раблю гэта для таго, каб даведацца, ці спадабалася ім інсцэніроўка, што засталося ўпушчаным з вывучанага матэрыялу, на якую тэму яны хацелі б правесці падобную дыскусію або дыспут.

Такім чынам, дыскусія з элементамі спектакля фарміруе ў вучняў уменне палітычнага мышлення, што дапаможа ім стаць актыўнымі грамадзянамі. Яна таксама дае магчымасць вучням лепш зразумець ход гістарычнага развіцця і дапаможа ім лягчэй арыентавацца ў зменлівай палітычнай сітуацыі.

ЛІТАРАТУРА ДА ЎРОКА

Жарава Л.М., Мішына І.А. Гісторыя Расіі і СССР. 1900 – 1940: Вучэбная кніга для старшых класаў сярэдніх навучальных устаноў. Мн., 1992.

Имена в истории: Краткий биографический справочник. Авт.-сост. П.Н.Бригадин и др. Мн., 1993.

Космач ГЛ., Космач Е.Н. Трагедия кумиров революции: Страницы политических биографий Н.Н.Бухарина, А.Н.Рыкова, Л.Д.Троцкого. Мн., 1994.

Сусветная гісторыя навейшага часу: Вучэбны дапаможнік для 9-га класа агульнаадукацыйнай школы з беларускай мовай навучання / Пад рэд. Г.А.Космача. Мн., 1998.

Деятели отечественной истории: Биографический словарь-справочник. В 2-х кн. М., 1997.

История Отечества в документах. 1917 – 1993: Хрестоматия для учащихся старших классов средней школы. Ч.1. Ч.2. М., 1994.

Керенский А.Ф. Россия на историческом повороте. М., 1993.

Милюков П.Н. Воспоминания. М., 1990.

Политическая история России в партиях и лицах. М., 1993.

Политические деятели России. 1917: Биографический словарь. М., 1993.

А.И.Гучков рассказывает... М., 1993.

Родзянко М.В. Крушение империи. М., 1991.

Троцкий Л. Моя жизнь: Опыт автобиографии. М., 1990.

У ІМЯ ДОГМЫ

СПАДЧЫНА

Мікола Цэлеш

Раскажу я вам, мае сябры, адну гісторыю – лёс аднае сям'і. Гэтая гісторыя кожнаму із вас, можа быць, нагадае не адну такую-ж гісторыю, у якой, так ці інакш, былі закранутыя вашыя блізкія – сваякі або сябры.

Жыў у нас на засьценку чалавек. Жыў сабе проста, гаспадаркі вялікай ня меў: шэсьць дзесяцінаў зямлі, добры конь, са тры каровы, авечкі, сьвіньні ды іншае. Адно, што можна пра яго сказаць як пра гаспадара – быў бязьмерна працавіты, ну, і хлеба не пазычаў, а меў такі-сякі лішак, так што адна дачка яго-ная навет і ў гімназыі вучылася.

Раптам (гэта было ў пачатку трыццатых гадоў) заходзіць да яго, і якраз у часе сьняданьня, старшыня сельсавету Хвёдарка Скураток, ведаеце, можа, яго? Да гэтага самага Кастрычніка вясельлі ўсё па вёсках граў, бо на скрыпачцы ўмеў траха пілікаць. А зь ім заходзіць і сакратар партыйнай ячэйкі Янук Бізун, асоба таксама выдатная: картыга, выпівоха, хабарнік; у дзевятнаццатым папоў усё «расстрыгаў». Заходзяць, ні слова ні кажучы, садзяцца. Няёмка неяк Богушу – так звалі таго гас

Цэлеш Мікола Яфімавіч *(псэўд. Марцін, Мартын, Люціч; крыпт. М.Ц.) нарадзіўся 25.6.1900, па іншых зьвестках 1904 г. у в.Зазер'е Барысаўскага павету Мінскай губ., цяпер Круглянскі раён Магілёўскай вобласьці (вёска на мяжы з Крупскім раёнам). Скончыў царкоўна-прыхадскую школу ў в.Зазер'е, потым год вучыўся ў вышэйшым народным вучылішчы ў м.Бялынічы, а іспыты па заканчэньні навучаньня здаваў у в.Выдрыца (зараз Крупскі р-н). Бліжэйшыя сваякі жылі у в.в.Матошка, Забянькова і Ухвала, таксама Крупскага раёну.*

Друкавацца Мікола Цэлеш пачаў у 1929 г. Супрацоўнічаў з часопісамі "Полымя рэвалюцыі", "Маладняк", "Работніца і калгасніца Беларусі", "Паляўнічы Беларусі", газэтамі "Літаратура і мастацтва" і інш. Да вайны выдаў у Менску кнігі "Апавяданні паляўнічага", "Курылка", зборнік апавяданьняў "Знаходка" і інш. Знаходзячыся на эміграцыі друкаваў свае творы ў газэтах "Бацькаўшчына", "Беларус", альманаху твораў беларускіх эміграцыйных пісьменьнікаў "Ля чужых берагоў". У 70-х гадох, выехаў на радзіму й ...зьнік на абшарах былога СССР, – некаторыя бачаць у гэтым руку КДБ.



Творы Міколы Цэлеша адметныя й запамінальныя, кранаюць сэрца. Асабліва яго апавяданьні – рэалістычныя замалёўкі жыцьця нашага народу ў канцы 20-х і ў 30-я гады. Як піша літаратуразнаўца Лявон Юрэвіч у прадмове да кнігі "Хмары над Бацькаўшчынай" (1995г.): "Мікола Цэлеш быў Сьведкам. Ён бачыў як ідзе запрыгоньваньне сялян, як вытраўляецца з чалавека гаспадар, як плянамерна нішчыцца нацыянальная інтэлігенцыя, як рабуюць і расьцягваюць багацьце зямлі беларускай". Сапраўды, творы Міколы Цэлеша напісаны сэрцам, сэрцам, якое баліць.

падара – запрасіць-бы да стала, дык страва занадта штодзённая, яшчэ пакрыўдуюць: «Іш чым частаваць наважыў, куляшом нейкім, быццам яечні няма з чаго ўпячы!» Пачаць рыхтаваць што-якое іншае, дык, можа, сьпяшаюцца куды? Урэшце Богуш пытаецца:

– У справе якой ці, можа, так сабе наведаць прыйшлі?

– У справе, а як-жа, будзем хадзіць у гэты час «так сабе», – а самі сьмяюцца.

– А ў якой такой справе, калі не сакрэт? – цікавіцца Богуш.

– Ты ня прыкідвайся дурной авечкай! – адказвае больш языкасты Янук. – Табе павінна быць ужо ўсё ведама...

– Бог з вамі! Каб мне было што ведама, дык хіба я пытаўся-б? От крыж, што мне нічога такога ня ведама. Пра што вы кажаце?

– Ты падаткі заплаціў?

А трэба сказаць, што Богуш быў у гэтым вельмі рупны. Бывала, з нас хто-небудзь упрэцца, дык і то Богуш будзе казаць: «Як-жа, падаткі плаціць трэба: і на школу, і на дарогі, і на бальніцы, і на паліцыю (ніяк ня мог прызвычаіцца казаць «міліцыю»), бо паліцыя парадак беражэ...» Якое-ж было яго зьдзіўленьне, калі ён пачуў пра падатак!

– Ці вы жартуеце, ці проста пазьдзекваца прыйшлі?

– Зусім не жартуем: апісаць тваю гаспадарку прыйшлі!

Тут Богуш сапраўды разгубіўся. Гаспадыня яму шэпча: «Квіты! Квіты пакажы ім, вунь там за абразамі тырчаць!» А Богуш, як аслупянелы, стаіць сярод хаты. Урэшце пытаецца:

– А паперы ад вышэйшых уладаў у вас ёсьць на тое апісаньне? – думаў, пэўна, спалохаць іх гэтым.

Скураток, праўда, дастаў із свайго брызэнтавага партфэлю паперку й пачаў яе чытаць: «Гаспадарка Богуша Макара, якая ў мінулым выкарыстоўвала наймовую працу і як не плаціўшая падаткаў, пастановай сельсавету апісваецца з мэтай абкладаньня індывідуальным...»

Паклаў паперку ў партфэль й сказаў:

– Зразумеў? А цяперака пастаў тутака свой подпіс, і калі не аплоціш гэты індывідуальны да наступнага панядзелка, дык усё тваё будзе сканфіскавана, а сам ты паедзеш туды, дзе Макар ніколі цялят ня пасьвіў... – і гучна зарагатаў.

Якое гора ахапіла ўсю Богушаву сям'ю, калі Скураток ізь Януком пакінулі хату. Каб у Богуша былі грошы, дык ён, магчыма, тым ці іншым шляхам пакіраваў-бы гэтую справу ў іншы бок. А то ў кішэні ў чалавека нічога: адно чырвонец нейдзе валяўся, які некалі прыслала дачка Раінка. Прадаць што-колечы, дык дзе-ж патрапіш у гэтакі кароткі час, дый што прадасі на гэтакія вялікія грошы?

Страшэнная ноч была тая для Богушавых. Сынок Юльяш, такі здатны хлапчук, каб нічога ня чуць і ня бачыць, закруціўся ў коўдру, трасецца ды плача. Раптам – грукат у шыбу. Тут усе й памлелі. А маці стала на калені, склала рукі на грудзях ды моліцца:

– Ойча, зь неба Божа, ізжалься над намі!..

І тады толькі падышла да вакна. Бразгат паўтарыўся.

– Каго там Бог нясе?

– Свае, адчыніце!

Якая радасьць ахапіла ўсіх, пачуўшы голас Зенькі. Юльяш выскачыў з-пад коўдры, пабег адчыняць. З грукатам адсунуў засаўку.

— Заходзьце, дзядзька Зенька!

Празь сьветлую пляму адчыненых дзьвярэй у хату ўсунулася няскладная постаць Зенькі.

– Што гэта вы сёньня гэтак рана замкнуліся?

Гаспадыня зараз-жа залемантавала:

– Зенечка, родненькі, скажы, што на сьвеце чуваць? Усё-ткі ты больш за нас мусіш ведаць! (У Зенькавай хаце за пераборкай была канцылярыя таго сельсавету).

-- Ды нічога добрага! – пачаў той. – Адно зьдзекі з народу нашага: былі нацдэмы – вучняў забіралі ў турмы, а цяперака кулакі – высылкі ў сібірскую немарач...

Раптам з палацяў пачуўся крык Богуша ды такі страшэнны, вяр'яцкі нейкі, што ўсе ў хаце аж памлелі.

Гэта яны... гэта яны... ідуць... ідуць!..

Богуш! Богуш, апамятайся! – паклікала ўстрывожаная гаспадыня.

Богуш прачнуўся, сеў на палацях і, азіраючыся, загаманіў ужо спакайней.

– О ты, Божа! Сон... ды такі страшны! Ніколі, здаецца, такога страшнага ня сьніў. Здаецца, я адзін у полі. І чорная, чорная хмара завісла пад небам. І здаецца, крукі круцяцца, круцяцца нада мной... Сотні іх! Ага, сотні! А я галодны й зусім зьнясілены, навет кропелькі вады ня было ў роце... І ледзьве дыхаю я. А яны ўсё круцяцца, круцяцца ды ўсё бліжай, бліжай! А ў мяне голыя рукі. І зь кіпцюрамі, усё зь кіпцюрамі да мяне! А вочы іхныя прагныя, крывяжэрныя! Божа ты мой! Я ўсё вочы плюшчу, плюшчу, каб ня дацца ім. Хочу махнуць рукою, рука не паварочваецца, крыкнуць – язык анямеў, так аслаб, мусіць, я! А яны ўжо і да вачэй дабіраюцца – выдзяўбці мне вочы хочуць!..

– Крукі, кажаш? – пытаецца Богушыха.

– Ага, крукі! – адказвае, усё яшчэ пад уплывам сну, гаспадар.

– Крукі – то нашы ворагі, – заключае гаспадыня. – То яны круцяцца над намі... Хочуць нашае крыві! Сьвятая царыца маці, выратуй нас!

– Што вырабляюць?! – раптам заўважае Зенька. – Надысь дык завязалі дзьверы знадворку ў хаце Міхалкі, каб ня мог даць па галаве – ведаеце Міхалкаў нораў, – ды вывелі карову, быццам ён падатак не заплаціў... А ўчора дык у Аўдолі кублы трасьлі, і што там трэсьці ў яе, каб іх трасца трэсла! Бачыце, бедная ўдава адгукнулася пра калгасы нядобра!?

– Няўжо пра гэта дзе-небудзь вышэй ня ведаюць?

– Мо' й ведаюць – адна хэўра!

– Зладзюга Янук усім гэтым верхаводзіць. Выгадавала маці сынка на гора людское! Тады, як яшчэ падлеткам быў ды сала ўкраў у Аўдолі, каб выдалі ўладзе, дык мо' цяпер людзі дзякуй сказалі-б...

– Здаецца, і да вас сёньня ўраньні заходзілі? – цікавіцца Зенька.

Богушыха пацьвердзіла, што заходзілі, – Янук і Хвёдарка.

Тады Зенька пачаў апавядаць, як, вярнуўшыся ад Богушавых і паклікаўшы з крамы спажывецкага таварыства Гарэліка – трэцяга члена бюро ячэйкі, яны пра невашта доўга спрачаліся. Пра што была гутарка, праз пераборку ня ўцяміць, але Янук усё крычаў на Хвёдарку. «Што ты зь імі цацкаешся!? Дырэктыва партыі... Правая палітыка... Ліквідаваць як клясу...» Якая тутака правая палітыка, калі яна зусім ня правая! – скончыў Зенька. – Па-мойму, дык яна хвальшывая!

– Тваёй абароне аддаемся, сьвятая Божая Маці, – шаптала Богушыха ў кутку каля ложка.

– І гэтак штовечар: гавораць, гавораць... – працягвае Зенька. – І як язык не забаляць?

– Дык-жа за гэта грошы маюць! – устаўляе Богушыха.

– Пра адно буду прасіць цябе, Зенька, – умяшаўся ўрэшце Богуш. – Калі што-якое здарыцца із намі, дык паведамі Раінку, – усё-ткі настаўніца яна, можа, хоць дзяцей выратуе!

– А я вам скажу: людзі самі ў пекла

лезуць, – разважае Зенька. – Гэта, як я ўспамінаю, пачалося ад тае першае пачкі, што папісаліся ў гэты самы хаўрус. Было іх няшмат – усяго дзевяць чалавек на сельсавет, але імі цяпер казыраюць, хоць і есьці ў іх няма чаго. «Народ, маўляў, прэ-эць у калгасы!» Ну, а хіба захочуць запытацца ў кожнага па добрай волі? Іхная-ж тут карысьць: будуць сядзець на карку агулу ды гарэлку смактаць...

Зенька пайшоў, а тое, што ён сказаў, яшчэ доўга мянтэжыла Богушавых.

– Я так і ведаў, што ўсё гэта Янук капае на нас, – заўважыў Богуш. – Ня дай, Божа, сьвіньні рогі! – зірнуў праз вакно на вуліцу, дзе нехта прайшоў з цыгаркай. – Проста ўтварылася хэўра злачынцаў і зьдзекваюцца зь людзей...

– Схадзіў-бы ты да Сукеніка, усё-ткі ён начальнік тутака, у павеце.

– Няма цяперака ніякіх паветаў, – запярэчыў Богуш. – Раёны ўсюды.

– Ну, дык у раён. Мо' яшчэ не забыўся, як і мы ня цураліся яго.

– Так ісьці няма чаго: трэба ўсё гэта на паперы выкласьці.

– Можа Юльяш змог-бы?

– Не пад сілу яму яшчэ! Раіна – тая магла-б. Але пакуль да яе дабярэшся...

Наважылі: заўтра ў раньні ісьці да Мікітавага сына, вучня сярэдняй школы, ды прасіць, каб ён склаў заяву, а тады ўжо ў тэй раён, можа, яшчэ пасьпеем добра падцерці нос гэтаму зладзюгу Януку! Разважыўшы гэтак, яны навет крыху павесялелі. Але назаўтрае ўраньні па засьценку разьнесьліся чуткі, што на вуліцы, каля былой карчмы, ляжыць няжывы Хвёдарка Скураток. Да Богушавых першай прыбегла із гэтай навінай тая-ж Аўдоля Бабок.

– А вы тутака сядзіцё й нічога ня бачыце й ня чуеце: гэта-ж Скураток няжывым пад плотам знойдзены!

Богуш спачатку неяк нібы ўзрадаваўся, а потым падумаў: ото ліха! Яшчэ да мяне прычэпяцца!

Тым часам пайшлі паглядзець: праўда, ляжыць у гразі, рукі раскінуў, быццам лёг адпачыць пасьля цяжкое працы. Нагой упёрся ў плот, і ў кулаку корак ад бутэлькі з гарэлкай трымае.

На целе Скуратка ня было нічога такога, што паказвала-б на сьмерць ад забойства ці іншага якога-колечы гвалту, тым ня менш, прыехаў унезабаве прадстаўнік ДПУ з карагодум міліцыянэраў і з вышуковым сабакам і распачаў вышук. Зэфір абнюхаў Хвёдаркаву куртку, лізнуў ягоны пасінелы твар, якраз каля самага роту, зь якога яшчэ сьмярдзела гарай, брахнуў разы са два ды, адбегшыся крокаў на колькі, падняў нагу на плот.

– Расьпісаўся! – заўважыў нехта з натоўпу праз агульны рогат.

Прыехаў на райкомаўскай машыне й Сукенік, а ўнезабаве й пракурор. Прывезьлі із сабой і спэцкора ад цэнтральнай газэты. Спачатку яны цікавіліся толькі справай Скуратка, але хутка пачалі «выкрываць» злосных неплацельшчыкаў падаткаў, кулакоў і іншых парушальнікаў савецкіх парадкаў. А назаўтрае ў газэце зьявілася цэлая бачына, прысьвечаная «барацьбіту за лепшую будучыню чалавецтва, Хвёдарку Скуратку, загінуўшаму ад рук кулакоў і іхнае агентуры на сваім пасту...»

– Божа мой, колькі нагаворана! – заўважыў настаўнік нашае школы. – Калі ён і быў барацьбітом, дык толькі за бутэльку гары...

Нататка канчалася: «Мы ведаем, хто зрабіў гэтую справу! Мы ведаем і натхніцеляў забойства, тых, хто сунуў зброю ў рукі забойцы! Сьмерць кулакам і іхным агентам – *беларускім нацдзмам.*»

– Во і зброя ўжо найшлася!

– А ты думаў як?

– Акалеў чалавек пад плотам, хапіўшы празь меру...

– Акалеў ці не акалеў, але цяперака,

браце, пільнуйся!

Але Богуш іначай думаў: дзякуй Богу, зоймуцца гэтай бруднай справай, дык мо' й пра нас забудуць. Толькі ўспамінак пра беларускіх нацдэмаў дужа яго непакоіў: шмат знаёмых дачкі Раіны яшчэ раней пазабіралі як нацдэмаў. Ды яна й сама пісала некалі вершыкі. «Патрэбны ёй гэтыя цыдулькі!? Ня той час, каб песьні пяяць! Дзе ейныя гэтыя сшыткі?» Адчыніў сундучок, дзе яшчэ хаваліся студэнцкія працы Раіны. Пажоўклыя бачыны сшытка, перакладзеныя сухімі галінкамі незабудак, бэзу і іншых кветак, якія нагадвалі-б Раіне не адну вясну ейнага жыцьця, дрыжэлі ў нязграбных рукох усхваляванага хлебароба. «Адны толькі прыкрасьці ад гэтых вершыкаў! Вунь колькі людзей пазабіралі!» Асьцярожна згарнуў сшыткі да купы і нейдзе схаваў, падалей ад вачэй людскіх.

Водгук настаўніка аб Скуратку дайшоў і да Богушавых. Богушыха сказала:

– Пагаманіў-бы ты, стары, з настаўнікам! Усё-ткі ён адукаваны ды з Раінай некалі сябраваў...

Калі сьцямнела. Богуш па агародах дабраўся да школы і ціха пастукаў пальцам па шыбе. Настаўнік адхіліў фіранку й пазнаў Богуша.

– Заходзьце! – кіўнуў галавой. Выйшаў у калідор адчыніць дзьверы.

– Што вас прыгнала так позна да мяне?

Богуш убачыў крэла й сеў – дух занімала ў яго.

– Скажьше, што-ж гэта робіцца? – і пачаў апавядаць сваю бяду.

– Можаце не казаць – усё ведама...

– Але што-ж гэта такое? Дзеля чаго? Зь якой мэтай?

Настаўнік прайшоўся па пакою, стаў перад Богушам, паклаўшы рукі ў кішэні. Задумаўся.

– Я баюся, што вы мяне не зразумееце, – заўважыў.

– Пастараюся. Кажыце!

– Перш-наперш: што гэта такое? Тэрор! Зьдзек прайдзісьветаў з сумленных людзей. Другое: дзеля чаго? Каб умацаваць сваё хісткае становішча, бо апынуліся ў сьляпым завулку...

– Для мяне не зразумела, як можна ўмацаваць сваё становішча, рабуючы народ?

– Справа вось у чым: існуе догма, што сацыялізм, а тым больш камунізм, адкідае ўсялякую хворму прыватнай уласнасьці. Усё павінна быць нічыім, агульным...

– Не разумею! Як гэта нічыім, агульным!? Нехта-ж мусіць сачыць за парадкам. Раскрадуць! І хто-ж тады стане дбаць пра што-кольвек, калі ўсё нічыё?

– От-жа гэтыя самыя Хвёдаркі ды Янукі...

– Дык-жа ня будзе чаго ўжо рабаваць!

– А цяпер дзеля якой мэты? Бачыце, гэтую догму выпрацаваў Карла Маркс...

– Каб ён здох той Макс...

– Ды ён ужо даўно ў магіле, – усьміхнуўся настаўнік. – Але паводле гэтае догмы, сацыялізм і камунізм прышчэпяцца толькі ў высака індустрыяльных краінах...

– Разумею...

– Дзе амаль усе людзі работнікі, а ня ўласьнікі. Тым часам, Расея ня ёсьць высака індустрыяльная, а якраз адсталая. Вось-жа ў імя гэтае догмы й робіцца ўсё гэта: перш-наперш, адабраць у людзей усякую ўласнасьць, заняволіць іх і панаваць, бо іначай трэба адмовіцца ад улады...

– Улада, праўда, спакушае, і чым больш улады, тым больш зла... І я цяпер бачу, што усё тое, што гаварылася раней і гаворыцца цяпер ад імя савецкае ўлады, ёсьць проста брахня, ашуканства!

– Як хочаце назавіце...

– Але ў мяне тутака іншае пытаньне:

28 ЖНІЎНЯ—ДЗЕНЬ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ



людзі ўсьцяж гарнуліся ад горшага да лепшага, а цяпер, выходзіць, наадварот, трэба гарнуцца ад лепшага да горшага... Канец сьвету надыходзіць, ці што?!

Настаўнік быў даўно пад падозраньнем, і пасьля справы Скуратка яго арыштавалі. Але Богуша, як ён і меркаваў, ня краталі. Ён ужо й зусім павесялеў. «От, дзякаваць, як той казаў: бяз зла ня бывае дабра...» І раптам прыбегла ад Зенькі дзяўчына. – Тата казаў, каб вы ведалі...

Гаспадар і гаспадыня кінуліся тое-сёе хаваць, а ня было запозна: каля дзьвярэй зьявіліся Янук, Юзік і сам Сукенік, галава раёну.

– Ну, усё скончана! – толькі і мог вымавіць Богуш.

– Ідуць вязаць! І бязуладна апусьціўся на лаўку. Раптам пацягнуўся рукой да сякеры, якая тырчэла перад вачыма за лаўкай. «Я-ж вас, нягоднікаў!» – прамовіў, сашчэрыўшы зубы. Богушыха да яго:

– Ня губі дзяцей! Ня губі дзяцей! – і засланіла сабой сякеру.

Богуш застагнаў, пазіраючы наўкола.

Калі ў хату ўвайшлі ўсе ўтрох, Богушыха заўважыла:

– Дзяжу падымаў мой стары, дык засопся...

Сукенік, як стары знаёмы (раней скупляў па вёсках лён, ільняное семя, шчаціньне), цынічна прамовіў:

– Ну, як маешся, старэча? (Добра ўмеў размаўляць па-нашаму).

– Якая справа вас прынесла да нас? – не хаваючы злосьці, з натугай прамовіў Богуш.

– Усялякія справы бываюць – і прыемныя й няпрыемныя, – адказаў лагодна. – Так ужо павялося на сьвеце... Але трэба-ж неяк жыць!? Цяпер у нас справа няпрыемная...

Адчыніў свой тоўсты партфэль і пачаў павольна застругваць аловак. Потым паклаў на стол аркуш паперы. Убачыў на шасьце вязанкі цыбулі й давай гаманіць пра цыбулю. «Якая яна ў вас добрая! І дзе яна такая расла? Цяпер на рынку нічога ня купіш, хоць зубы кладзі на паліцу. Як ты думаеш, Макар, хто ў гэтым павінен?» Янук і Юзік рагаталі. «Ну, досыць! На басьнях далёка не заедзеш». І пачаў чытаць паперу, водзячы алоўкам па радкох. У ёй і быў лёс Богушавых. Цэлая куча розных злачынстваў, пра якія Богуш, каб не пачуў ад Сукеніка, так і ня ведаўбы аж да самай сьмерці. Пасьля, спаслаўшыся на рэзалюцыі пленумаў і зьездаў, заключыў:

– Пазбаўляецца ўсяе маёмасьці... Падлягае высылцы... Дазваляецца ўзяць із сабой толькі тое, што можна панесьці з сваёй сям'ёй...

Богуш, зьбялелы, цяжка дыхаючы, сядзеў нярухома. Юльяш і Агатка ўголас заплакалі.

– А дзеткі, а родныя, а нашто-ж я вас парадзіла! – залемантавала Богушыха.

І тады раптам Богуш зноў ірвануўся да сякеры, але Янук загарадзіў яму дарогу.

– Куды, шалапут!

Некаторы час Богуш глядзеў на яго налітымі крывёй вачыма. Але пасьля неяк скурчыўся, зьмізарнеў і асеў...

***

Зенька ўсё падрыхтаваў. Як толькі зьявіўся Юльяш, яны селі й паехалі... За засьценкам адразу пачынаўся лес. У ім было так ціха й прыгожа! Мяккі сьнег камамі ляжаў на лапніку хвояў і лашчыў позірк. Але на сэрцы дзіцяці быў смутак: мо' ў гэты час памірае бацька? Мо' яго забівае Янук? Мо' над заплаканай маці стаіць з палкай Юзік? Мо' ужо і Агатку забіваюнь? Хай-бы лепш заставаўся пры іх! Хай-бы ўсіх разам, калі гэтакі наш лёс! Хай бяз лішніх мукаў – у адну магілу! А Раіна-б

паплакала... паплакала... ды нічога... было-б лягчэй, чым бачыць сваімі вачыма... А потым і забылася-б... забылася-б...

– Та-та! Ма-ма, дзе вы? – вырвалася раптам у малога скрозь сон.

– Але-ж трэба паведаміць Раіну, – сказаў Зенька. – Ты, можа, хочаш заснуць? Дык загарніся ў кажух ды засьні!

Раіна яшчэ ня спала. Сэрцам чула бяду: хадзіла па пакою, хвалявалася, журбавала. «Як яны там цяперака? У газэтах усё пішуць аб наступе на прыватны сэктар у вёсцы, аб беларускіх нацдэмах, аб апартуністых, левых і правых, трацкістых, прышчэпаўцах... Дзе падзеліся тыя гэроі, што рабілі рэвалюцыю? Толькі адзін ён – ён нягрэшны, сьвяты, чысты, як дыямэнт; ён усё ведае, усё прадбачвае, а ўсе іншыя, увесь народ – гэта нішто, авечкі, быдла... Якжа тады жыць? Як жыць, калі няма пра што думаць, калі ён за ўсіх думае, а ты ня маеш правоў думаць, і для цябе гэта рызыкоўна: табе толькі застаецца ўсё насіць ў сваім сэрцы, пакутваць, хвалявацца, мучыцца за ўсё і за ўсіх, блізкіх і далёкіх, за ўсіх, за ўсіх!.. Божачкі, як гэта ўсё цяжка, здаецца, лепш памерці-б, адысьці, куды ўсе ўрэшце адыходзяць... От толькі іх, іх бясконца шкада... бясконца... Яны клапаціліся, яны думалі даць мне добрую будучыню, рупіліся, дбалі, а цяпер? А цяпер яны для мяне – стрэмка ў сэрцы! Калі зь імі, ня дай Божа, што-небудзь... лепш заплюшчыць... заплюшчыць вочы назаўсёды... Ён – упыр! Крывяжэрная пачвара...» Зірнула на ягоны партрэт. «Божачкі, Божачкі, што я кажу? Гэта-ж, гэта-ж, Божа мой!» Падышла да вакна, прыслухалася, хоць добра ведала, што не прамовіла ніводнага гуку, а толькі размаўляла із сваім сэрцам. «Але-ж ці яны кулакі? Божачкі, Божачкі, як страшна стала жыць!..»

За вакном быццам-бы зарыпеў пад нейчымі нагамі сьнег. Устрапянулася ўсім целам, прынатужыла слых, замерла. Але-ж ніхто і нічога пачуць ня мог, бо нічога ня было прамоўлена. А калі возьмуць... Скажаш і тое, чаго ніколі ня было... ня было сказана й ня было зроблена. Адчула холад па ўсёй сьпіне. Намерылася пайсьці ўзяць хустку і прыкрыцца ёю. І ў гэты час пачула нейкі шорах за вакном. Мабыць, вецер. Гэтак часта бывае: шорах ветру за вакном у стрэхах прымеш за рух жывой істоты, калі напружаны нэрвы. Але цяпер ужо выразна пачуліся крокі. Страх зноў скаваў усю істоту, і адначасна нібы радасьць мільганула ў душы, што нехта жывы ёсьць паблізу, што яна не адна і калі што, дык усё-ж такі... усё-ж такі нехта жывы!.. Прыклалася да сьцяны вухам і ў той-жа час пачула голас Юльяша:

– Раіна, адчыні!

«Юльяш, чаму? – падумала. – І чаму так позна? Пэўна, здалося ад напружаньня нэрваў». Але зноў пачулася:

– Раіна, Раіна, адчыні!

Трызьніцца! Трызьніцца, да чаго дайшла! Хапілася за галаву й пачала церці скроні. Але зноў, ужо гучней:

– Ты ня сьпіш, Раіна. Праз шчыліны ў вакяніцы відаць сьвятло з твайго пакою. Адчыні, гэта я, Юльяш...

І ён уголас заплакаў. І тады Раіна з усёй сілы кінулася да дзьвярэй, штурханула далоньню засаўку і адчыніла зусім напята дзьверы. Выскачыла на ганак, абхапіла Юльяша за шыю, прыліпла да яго і пачала абсыпаць сястрычнымі пацалункамі.

– Што здарылася? Што здарылася? – сьпяшалася хутчэй дазнацца.

– А нічога, – няўпэўнена, сьціраючы з вачэй сьлёзы і кідаючы позіркам на Зеньку, казаў Юльяш.

Гэта яе на нейкі мамэнт як-бы супакоіла. Пачала сьцягваць зь Юльяша сьвітку. Меркавала: пэўна, выпадкова,

куды-небудзь едучы... Можа. па доктара ці за лекамі якімі, бо там-жа ў іх нічога ня знойдзеш. Павесіла вопратку, потым зноў:

– Не, вы хлусіце! Скажыце, вы хлусіце? Нешта здарылася? Па доктара едзеце? Ага, маўчыцё! – і гістэрычна, скрозь сьлёзы, засьмяялася.

Юльяш закрыў далонямі твар і зачмыхаў носам, ня маючы сілы паўстрымацца. Тады загаласіла і Раіна.

– Я ведаю, нешта здарылася. Цяжкое, надзвычайнае. Мабыць, у сувязі з забойствам Скуратка? (Яна ўжо ведала пра гэта з газэтаў). Божа, што ў вас там робіцца?

Разгублена замітусілася па пакою.

– Зь якім забойствам? – адказаў Зенька. – Хто яго тамака забіваў? Проста акалеў п'янюга пад плотам, перабраўшы меру.

Ён сьпяшаўся расказаць:

– Увесь вечар утрох: Скураток, Юзік і Янук пілі ў мяне за перагародкай. Пасьля выйшлі ўсе, абняўшыся. Ну, і паваліўся і акалеў на марозе...

– Божа, Божа, і чаму ў вас гэтакае здарылася? Цяпер вас не пашкадуюць... Прычэпяцца...

– Ды яно так, абы прычапка...

– Забралі каго... у вязьніцу?

– Забралі – не забралі, проста зганяюць зь мейсца, а куды – невядома.

– Ага, высылаюць, значыць!

Зенька маўчаў. Юльяш зноў загаласіў. Раіна прытулілася да яго, пытаючыся:

– Юльяш, браток, скажы праўду: тату й маму высылаюць?

Юльяш хацеў нешта сказаць, але ня мог, кіўнуў толькі галавой. Раіна зьбялела і абамлелая павалілася на падлогу. Зенька падскочыў да яе, пачаў пляскаць па шчоках. Загадаў Юльяшу зачэрпнуць вады. Пачаў пырскаць ёй на твар. Потым пасадзіў яе на крэсла, падтрымліваючы, каб не павалілася зноў.

– Глыні крыху вады!

Паднёс да роту крынку і гвалтам уліў ёй глыток вільгаці. Цяжка дыхаючы, Раіна адплюшчыла вочы.

– Каб колькі кропляў валяр'янкі!

Паказала рукой на столік. Пасьля кропель адчула сябе лепей.

– Трымайся, дзяўчына! – сказаў Зенька. – Цяпер такі час, што ў кожнага што-небудзь няладна! А ты мусіш выратаваць дзяцей – безь цябе загінуць! Не маленькая, разумееш! Вазьмі сваё сэрца ў кулак і скажы яму, каб яно маўчала. Людзей цяпер не шкадуюць. Іх валяць, як той лес! Хочаш – ня хочаш, кладзіся пад сякеру! Газэта табе гэтага ня скажа, але ўсе добра ведаюць гэта. Ці ты чытала што-кольвек пра Матошку? Зь дзевятнаццаці двароў застаўся цэлым толькі адзін: васямнаццаць вылюднены, павысланы, зьнішчаны. І старых і малых – усіх разам! Трымайся, ты мусіш выратаваць Юльяша і Агатку. Толькі ты адна можаш гэта зрабіць. Той, ад каго гэта залежа, і ў вус не падзьме, як яны будуць замярзаць...

– Мамачка, татачка, што-ж із вамі будзе?

– Трымайся, дзяўчо! Апраніся цяплей, мы едзем, бо час не чакае. Не паедзеш-жа так, як стаіш?

– Маё сэрца чула... Маё сэрца чула... – стагнала, апранаючыся.

– Ды, калі праўду казаць, і нам тутака, хто застанецца, ня соладка будзе. У калгас загоняць. Зямлю і ўсё дабро адбяруць. І будуць сядзець на шыі розныя Скураткі, Юзікі ды Сукенікі, як тыя вошы!.. Ім што? Такі ўжо цяпер сьвет пайшоў... Я просты чалавек, газэтаў ня чытаю, але бачу, пакоцяцца гэныя парадкі па ўсяму сьвету...

У дарозе Раіна ўвесь час паўтарала:

– А ці мама хоць цёпла надзелася? А ці ім дадуць што-небудзь узяць ізь ежы? Ці ім сказалі, куды іх павязуць?

Куды? Ясна – куды, у Сыбэрыю тую – угноена чалавечымі касьцямі за сотню з гакам год!

— А родненькія мае! А даражэнькія! А ці ўбачу я вас яшчэ калі? А мамачка! А татачка!

***

Як толькі Юльяш пакінуў хату, пабегшы да Зенькі, пачаўся ўзаконены вышэйшымі савецкімі ўладамі працэс рабаваньня, які афіцыйна называўся раскулачваньнем. Перш-наперш на сярэдзіну хаты выцягнулі куфар гаспадыні. Усё, што было ў ім, апынулася на падлозе. Трубкі палатна кужэльнага, белага, як сьнег, – праца рук Богушыхі, – вышываныя ручнікі, бялізна, верхняя вопратка... Новыя, яшчэ не апранатыя кажухі і суконныя каштоўныя рэчы былі адкладзены асобна, мабыць, для сябе. Грошы, якія гаспадыня ўзяла за ягады, што назьбірала ўлетку Агатка, аднекуль высыпаліся на падлогу. Янук і Сукенік не паўстрымаліся, каб не пазьбіраць іх у свае кішэні. Пасьля ўзяліся за гаспадароў сундучок. Калі ўзьнялі вечка, на дне, сярод усякае дробязі, убачылі невялікі плецены кошык. Адчынілі: ляжалі шматкі рознай матэрыі, напарсткі, нажнічкі, эпалеты з двума «лычкамі» (рэліквія з часоў Богушавае службы ў войску), а на самым нізе, беражна загорнуты ў эластычную паперу, партрэт гаспадара й гаспадыні, як яны стаялі пад вянцом. Сукенік усьміхнуўся, а Янук брыдка вылаяўся і кінуў картку пад ногі. Але два срэбныя пярсьцёнкі і два такіх самых крыжыкі, за якія тое-сёе можна было набыць у «Таргсіне», падзялілі паміж сабой...

Пакуль Янук і Сукенік «гаспадарылі» ў хаце, трымаючы здранцьвелага Богуша і амаль ужо няпрытомную Богушыху за пераборкай, каб яны ня бачылі, што робіцца зь іхнай працай, Юзік гаспадарыў у каморцы, дзе стаяла ў кубельцы сала, віселі пад стольлю шынкі й каўбасы, і ў слоіках ды макітрах ляжала масла ды сыры. Твар ягоны быў ужо ў тлушчах, а пальцы й рукавы сьвіткі ў сьмятане. Калі Сукенік і Янук заглянулі ў каморку, ён зайздрасна прасіпеў:

– Ежце! Ежце, ліханька! Поўны кубелец сала – ды якое!? Панюхайце толькі!

Зарагатаў, абціраючы аб валасы рукі.

– Ото была-б масьленіца для Хвёдаркі, каб жыў...

***

Усіх выгнанцаў гуртам пагналі да чыгункі для пагрузкі на цягнік. Але вагонаў яшчэ ня было. Начальнік канвою, камандзір войскаў ДПУ, у новенькай, зь іголачкі, хворме, загадаў фурманкам стаць шнурам каля прысадаў станцыі. Некалькі чырвонаармейцаў, таксама з войскаў ДПУ, у цёплых шапках і новенькіх валёнках і кажухох, з аўтаматамі за плячыма, шпацыравалі ўзад і ўперад па шнуру. Для разьвітаньня з выгнанцамі іхным сваяком і знаёмым начальнік канвою «вялікадушна» дазволіў гадзіну.

Вазок Богушавых стаяў першым ад краю. Раіна і Юльяш убачылі яго адразу. Накрытая кажухом Богушыха ляжала, а ля яе, маленькім камочкам, Агатка. Дзіця было прастуджана, у грудзях у яе хрыпела, яна кашляла, час ад часу падымала галоўку і хныкала. Быў чуваць плач і іншых дзяцей. Здавалася дзіўным і незразумелым навет для нашага народу, бачыўшага ня раз гора, як гэта можна выгнаць гуртам усіх з хат бяз жадных повадаў і прычын і гнаць іх, наўсуперак іхным жаданьням, некуды на край сьвету, на голад, холад і павольную сьмерць!?

Богуш ні то сядзеў, ні то ляжаў у перадку вазка, час ад часу мацаючы вусы й бараду і скідаючы зь іх смочкі намёр-

зшага лёду. Быў спакойны. Убачыўшы Раіну і Юльяша, узварухнуўся, але ня было відаць, каб занепакоіўся. Ня стаў ні пра што распытваць, толькі заўважыў, што забыўся спусьціць із ланцуга Бобіка – бедны, пэўна, сядзіць ды выe!..

– Ты, Раіна, аддай яго якому-небудзь добраму гаспадару – Бобік верны сябра!

У ціхай роспачы Раіна нахілілася да ягонага твару, падстаўляючы свой лоб для бацькаўскага пацалунку.

– Ну, што-ж, усё скончана, і няма пра го гама ліць...

– Ня трэба, тата, пасядзім моўчкі.

– Вось што я хочу сказаць толькі: ня ворагі мы, а хлебаробы! З таго, што зараз надумана там, навярху, нічога добрага ня выйдзе. Праца й толькі карысная й разумная праца робіць чалавека шчасьлівым і здаровым! Але праца ня з прымусу, а па сваёй добрай волі, тая, што ідзе ад свайго ўласнага нутра. Кожны чалавек – сам па сабе: і па працы, і па вопрацы, і па гамонцы, і па розуму, і навет па тым, як ён ідзе, што есьць, як сьпіць... Самая маленькая дробязь і тая будзе рабіцца адным гэтак, а другім іначай. На фабрыцы, у войску й то кожны работнік і кожны вой розныя... А тут хочуць зрабіць вялікую гаспадарку, дзе раней працавала па адзіночцы сотня або тысяча людзей, і каб усім было пароўну, і каб ніхто ня быў пакрыўджаны, і каб быў добры посьпех у працы?! Перамелюць народ, дый годзе! Доўга думаў я над гэтым! Той наш нацдэм Прышчэпа разумна разважаў: «Што-ж, кожная сям'я гаспадара ёсьць калгас. Неразумна ламаць сем'і, заганяючы іх у адзін вялікі калгас». А гэтыя камісары – проста хэўра галадранцаў, злачынцаў людзей, якія не разумеюць нас, хлебаробаў, або хочуць пажывіцца з нашае працы, атрымаўшы пасады ў калгасах.

– Дзеткі мае! – адгукнулася аслаблым голасам Богушыха. – Як-жа вы цяперацькі будзеце безь мяне?

– Мама, ня трэба! І так разрываецца сэрца! Можа, як-небудзь скончыцца гэтае ліха, і зноў будзем разам...

– Будзем, будзем! Усе апынімся некалі там, – заўважыў Богуш. – Але там ужо ня трэ' будзе думаць ні пра што...

Вагонаў усё не падавалі. Адціснутыя ахоўнікамі ад фурманак сваякі і знаёмыя, што прыйшлі ў астатні раз сказаць сваё шчырае «бывайце!», стаялі групкамі наводдаль. Маўчалі. Усіх гнебіла адна й тая-ж думка, адна й тая-ж цяжкая роспач, скруха.

– Сэрца разрываецца! – стагналі некаторыя. – Сэрца разрываецца! Хай-бы лепш усім нам праваліцца ў якое прадоньне!

Зенька не выпускаў із зубоў піпкі, ціснуў яе зубамі, грыз, пыхкаў ёю, хоць у ёй ужо нічога й ня было.

Раіса глытала гарачыя сьлёзы. Юльяш і Агатка ўчапіліся ў крысо ейнага кажушка, быццам баючыся, што яна ад іх уцячэць; дрыжэлі, сморгалі прастуджанымі насамі; усхліпвалі, калі да іхнае сьведамасьці даходзіў трагізм з бацькамі...

Было ўжо блізка раніцы, калі, стукаючы буфарамі, паравік падсунуў да станцыі чараду пустых таваровых вагонаў. Ахоўнікі ўзялі стрэльбы напагатоў, і пачулася сухая каманда:

– Уставаць! Пакідаць вазы! Станавіцца па тры – мужчыны асобна, жанчыны асобна! Малых браць жанчынам! Фурманам апекавацца коньмі! Гатова?

– Гатова!

Маўклівай, прыгнебенай, зьнясіленай масай людзі заварушыліся і пасунуліся ў напрамку да вагонаў, ахопленыя з усіх бакоў вартай. Сьнег рыпеў і енчыў пад іхнымі нагамі... І ў гэты мамэнт аднекуль зь цемры пачуўся страшэнны й надрыўны крык, б'ючы, як электрыкай, у мозг тым, хто яго чуў:

– Ка-ты! Ка-ты! Выродкі! Няма на вас кары божай! Згіньце вы із сваёй каменай! **Жыве Беларусь!**

...Усё сьціхла, замерла ў жудаснай цемры.

1941-1971

ЗЬМЕСТ

ПРАДМОВА..... 3

КРАЯЗНАЎЧАЯ ФАНТАСТЫКА
Адрыян Меленік. Гісторыі пра Малое Палесьсе і малапалешукоў.....4

АРХЕАЛЁГІЯ
Шадыра В.І., Мацьвеева Л.Я., Махнач А.І. Гарадзішча на выспе воз.Сялява Крупскага раёна.....12

КРАЯЗНАЎСТВА
Яніна Дэмух. Гістарычны нарыс мястэчка Бобр.....22
Міхась Баравуля. Беларускія асілкі Малога Палесься.....27
Нікіпар Баркоўскі. Барысаўскія Курапаты.....33
Андрэй Аляхновіч. Забываць нельга.....37
Пятро Аляхновіч. Гульні майго дзяцінства.....39

ГАРТАЮЧЫ СТАРЫЯ ВЫДАНЬНІ
Васіль Самцэвіч. Вёска Дакудава.....43

ЮБІЛЕЙ
Стары ліцьвін. Халапенічы – старонкі гісторыі.....51

КНІГА
Тацяна Каваленка. "Гэты родны сьвет..."....55

ПЕРШАЯ ПУБЛІКАЦЫЯ
Валеры Арцюховіч. Матэрыялы велапаходу па маршруце: г.Крупкі – в.Прудок – в.Вялікае Горадна – могілкі былой в.Шырнавічы – г.Крупкі..58

МЭТОДЫКА.ВОПЫТ
Яніна Пушкіна. Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя і грамадзянская вайна ў Расіі.....69

СПАДЧЫНА
Мікола Цэлеш. У імя догмы.....80

Нататкі

Нататкі

НАКЛАД 150 асобнікаў